САКРЭТЫ ПОСПЕХУ Ў АГРАБІЗНЕСЕ 4

ЦІ ВЫРАТУЕ ШАПКА АД МЕНІНГІТУ? 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

3 КРАСАВІКА 2019 г. СЕРАДА

№ 62 (28929)

ЗВЯЗДА

СПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ

Кіраўнік дзяржавы правёў нараду па актуальных пытаннях рэгіянальнага развіцця, а таксама прыняў кадравыя рашэнні



«У апошні час быў праведзены шэраг маштабных мерапрыемстваў, на якіх разгледзелі стан спраў і паставілі першачарговыя задачы для розных сфер эканомікі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Абмеркаваны пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аграпрамысловага комплексу, будаўніцтва. Гэтыя галіны шмат у чым вызначаюць стан беларускай эканомікі, а таксама яе магчымасці вырашаць сацыяльныя задачы».

Акрамя таго, дадаў ён, у выніку былі падпісаны тры дырэктывы — своеасаблівыя дарожныя карты для АПК, будаўніцтва і ЖКГ, якія ўстанаўліваюць сістэмныя задачы і неабходныя для іх рашэння інструменты.

Таксама намечаны шляхі ўдасканалення сістэмы адукацыі і перспектывы беларускай навукі.

«Вызначаны дакладныя этапы паскарэння развіцця рэгіёнаў. Мы дамовіліся на працягу двух гадоў забяспечыць паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё адразу 11 буйных гарадоў, — сказаў Прэзідэнт. — Сёння перад урадам і губернатарамі стаіць задача забяспечыць рэалізацыю ўсіх прынятых дамоўленасцяў, планаў і дырэктыў на месцах».

Такім чынам, агульная мэта дадзеных праграмных рашэнняў — дасягненне годнага ўзроўню і якасці жыцця нашых грамадзян.

Безумоўна, падмурак паспяховага развіцця дзяржавы — моцная эканоміка. «Я ўжо шмат разоў казаў: калі ў нас і будуць нейкія праблемы — толькі тады, калі ў нас будзе дрэнна працаваць эканоміка», — сказаў ён.

Таму, растлумачыў Аляксандр Лукашэнка, перш за ўсё неабходна развіваць эканоміку рэгіёнаў, ствараць там рабочыя месцы з годным узроўнем зарплаты.

«Удзел вертыкалі ўлады ў дасягненні гэтай мэты ацэньваецца па выкананні пэўных задач», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Усё не па плане

І якія вынікі? Пераважная большасць абласцей у мінулым годзе не дасягнула планавых лічбаў па валавым рэгіянальным прадукце і вытворчасці працы.

Фота БелТА.

«Некаторыя рэгіёны не выканалі заданні па экспарце тавараў, прыцягненні прамых замежных інвестыцый. І ніхто не знізіў узровень выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі. Гэта значыць, асноўныя паказчыкі эфектыўнасці праваленыя. У гэтым годзе яшчэ не ўсімі губернатарамі забяспечваецца выкананне тых планаў, якія мы перад сабой намецілі. Але сёння важныя не столькі аб'ёмы вытворчасці, колькі яе эфектыўнасць і канчатковы вынік — прыбытак і рэнтабельнасць», — падкрэсліў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што значная частка прадпрыемстваў па-ранейшаму працуе са стратамі.

Дзе праекты і інвестыцыі?

«Не выбудавана сістэмная работа з інвестарамі, — адзначыў Прэзідэнт. — Відавочна, з кожным інвестарам трэба працаваць індывідуальна. Колькі з іх мы страцілі з-за сваёй цяганіны, бюракратызму і адсутнасці рашучасці выканаць задачу».

Вядома, што ўсе рэгіёны падпісалі дагаворы з кітайскімі правінцыямі і гарадамі. Многія кіраўнікі неаднаразова бывалі ў гэтай краіне.

«Дзе праекты і інвестыцыі? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. — Нават па наяўных інвестпраектах праца вядзецца няякасна. Не выконваюцца тэрміны рэалізацыі, аддача ад іх вельмі нізкая».

«Як я падкрэсліваў, нам не патрэбны інвестыцыі дзеля інвестыцый. Патрэбны вытворчасці заўтрашняга дня, новыя тавары і тэхналогіі, — дадаў ён. — Варта генераваць новыя ідэі, укараняць ноу-хау, выпускаць запатрабаваную на рынку прадукцыю».

Тэма занятасці і своечасовай выплаты заробкаў — пад асаблівым кантролем

Большасць рабочых месцаў, якія ствараюцца ў краіне, не належаць да высокапрадукцыйных і прадугледжваюць нізкую кваліфікацыю работнікаў і невысокі ўзровень заработнай платы.

«Хоць адна з першарадных задач мясцовых органаў улады — арганізацыя вытворчасцяў менавіта з паглыбленай перапрацоўкай сыравіны і атрыманне экспартаарыентаванай і імпартазамяшчальнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю. Я яшчэ раз падкрэсліваю: інвестыцыі — не дзеля інвестыцый. Інвестыцыі павінны быць такія, якія пакідаюць штосьці ў краіне. Да нас шмат прыходзіць інвестараў, якія просяць поўнае вызваленне ад падаткаў, сацыяльных абавязацельстваў і іншае. Пытанне: навошта нам патрэбныя такія прадпрыемствы? Яшчэ і зарплату плацяць мізэрную», — сказаў беларускі лідар.

Па яго словах, прыйшоў той перыяд, калі інвестар павінен прыходзіць да нас у краіну і працаваць на агульных умовах. Ільготы павінны атрымліваць толькі тыя інвестары, у кім «мы жыццёва зацікаўлены».

Акрамя таго, ён дадаў, што ў раёнах і гарадах павінны быць створаны ўмовы і стымулы для прыцягнення працоўных рэсурсаў пад патрэбы эканомікі рэгіёнаў.

«Не выконваюцца мае патрабаванні па росце зарплаты. Больш за тое, яна яшчэ і выплачваецца не ў час. І гэта адказнасць прэм'ер-міністра і першага віцэ-прэм'ера», — адзначыў Прэзідэнт.

У 2018 годзе толькі 10 са 128 раёнаў і гарадоў мелі зарплату, вышэйшую за сярэднюю па краіне. На Магілёўшчыне няма ніводнага такога раёна ці горада.

«Вы ведаеце, што тэма занятасці і своечасовай выплаты заробкаў — пад маім асаблівым кантролем. І сваіх жорсткіх установак у гэтым пытанні мяняць я не маю намеру, таму што людзі хочуць кожны дзень есці і ў нешта апрануць дзяцей, каб адправіць у школу або дзіцячы сад», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Самавольнае будаўніцтва

У будаўнічым комплексе не забяспечваецца апераджальнае развіццё інжынернай і транспартнай інфраструктуры, а таксама стварэнне аб'ектаў сацыяльнай сферы. Напрыклад, у Бараўлянах сёння ў дзіцячых дашкольных установах дэфіцыт месцаў.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што па-ранейшаму адзначаюцца факты самавольнага будаўніцтва, пра якія мясцовая ўлада, магчыма, дазнаецца толькі са сродкаў масавай інфармацыі.

«Наогул, я сумняваюся, што гэтая самая мясцовая ўлада пра гэта не ведала да таго, як у сродках масавай інфармацыі гэта прагучала», — сказаў ён.

СТАР. 2

ЗАКОНЫ ДЛЯ НАРОДА

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. Мясніковіча на адкрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання

Паважаныя члены Савета Рэспублікі і запрошаныя!

Вынікам эфектыўнага развіцця заканатворчай дзейнасці ў Беларусі стала высокая ступень сталасці сістэмы нацыянальнага права. Мы і далей будзем накіроўваць свае намаганні на павышэнне якасці заканадаўства ў адпаведнасці з патрэбамі дзяржавы і грамадзян.

На што трэба асабліва звярнуць увагу?

За кожным радком нарматыўнага прадпісання мы павінны бачыць чалавека з яго спадзяваннямі. Менавіта таму ўсё большае значэнне набывае ўзаемадзеянне з грамадствам па актуальных пытаннях удасканалення заканадаўства. Дадатковыя магчымасці для гэтага прадугледжвае Закон «Аб нарматыўных прававых актах»: публічныя абмеркаванні, прававы маніторынг, выязныя сустрэчы і нарады і іншыя формы. Такі шырокі фармат забяспечвае прамую сувязь з людзьмі, дае магчымасць пачуць, што іх хвалюе, і самае галоўнае — атрымаць прапановы з месцаў.

Усе законапраекты належыць рыхтаваць па новых канонах нарматворчасці, работы ў нас прыбавіцца: трэба будзе ўважліва аналізаваць не толькі самі палажэнні законапраекта, але вывучаць і параўноўваць дадатковыя дакументы да яго. Іх комплексная ацэнка дапаможа граматна спрагназаваць трансфармацыю грамадскіх адносін, адэкватна пабудаваць змястоўную частку закона і ліквідаваць хібы яго прававых канструкцый.

Сумесна з Палатай прадстаўнікоў і Урадам мэтазгодна абмеркаваць такі падыход, пры якім у законах прадугледжваюцца прынцыпы і нормы рэгулявання найбольш важных адносін, а механізмы іх рэалізацыі закладзены ў падзаконных актах. Важна, што ў законы ўключаюцца нормы, якія ўжо пацвердзілі сваю эфектыўнасць і актуальнасць практыкай прымянення на ўзроўні актаў кіраўніка дзяржавы ці ўрада. Пры гэтым парламентарыі павінны забяспечыць кантроль за развіццём прававых прадпісанняў у дакладнай адпаведнасці з законам. Дапаможным інструментам ажыццяўлення такога кантролю з'яўляецца прававы маніторынг.

Пераканаць, што такая тактыка, з аднаго боку, станоўча паўплывае на стабільнасць прававой базы, а з другога — надасць ёй неабходны дынамізм, дазволіць бачыць вынікі прыняцця нарматыўных прававых актаў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

На сённяшні дзень у рабоце Нацыянальнага сходу знаходзіцца 59 законапраектаў. Заканадаўчыя перспектывы вызначаны Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця, рашэннямі Прэзідэнта краіны, планамі падрыхтоўкі законапраектаў на 2018 і 2019 гады.

СТАР. 2

БАЗАВЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ЎСТОЙЛІВАГА РОСТУ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на адкрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання

Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя!

Пачынае сваю работу шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Яе парадак дня фарміраваўся ў цеснай увязцы з ключавымі пытаннямі грамадска-палітычнага жыцця, якія сёння так шырока і зацікаўлена абмяркоўваюцца ў краіне па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы.

У гэты дыялог, важным этапам якога стане зварот Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і парламента, уключаны ўсе структуры ўлады, грамадзянскай супольнасці, бізнесу, айчынныя і замежныя медыя.

Усіх удзельнікаў вялікай размовы аб'ядноўвае жаданне бачыць Беларусь свабоднай, мірнай, справядлівай і стабільнай.

І гэта цалкам адпавядае курсу на безумоўнае забеспячэнне нацыянальнага суверэнітэту, эканамічнай незалежнасці, абарону канстытуцыйных правоў і гарантый нашых грамадзян.

Менавіта гэтыя прыярытэты былі пакладзены ў аснову нашых заканадаўчых планаў. На сённяшні дзень у пастаянных камісіях знаходзіцца ўжо 65 законапраектаў, 37 з якіх цалкам падрыхтаваны да разгляду ў Авальнай зале.

Пералік змешчаных у іх пытанняў адлюстроўвае амаль увесь спектр задач па развіцці стабільнага дзелавога асяроддзя, ІТ-сектара, пашырэнні зялёнай эканомікі, павышэнні якасці жыцця ў розных сферах, падтрыманні міру, стабільнасці і грамадскай згоды.

Галоўны наш рэсурс — інтэлектуальны патэнцыял. Толькі абапіраючыся на яго, мы зможам прыкметна знізіць сваю сыравінную залежнасць і нарасціць аб'ёмы экспарту. Акрамя таго, павелічэнне колькасці рабочых месцаў у лічбавай сферы фарміруе высокі попыт. Гэта жыццёва важна для многіх галін і прадпрыемстваў, якія традыцыйна арыентаваны на ўнутраны рынак.

Гэтыя пытанні выходзяць сёння на першы план, і для іх паспяховага комплекснага вырашэння трэба аператыўна ствараць адпаведныя прававыя ўмовы.

Для паскоранага ўкаранення навукаёмістых тэхналогій патрабуецца канцэнтрацыя сродкаў пад праекты, якія дадуць гарантаваны эканамічны эфект. Таму сёння вельмі важна заканадаўча прапісаць дакладны механізм фарміравання праграмы інавацыйнага развіцця. Гэта і будзе наша асноўная задача пры карэкціроўцы закона аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Вялікабрытанія страціла з-за брэксіту больш за 100 млрд еўра

З-за будучага брэксіту брытанская эканоміка з моманту правядзення рэферэндуму страціла прыблізна 87 млрд фунтаў стэрлінгаў, што ў пераліку складае амаль 101,4 млрд еўра. Да такой высновы прыйшлі аналітыкі амерыканскага банка Goldman Sachs. Адпаведны даклад быў апублікаваны ўчора.

Як вынікае з дакумента, з чэрвеня 2016 года краіна штотыдзень губляла амаль 700 млн еўра з-за рашэння брытанцаў выйсці з Еўрасаюза. Вялікабрытанія недалічылася каля 2,5 працэнта свайго ВУП з-за брэксіту, мяркуюць эксперты.

Брытанскі парламент 1 красавіка чарговы раз адхіліў усе альтэрнатыўныя варыянты пагаднення аб брэксіце, вынесеныя на галасаванне.

Мэр Новага Арлеана хоча папрасіць прабачэння за лінчаванне 11 італьянцаў 128 гадоў таму

Прабачэнні за самае буйное ў гісторыі ЗША лінчаванне, што адбылося 128 гадоў таму, мае намер прынесці мэр Новага Арлеана Латоя Кантрэл. Як паведаміла тэлекампанія CNN, падчас свайго выступлення ў Амерыкана-італьянскім культурным цэнтры Кантрэл, як чакаецца, абвесціць афіцыйную пракламацыю з прабачэннямі за гібель 11 італьянскіх імігрантаў у 1891 годзе.

Тэлекампанія нагадала, што падставай для буйных беспарадкаў у Новым Арлеане ў сакавіку 1891 года стала забойства начальніка паліцыі Дэвіда Хенэсі. Пад падазрэнне тады падпалі некалькі імігрантаў, перш за ўсё італьянцы, аднак журы прысяжных апраўдала арыштаваных. 14 сакавіка натоўп колькасцю каля 8 тысяч чалавек уварваўся ў будынак турмы і расправіўся з падазравanымі ў забойстве паліцэйскага.

Лінчаванне 11 італьянцаў у 1891 годзе пакінула «незагойную рану», адзначыла тэлекампанія са спасылкай на заяву члена муніцыпальнай камісіі па пытаннях сацыяльнай справядлівасці Майка Санта. Члены камісіі звярнуліся па гэтым пытанні да мэра Новага Арлеана, і тая пагадзілася з прапановай аб прынясенні прабачэнняў за той трагічны інцыдэнт. «Для таго каб пайсці на такі крок, патрэбна сіла волі, — прывяла тэлекампанія словы Майка Санты. — Людзям гэта патрэбна».

Кіраўнік НАСА дапусціў высадку двух і больш чалавек на Месяцы пасля 2024 года



Нацыянальнае ўпраўленне ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (НАСА) паставіла мэту на першым этапе высадзіць аднаго астранаўта на паверхню Месяца да 2024 года і дапускае павелічэнне складу экіпажа месяцавага модуля да двух чалавек. Пра гэта паведаміў дырэктар НАСА Джэймс Брайдэнстайн, выступаючы перад персаналам у штаб-кватэры НАСА ў Вашынгтоне.

«Канчатковая задача заключаецца ў забеспячэнні вяртання Злучаных Штатаў на Месяц на пастаяннай аснове», — сказаў Брайдэнстайн. Ён прызнаў, што яму асабіста імпануе ідэя дэсантавання адразу двух экіпажаў і больш на адзін і другі бок натуральнага спадарожніка Зямлі.

Калямесяцавая станцыя Lunar Gateway, якая задумваецца як шматфункцыянальны цэнтр камандавання і абслугоўвання шматразовага выкарыстання, «дазволіць ажыццяўляць падобныя дзеянні», удакладніў кіраўнік НАСА, маючы на ўвазе ідэю адначасовай высадкі двух і больш экіпажаў на Месяц.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

• Колькасць насельніцтва свету ў 2019 годзе склала 7,7 млрд чалавек і да 2050 года дасягне 9,7 млрд. Такі прагноз агучаны на 51-й сесіі Камісіі ААН па народанасельніцтве і развіцці.

• **Тарыфная стаўка першага разраду з 1 мая ўсталёўваецца ў памеры Br36,4.**

• Праект «Бацькоўскі ўніверсітэт» адкрыюць у БДУ. Навучанне дазволіць асвоіць спосабы правільных зносін з дзецьмі.

• **З пачатку года ў Беларусі шэсць чалавек звярнуліся па медыцынскую дапамогу з-за ўкусаў кляшчоў.**

КОШТ НЕПАТУШАНАГА НЕДАКУРКА

КІНУЎШЫ З БАЛКОНА «БЫЧОК», МОЖНА ПАДПАЛІЦЬ СУСЕДЗЯЎ НЕ ТОЛЬКІ ЗНІЗУ, АЛЕ І ЗВЕРХУ

Цёплае сонечнае надвор'е — час, калі хочацца пусціць у жыллё больш свежага «забортнага» паветра. Але адначасова з прыходам вясны актывізуюцца і аматары пакурыць на балконах. І калі недакуркі збіраюцца ў попельніцу, то дыскамфорт адчуваюць хіба што жыхары верхніх паверхаў, да якіх ідзе ў расчыненае акно тытунёвы дым. Але ж ёсць і тыя курцы, якія не абцяжарваюць сябе пошукам старой кансервавай бляшанкі для недакуркаў, а адпускаюць іх у свабодны палёт. Часам гэта заканчваецца з-за збегу абставін даволі сумна для зусім іншых людзей, якія таго курца маглі нават ніколі і не бачыць.

Удзень 30 сакавіка на нумар 101 паступіла паведамленне, што на балконе, размешчаным на дзясятым паверсе аднаго са сталічных гмахаў, бушуе моцны пажар. Паміж званком і канстатацыяй таго, што агонь патушаны, мінула ўсяго дваццаць тры хвіліны. Але гэтага часу хапіла, каб на балконе была знішчана ўся маёмасць, былі пашкоджаныя дзверы і закурылася кватэра. Меркаваная прычына пажару — недакурак, які прыляцеў на балкон. Таго, хто яго скінуў, цяпер выяўляюць.

А вось «адкрыццё сезона» ў сталіцы з-за непатушаных недакуркаў адбылося даволі рана — яшчэ 23 лютага. Увечары ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што на другім паверсе жылога дома на завулку Казлова гарыць драўляная рама.

СТАР. 3

СПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ

Дзейнічаць з халоднай галавой і гарачым сэрцам

Прэзідэнт узгадніў пасады новага міністра сельскай гаспадаркі і кіраўніка Шклоўскага раёна

Кадравыя прызначэнні ў Палацы Незалежнасці працягнуліся і ў аўторак. Анатоль Хацько стаў міністрам сельскай гаспадаркі, а Аляксандр Ціток — новым старшынёй Шклоўскага райвыканкама. Днём раней «наводзіць жалезны парадак» на Магілёўшчыну адправіліся новы памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Міхаіл Русы і губернатар Леанід Заяц.

Новы міністр

Анатоль Хацько з 2016 года працаваў генеральным дырэктарам Беларускага дзяржаўнага аб'яднання па племянной жывёлагадоўлі.

«Вы не горш за мяне ведаеце, што ў раслінаводстве трохі прасцей, і мы хоць неяк працуем адносна таго, як гэта патрабуецца. Што датычыцца жывёлагадоўлі, а гэта фінішная вытворчасць нашай сыравіны ў сельскай гаспадарцы (малака, мяса і гэтак далей), — тут у нас праблем хапае. Вы, мабыць, таксама гэта добра ведаеце. Калі жывёлагадоўля не ў парадку, тады і раслінаводства не трэба», — акрэсліў кірунке працы Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што прыняў дадзенае кадравае рашэнне з улікам вопыту работы Анатоля Хацько ў сферы сельскай гаспадаркі і яго прафесійных ведаў у галіне жывёлагадоўлі. «Улічваючы ваш вопыт і тыя праблемы, якія ў нас ёсць у сельскай гаспадарцы, мною прынята рашэнне накіраваць вас у Міністэрства сельскай гаспадаркі кіраўніком», — сказаў Прэзідэнт.

Дысцыпліна і парадак

На пасаду старшыні Шклоўскага райвыканкама кіраўнік краіны ўзгадніў Аляксандра Ціцка, які ўзначальваў Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Па словах кіраўніка дзяржавы, яму імпануе, што Аляксандр Ціток ужо займаў пасаду старшыні райвыканкама і мае вопыт у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

«Вы займаліся ў маштабах рэспублікі гэтымі пытаннямі, вы працавалі тут, ведаеце сітуацыю, абстаноўку, сістэму кіравання на высокім узроўні. Я спадзяюся, што, працуючы ў такой ваеннай арганізацыі, вы спрактыкаваліся ў плане дысцыпліны і парадку — у тым, чаго нам не хапае ў сельскай гаспадарцы, у прыватнасці ў Шклоўскім раёне», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, Шклоўскі раён — вядучы рэгіён не толькі Магілёўскай вобласці, але і ўсёй краіны.

«Гэта ў пэўнай ступені эксперыментальная пляцоўка развіцця сельскай гаспадаркі ў будучыні. Такім і застанецца Шклоўскі раён. Там у плане арганізацыі раёна, на мой погляд, зроблена ўсё. Можа быць, яшчэ паўкрока трэба зрабіць у плане аптымізацыі, арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў маштабах раёна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: — Але заўсёды Магілёўшчына і Шклоўскі раён пакутавалі з-за адсутнасці дысцыпліны. Я не хачу сказаць, што там кадры горшыя, чым дзесьці, — ні ў якім разе, там граматныя людзі. А вось адказнасці і дысцыпліны не хапала заўсёды».

Асабліва адзначыў кіраўнік дзяржавы, што Шклоўскаму раёну неабходны «чалавек акуратны, з халоднай галавой, але гарачым сэрцам, самае галоўнае — чыстымі рукамі».

Прэзідэнт нагадаў, што прынцып любога кіраўніка — перш чым штосьці рабіць, трэба шмат разоў падумаць.

«І я хачу, каб вы разабраліся ў кадрах Шклоўскага раёна і не спяшаючыся, калі гэта неабходна, прынялі адпаведныя рашэнні. Што недапушчальна для любога ўзроўню кіраўнікоў — гэта ашуканства», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пасады ў новых прадстаўнікоў улады адказныя і ў той жа момант цікавыя.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ У ТЭМУ

Міністр сельскай гаспадаркі Анатоль Хацько паведаміў журналістам, якім кірункам дзейнасці ўдзеліць асаблівую ўвагу на новай пасадзе.

«Прэзідэнтам пастаўлены задачы па працягненні работы, якая сёння вядзецца па сельскай гаспадарцы, — павышэнне эфектыўнасці, навядзенне парадку на зямлі. Гэтыя пытанні трэба вырашаць штодзённа», — расказаў Анатоль Хацько.

Асаблівыя задачы ўскладаюцца на міністра ў яго профільнай сферы — жывёлагадоўлі.

«Прэзідэнтам пастаўлена задача нарасціць аб'ёмы вытворчасці, павысіць якасць прадукцыі, якая сёння ідзе ад жывёлагадоўлі. Улічваючы, што сёння мы з'яўляемся вытворцам такога аб'ёму сельскагаспадарчай прадукцыі, неабходна яе якасна атрымаць і рэалізаваць», — паведаміў міністр.

Пасля прызначэння Анатоль Хацько прыняў удзел у нарадзе, на якой абмяркоўваліся пытанні пасяўной. Адно з важных агучаных патрабаванняў да аграрыяў — выкананне тэхналогій.

«Пасяўную трэба выканаць у тэрмін і тэхналагічна. Ад гэтага залежыць і ўраджай будучага хлеба, і кормавытворчасць», — звярнуў увагу кіраўнік ведамства.

Па словах міністра, яшчэ не вычарпаны і магчымасці росту вытворчасці малака. Але для гэтага трэба актыўна працаваць на месцах, выконваць тэхналогіі, дакладна рашаць задачы, прапісаныя ў інструкцыях.

Сітуацыя з пасяўной

«Веснавыя палявыя работы пачаліся з праблем. Губернатарам ужо даўно трэба было вызначыць дакладны, дэталёвы (наколькі гэта магчыма) план дзеянняў па правядзенні гэтай самай пасяўной кампаніі. Ад вывазу арганікі на палі і да завяршэння ўсіх палявых работ. Правалаў у гэтым годзе быць не павінна», — заявіў ён.

Беларускі лідар заклікаў перастаць спісваць усе свае пралікі на надвор'е, паколькі ў нашай краіне дастаткова сіл і сродкаў, каб пасеяць у любых яго ўмовах.

Прэзідэнт нагадаў, што гаспадаркі павінны быць забяспечаны тэхнікай, палівам, мінеральнымі ўгнаеннямі і насеннем. Ён падкрэсліў, што наш урад выпадае з нейкіх кампаній. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы заклікаў прэм'ер-міністра, віцэ-прэм'ера і міністра фінансаў зняць пытанні ўгнаенняў, тэхнікі, калі неабходна, і фінансавання. На працягу гэтага тыдня ўсе пытанні, якія залежаць ад урада, павінны быць знятыя.

«Але больш за ўсё мяне турбуе і насцярожвае, што месцамі ў правядзенні палявых работ няма элементарнага парадку. Я хачу, каб губернатары і ўся вертыкаль улады зрабілі адпаведныя высновы з падзей Магілёўскай вобласці і іншых рэгіёнаў. Рэгіёны вельмі дрэнна падрыхтаваліся да гэтай кампаніі. Ці бачыце, вясна рана прыйшла, не разварушыліся», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Як паведамляюць Генеральная пракуратура і МУС, перад пачаткам пасяўных работ 503 адзінкі тэхнікі знаходзіліся ў нерабочым стане і не падлягаюць аднаўленню. Паўтары тысячы адзінак не прайшлі тэхагляд. Больш за тры тысячы машын і агрэгатаў спісаныя, да гэтага часу не здадзены на металалом і захоўваюцца з парушэннем правілаў.

«У некаторых гаспадарках у перыяд асноўных работ трактароў і камбайнаў пад плотам не менш, чым у полі. Як гэта выглядае ў жыцці, вы таксама бачылі ў «Купалаўскім». І як захоўваецца вельмі дарагая тэхніка, вы таксама бачылі», — сказаў Прэзідэнт.

Рабіць, але па тэхналогіі

Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы аддаў выкананню рэгламентаў і нарматываў. Ён чарговы раз адзначыў, што безумоўнае выкананне тэхналогіі — гэта аснова асноў поспеху ў АПК, але гэта датычыцца ўсіх сфер.

«Які вынік вы плануеце атрымаць, калі пад яравую сяўбу мінеральных угнаенняў назапашана толькі палова ад патрэбы. А ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях, дзе ў нас земляробства на «найвышэйшым» узроўні, аж чвэрць. Кожны год праблема з нарыхтоўкай кармоў, умовамі іх закладкі і захоўвання. Даходзіць да таго, што зімой вада ў паілках жывёл замярзае. Я не ведаю, як вы поіце гэтых жывёл. Спачатку парушаем тэхналогію вытворчасці, ну а потым — трэба ж твар захаваць — займаемся прыпіскамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У 2018 годзе ні адна вобласць не справілася з выкананнем даручэння па нарыхтоўцы паўтарагадовага запасу травяных кармоў. У выніку ў асобных раёнах іх пачынаюць завозіць з іншых рэгіёнаў ужо ў канцы лістапада. Спіс такіх гаспадарак павінен ляжаць на стале ў Прэзідэнта, аб гэтым дамаўляліся восенню.

«Вось гэтыя ўсе перавозкі, гэтая ўся лагістыка — гэта выдаткі. Адсюль недахоп грошай на бягучыя патрэбы. У выніку цяперашняе фінансавае становішча шэрагу арганізацый не дазваляе павысіць прывабнасць сельскай працы, якая застаецца адной з самых нізкаплатных. І хто, скажыце, пойдзе туды працаваць, на такую заработную плату? — справядліва заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Павінна быць надзвычай жорсткая дыктатура тэхналогій, вытворчай дысцыпліны. Пра гэта мы гаворым ледзь не на кожнай нарадзе. Але, як вы, я думаю, адчулі, ніхто нікога ўгаворваць больш не будзе».

Беларускі лідар падкрэсліў: яму надакучыла безгаспадарчасць. Сёлетні год — год азелянення і навядзення парадку, таму краіна павінна тануць у кветках і зеляніне. Уздоўж аўтамабільных дарог, на пустках і тэрыторыях, якія не выкарыстоўваюцца, павінны расці дрэвы і кусты. Узяць тыя ж дарогі: насаджэнні ўздоўж іх — гэта практычна, менш касіць. Па гэтым пытанні кіраўнік дзяржавы спытае з кожнага памочніка па абласцях і Мінску.

«Гэта, у рэшце рэшт, наша візітная картка. Вам трэба навесці парадак раз і назаўжды. Тады будуць людзі разумець, які парадак павінен быць і як яго падтрымліваць», — дадаў ён.

«Хацелася б сёння пачуць ад губернатараў, што перашкаджае безумоўна выконваць задачы, якія пастаўлены, мы ўжо разжавалі гэтыя праблемы, далей няма куды. Якія фактары перашкаджаюць развіццю рэгіёнаў?» — спытаў ён.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

❍ У ТЭМУ

Уладзімір КРАЎЦОЎ:

«ЁСЦЬ НЕАБХОДНАСЦЬ ЗАНЯЦЦА Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ НЕЧЫМ НОВЫМ»

Па выніках нарады з журналістамі пагутарыў старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Што датычыцца новых напрамкаў у рабоце, а таксама стварэння высокапрадукцыйных рабочых месцаў, то, паводле слоў старшыні Гродзенскага аблвыканкама, пры шэрагу тых традыцыйных прадуктаў, якія вырабляюцца ў сельскай гаспадарцы, ёсць неабходнасць заняцца нечым новым, тым больш што змяняецца клімат. Гэта і вінаград, і кавуны — нягледзячы на скепсіс пэўных асоб, станоўчы вопыт тут ёсць. У той жа Гродзенскай вобласці ёсць праект па вытворчасці клубніцы. У мінулым годзе пачала працаваць прыватная фабрыка па вытворчасці грыбоў.

У прамысловасці, лічыць Уладзімір Краўцоў, складаней. «Не так проста прыняць высокія тэхналогіі, павінны быць інвестары, адпаведныя ўмовы. Мы гэтым шляхам таксама ідзём з шэрагам інвестараў», — дадаў ён.

ЗАКОНЫ ДЛЯ НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На парадку дня — карэкціроўка Грамадзянскага кодэкса, як кажуць, «эканамічнай Канстытуцыі», якая закранае цэлы пласт пытанняў у сферы грамадзянскіх адносін. Савет Рэспублікі з самага пачатку ўдзельнічае ў гэтай працы — намі было ініцыявана замацаванне ў Кодэксе шэрагу новых прававых інстытутаў, у прыватнасці, канвертуемыя пазыкі, міжкрэдыторскае пагадненне, апцыйны дагавор. Таксама мы ўнеслі прапановы па павышэнні прывабнасці выкарыстання дагавора простага таварыства для калектыўнай інвестыцыйнай дзейнасці. Усе нашы прапановы былі падтрыманы.

Важна старанна ўзважыць абгрунтаванасць кожнай змены, змадэляваць розныя сітуацыі і ацаніць наступствы: як прапанаваная норма спрацуе ў рэальным жыцці. Напрыклад, ёсць запыт бізнес-супольнасці на лібералізацыю прававога рэгулявання. Але рэалізацыя такіх падыходаў павінна мець разумныя межы, не стварыць падстаў для злоўжывання, фарміравання ценявой эканомікі.

Законы новага пакалення патрэбны і ў інфармацыйнай сферы. Змены ў Законе «Аб персанальных даных» прадугледжваюць новы ўзровень аховы нашых грамадзян ад незаконнага ўмяшання ў іх асабістае жыццё, што з'яўляецца важным фактарам забеспячэння інфармацыйнага суверэнітэту краіны.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Завершаны першы квартал 4-га года пяцігодкі, пачатак якой быў дастаткова няпростым, але дзякуючы намаганням усёй краіны ўдалося замацаваць пазітыўныя тэндэнцыі: забяспечваецца трывалае эканамічнае развіццё, расце дабрабыт людзей, ствараюцца высокапрадукцыйныя рабочыя месцы. Курс нацыянальнай валюты прадказальны, пашыраецца экспарт.

Дзякуючы Дэкрэту Прэзідэнта ад 23 лістапада 2017 г. № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» і іншым сістэмным мерам па лібералізацыі бізнесу паляпшаюцца рыначнае асяроддзе і інвестыцыйны клімат.

Кіраўніком дзяржавы падпісаны дырэктывы па ўдасканальванні работы і развіцці будаўнічай галіны, сельскай гаспадаркі, жыллёва-камунальнага комплексу. Безумоўна, рэалізацыя прынятых рашэнняў забяспечыць прагрэс не толькі ў названых сектарах эканомікі і сацыяльнай сферы, але дасць значны народнагаспадарчы эфект у цэлым.

Напарадзе сур'ёзная работа па далейшым ўдасканальванні заканадаўства. У першую чаргу — гэта павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага сектара, які працуе ў рыначных умовах і жорсткай канкурэнцыі на знешнім контуры. Хачу нагадаць, паважаныя калегі, што дадзенае пытанне ў адпаведнасці з «Праграмай 16—20» з'яўляецца адным з ключавых у бягучым пяцігоддзі.

У гэтым годзе нам давядзецца працаваць над законапраектам «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве» і карэкціроўкай Закона «Аб гаспадарчых таварыствах». Мяркую, што прыняцце гэтых законаў дазволіць урэгуляваць найбольш адчувальныя пытанні ў рабоце дзяржаўных прадпрыемстваў і бізнесу. У прыватнасці, будуць удасканалены падыходы да субсідыярнай адказнасці ўласнікаў, карпаратыўнага кіравання, фінансавага развіцця гаспадарчых таварыстваў, рашэння праблем неплацежаздольнасці арганізацый.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У «Вялікай размове» Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі з прадстаўнікамі СМІ і экспертнай супольнасцю, што адбылася 1 сакавіка 2019 года, вызначаны важнейшыя прыярытэты знешняй і ўнутранай палітыкі нашай краіны. Кіраўнік дзяржавы падрабязна спыніўся на пытаннях беларуска-расійскага супрацоўніцтва, інтэграцыйных працэсах у ЕАЭС, узаемадзеянні з Кітаем, закрануў сацыяльныя аспекты — падтрымка маладых сем'яў, будаўніцтва жылля, развіццё невялікіх населеных пунктаў, культура і спорт. Усе ўстаноўкі Прэзідэнта павінны быць абавязкова ўлічаны ў нашай парламенцкай дзейнасці.

Дыскусія і агучаныя падчас «Вялікай размовы» прапановы прадэманстравалі асаблівую ўвагу людзей да нацыянальных пытанняў: суверэнітэт, ідэнтычнасць, пошук нацыянальнай ідэі. Умацаванне незалежнасці і захаванне агульнанацыянальных каштоўнасцей не страцілі сваю актуальнасць. Мы будзем пашыраць і ўмацоўваць супрацоўніцтва з замежжам, але асноўны разлік павінны рабіць на ўласныя сілы.

20 гадоў таму быў заключаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Гэты ўнікальны інтэграцыйны праект надае дадатковыя магчымасці развіццю нашай краіны, росту дабрабыту насельніцтва. Мы павінны і далей паглыбляць беларуска-расійскія адносіны. Менавіта аб гэтым вялася мая размова са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі В.І . Матвіенка 28 сакавіка бягучага года падчас майго рабочага візіту ў Маскву. Лічу, што непарушнымі павінны заставацца палажэнні Дагавора 1999 года аб захаванні кожнай з дзяржаў-удзельніц суверэнітэту і незалежнасці, а таксама аб сумесным прыняцці рашэнняў па прынцыповых пытаннях.

Новыя ідэі і кірункі саюзнага будаўніцтва будуць абмяркоўвацца і ў рамках VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў ліпені 2019 года ў Санкт-Пецярбурзе. Форум будзе прысвечаны пытанням моладзі, фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі. Створаны адпаведны арганізацыйны камітэт пад кіраўніцтвам Мар'яны Акіндзінаўны, які ўжо працуе над фарміраванням праграмы гэтага мерапрыемства.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У пачатку 2019 года адбыўся візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Польшчу. Прайшлі сустрэчы на вышэйшым і высокім узроўні, якія прадэманстравалі намер бакоў да адкрытага і канструктыўнага дыялогу.

На перагаворах у Варшаве беларуская дэлегацыя падкрэслівала: Беларусь рэалізуе шматвектарную знешнюю палітыку і зацікаўлена ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва на аснове прынцыпаў міралюбнасці, талерантнасці і добрасуседства. Мы ніколі не сябруем супраць кагосьці.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі і запрошаныя!

У гэтым годзе мы адзначаем 75-ы год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Лозунг «Ніхто не забыты, нішто не забыта» актуальны і зараз. Вельмі важна, каб геаічны подзвіг нашага народа заставаўся ў памяці сённяшняга і будучых пакаленняў, каб у нашым жыцці не было месца зняважлівым адносінам да звязаных з Вялікай Айчыннай вайной падзей, месцаў і імён.

Прашу членаў Савета Рэспублікі прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных гэтай даце: узяць шэфства над месцамі воінскіх пахаванняў, садзейнічаць аказанню неабходнай дапамогі ветэранам, правядзенню з іх удзелам мерапрыемстваў у працоўных калектывах і ўстановах адукацыі.

Сёння адбылася сур'ёзная нарада ў кіраўніка нашай дзяржавы А. Р. Лукашэнкі. Заслуханы справаздачы рэспубліканскіх і мясцовых уладаў. Нам усім на ўсіх узроўнях трэба павышаць дысцыпліну і адказнасць. У краіне актыўна ідзе веснавая сяўба, таму вы, паважаныя члены Савета Рэспублікі, у сваіх рэгіёнах павінны садзейнічаць паспяховаму вырашэнню задач і ліквідацыі недахопаў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце павіншаваць вас з пачаткам чарговай сесіі Савета Рэспублікі. Жадаю ўсім плённай працы.

БАЗАВЫЯ ПРЫНЦЫПЫ УСТОЙЛІВАГА РОСТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба сур'ёзна думаць і аб тым, каб правілы на беларускім рынку станавіліся ўсё больш зразумелымі і зручнымі для інвестараў. Гэта ў першую чаргу трэба ўлічваць пры разглядзе на сесіі законаў па пытаннях аўдытарскай дзейнасці, тэхнічнага нарміравання, стандартызацыі і экалагічнай экспертызы.

Вядома, нельга выпускаць з-пад увагі і тую работу, якая вядзецца пакуль па-за сценамі Авальнай залы. Размова ідзе аб фарміраванні бюджэтна-падатковага заканадаўства. Мы дамовіліся актыўна ўдзельнічаць у гэтым працэсе.

Несумненна, асаблівую ўвагу нашых выбаршчыкаў прыцягне шэраг запатрабаваных законапраектаў сацыяльнага блока, тым больш што на цяперашняй сесіі гэта будзе, бадай, самы аб'ёмны пакет дакументаў.

Падрыхтоўка новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса і паправак у закон аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг прадыктавана неабходнасцю зняць цэлы комплекс праблем, што назбіраліся ў правапрымяненні ў грамадзян, арганізацый забудоўшчыкаў і суб'ектаў гаспадарання.

Кола задач, якія трэба вырашыць у гэтай сферы, дакладна акрэслена кіраўніком дзяржавы ў яго дырэктывах па пытаннях жыллёва-камунальнай гаспадаркі і будаўнічай галіны. Гэта перш за ўсё павышэнне якасці абслугоўвання, правядзенне справядлівай тарыфнай палітыкі, падтрымка сацыяльна слабаабароненых катэгорый насельніцтва і развіццё грамадскага кантролю.

Важным паказчыкам дабрабыту грамадства з'яўляецца забеспячэнне канстытуцыйных правоў грамадзян на якаснае медыцынскае абслугоўванне і спрыяльнае навакольнае асяроддзе.

Зразумела, сістэма беларускай аховы здароўя развіваецца даволі дынамічна. Але гэта якраз і патрабуе пастаяннай увагі да яе з боку заканадаўцаў. Сёння, напрыклад, ёсць відавочная неабходнасць абмеркаваць шляхі паляпшэння санітарна-эпідэміялагічнага кантролю, развіцця айчыннай транспланталогіі і методык лячэння бясплоддзя. Шэраг наспелых рашэнняў неабходна таксама прыняць у сферах экалогіі і радыяцыйнай бяспекі.

Гаворачы пра бяспеку ў цэлым, трэба сказаць, што задача не забеспячэння ў лічбавую эпоху патрабуе прынцыпова новых падыходаў. І ў гэтым плане адобраная нядаўна Прэзідэнтам краіны Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі — вельмі важны і актуальны дакумент, з улікам якога нам цяпер трэба будзе будаваць усю сваю далейшую работу.

У сувязі з гэтым хачу звярнуць увагу дэпутатаў, па меншай меры, на два сур'ёзныя законапраекты. Адзін з іх датычыцца ўзмацнення барацьбы з прапагандай нацызму і экстрэмізму. Яго значнасць абумоўлена тым, што метады розных дэструктыўных сіл з кожным днём становяцца ўсё больш дасканалымі. Мы ж павінны навучыцца дакладна распазнаваць усе гэтыя пагрозы і жорстка працаваць на апярэджанне.

Другі — антыдопінгавы праект. На першы погляд, яго сувязь з бяспекай у сферы інфармацыі не такая відавочная. Але мы бачым, якую вялікую шкоду допінгавыя скандалы могуць нанесці рэпутацыі спартсменаў, ды і дзяржавы ў цэлым.

Нам гэта зусім не патрэбна, асабліва напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў. Паколькі пазітыўны імідж краіны ствараецца цаной вялікіх намаганняў, у тым ліку ў рамках рэалізацыі міралюбівага шматвектарнага знешнепалітычнага курсу нашай дзяржавы.

Беларусь нацэлена на канструктыўнае вырашэнне міжнародных праблем, разглядаючы абсалютна ўсіх, хто гатовы супрацоўнічаць з намі, як раўнапраўных партнёраў. Таму забеспячэнне збалансаванасці нашых кантактаў на ўсіх вектарах беларускай знешняй палітыкі мы бачым галоўнай задачай сваёй парламенцкай дыпламатыі.

Перш за ўсё гэта датычыцца нашых намаганняў на заходнім і ўсходнім напрамках супрацоўніцтва. Бо менавіта ў гэтым вялікім рэгіёне свету пачынаюць сёння паступова праступаць контуры прынцыпова новай архітэктуры міжнародных адносін. І, зразумела, мы кроўна зацікаўлены ў тым, каб знайсці і замацаваць тыя кропкі, дзе сыходзяцца галоўныя эканамічныя і гуманітарныя інтарэсы на кантыненце.

Ідэю інтэграцыі інтэграцый, у аснове якой — умацаванне ўзаемнага даверу і эканамічнага супрацоўніцтва, беларускія парламентарыі актыўна падтрымліваюць на ўсіх міжпарламенцкіх пляцоўках, у прыватнасці ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Менш як праз месяц у сталіцы Беларусі пройдзе канферэнцыя Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ па пытаннях павышэння інвестыцыйнай, транзітнай і турыстычнай прывабнасці краін, зацікаўленых у рэалізацыі гэтай ініцыятывы.

Форум абяцае быць даволі змястоўным. У ім прымуць удзел прадстаўнікі 23 дзяржаў. І мы перакананы, што абмен думкамі будзе вельмі карысны і пазітыўна паўплывае на ўмацаванне ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. У гэтых мэтах мы, вядома, пастараемся прадставіць нашым замежным партнёрам максімальна поўную інфармацыю аб патэнцыяле Беларусі ў якасці важнага звяна Эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

Яшчэ адной беларускай ініцыятывай у рамках ПА АБСЕ стане праект чарговай рэзалюцыі, якую мы плануем вынесці на абмеркаванне ў ліпені бягучага года ў Люксембургу на 28-й штогадовай сесіі асамблеі. Нагадаю, што дакумент прысвечаны ўмацаванню супрацоўніцтва ў галіне тэхналагічнага прагназавання.

Вельмі сур'ёзны комплекс задач пры актыўным удзеле парламентарыяў вырашаецца сёння ў рамках Саюзнай дзяржавы. Карыстаючыся выпадкам, хачу сардэчна павіншаваць усіх беларусаў і расіян са святам — Днём яднання нашых народаў.

Цалкам відавочна, што Саюзная дзяржава — гэта наша рэальнае дасягненне. Бо абсалютная большасць ініцыятыў, што пашыраюцца намі сумесна на міжнароднай арэне, адпрацоўваецца менавіта на гэтай пляцоўцы. Пры гэтым шэраг ключавых напрацовак «двойкі» пакуль не мае аналагаў.

Пры падрыхтоўцы прапаноў па паглыбленні інтэграцыі нам важна сканцэнтравацца на пытаннях больш поўнага раскрыцця патэнцыялу нашага навукова-тэхнічнага, вытворчага ўзаемадзеяння і развіцця кааперацыі. Толькі моцная інавацыйная эканоміка можа зрабіць нас мацнейшымі і забяспечыць павышэнне дабрабыту нашых народаў.

Грамадзяне Беларусі і Расіі павінны рэальна адчуваць эканамічныя і сацыяльныя выгады інтэграцыі. Таму задача парламентарыяў — максімальна садзейнічаць устараненню ўсяго, што перашкаджае сёння свабоднаму перамяшчэнню тавараў, паслуг, капіталу, рабочай сілы, стварэнню аднолькавых умоў і гарантый для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін.

Важна, што ў гэтых пытаннях мы знаходзім разуменне і падтрымку нашых расійскіх калег. У рамках бягучых мерапрыемстваў саюзнага парламента ідзе вельмі насычаная і плённая работа па падрыхтоўцы да 56-й сесіі Парламенцкага сходу, якая пройдзе ў Беларусі, і шостага Форуму рэгіёнаў, запланавага на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Асноўны акцэнт тут трэба рабіць на кантролі за выкананнем раней прынятых рашэнняў.

Даволі нядрэнны зачын у нас ствараецца і для нарошчвання сувязяў з дзяржавамі іншых рэгіёнаў свету. Гэтаму садзейнічаюць кансультацыі, якія мы актыўна вядзём на палях міжпарламенцкіх арганізацый і на ўзроўні груп дружбы, а таксама пастаянныя кантакты з прадстаўнікамі ўплывовых міжнародных структур, дзелавых колаў і дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі.

Нас задавольвае, як зацікаўлена і па-дзелавому будуецца сёння дыялог з нашымі еўрапейскімі калегамі. Вельмі карысна, у прыватнасці, прайшлі перагаворы з прадстаўнікамі парламентаў Германіі, Нідэрландаў, Швецыі.

Пастаянны і плённы характар маюць сустрэчы з парламентарыямі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яркі прыклад таго — цяперашні візіт у Беларусь высокай парламенцкай дэлегацыі Кітая.

У мінулым годзе мы практычна зрабілі прарыў у беларуска-егіпецкіх парламенцкіх адносінах. А ў чэрвені бягучага года чакаецца афіцыйны візіт у Мінск Прэзідэнта Егіпта. Плануецца, што ён выступіць перад беларускімі парламентарыямі з прамовай. Гэта будзе першае выступленне кіраўніка замежнай дзяржавы ў Авальнай зале.

У цэлым жа наша міжнародная праграма будзе даволі напружанай. Я не буду пералічваць усе мерапрыемствы. Скажу толькі, што кожнае з іх мы павінны разглядаць як падставу для замацавання пазіцый, дасягнутых у пашырэнні нацыянальных інтарэсаў. Ключавым пунктам прыкладання нашых намаганняў тут па-ранейшаму застаюцца гандлёва-эканамічныя пытанні.

Часта іх вырашэнне ўпіраецца ў праблему СГА, далучэнне да якой абяцае Беларусі як немалыя выгады, так і відавочныя рызыкі. Дэпутаты падключыліся да вывучэння гэтай праблемы. І яна павінна стаць прадметам усебаковага аналізу ў рамках семінара, які плануецца арганізаваць сумесна з Сакратарыятам СГА.

Паважаныя калегі!

Задачы, якія нам трэба будзе вырашаць у ходзе сесіі, маюць прамую праекцыю на забеспячэнне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі, устойлівага эканамічнага развіцця і паслядоўнага павышэння якасці жыцця нашых грамадзян.

У гэтым плане глыбока сімвалічна, што сесія праходзіць у год святкавання 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, 25-годдзя інстытута прэзідэнцтва і напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Менавіта гэтыя падзеі ўвасабляюць для нас найвышэйшыя каштоўнасці, што складаюць унутраны стрыжань беларускага народнага характару і трывалую аснову нацыянальнай дзяржаўнасці.

Незалежнасць, міралюбнасць, сацыяльная справядлівасць, эвалюцыйны характар пераўтварэнняў. Аб'яднанне грамадства і дзяржавы вакол гэтых базавых прынцыпаў — галоўная ўмова забеспячэння нашай агульнай упэўненасці ў заўтрашнім дні.

Дзяржава — для народа. У гэтым і заключаецца глыбокі сэнс адкрытай і сумленнай размовы, якую Прэзідэнт вядзе з краінай. І мы павінны прыкласці максімум намаганняў, каб наша дзейнасць адпавядала патрабаванням кіраўніка дзяржавы і чаканням выбаршчыкаў.

ПРАВА НА АДМОВУ

Дэпутаты разгледзелі карэкціроўкі ў закон «Аб ахове працы» ў першым чытанні

«Змяненні закона «Аб ахове працы» прадугледжваюць замацаванне права тых, хто працуе па грамадзянска-прававым дагаворы, на адмову ад выкання дадзенага дагавора цалкам або часткова ў выпадку, калі работадаўца неналежным чынам стварае бяспечныя ўмовы для выкання работ (аказання паслуг)», — тлумачыць старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Тамара КРАСОЎСКАЯ.

Праект закона замацоўвае таксама патрабаванні да выканання работ з павышанай небяспекай, неабходныя спецыяльныя арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы. Навелы датычыцца правоў і абавязкаў работнікаў-надомнікаў, дамашніх работнікаў і іх наймальнікаў у сферы аховы працы, а таксама — магчымасці дасудовага разгляду розных пунктаў погляду па пытаннях няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Усяго на адкрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання дэпутаты разгледзелі 11 пытанняў.

Акрамя названага законапраекта першае чытанне прайшлі дапаўненні і змяненні ў законы «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь», законапраект аб змяненні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, а таксама карэкціроўкі шэрагу кодэксаў, датычныя супрацьдзеяння допінгу ў спорце і абмежавання грамадзян у наведванні віртуальных гульнявых устаноў.

Закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» дапаўняецца новымі нормамі для таго, каб стварыць умовы для прыцягнення ў нашу краіну высокакваліфікаваных спецыялістаў з-за мяжы.

«У прыватнасці, законапраектам прадугледжана, што дазвол на часовае пражыванне высокакваліфікаваным работнікам можа быць выдадзены тэрмінам да двух гадоў, дазвол на пастаяннае пражыванне, калі замежныя грамадзяне названай катэгорыі пражылі ў Беларусі пасля атрымання дазволу на часовае пражыванне на працягу апошніх чатырох гадоў бесперапынна, — удакладняе **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ.** — Пашыраецца пералік падстаў для атрымання дазволу на часовае пражыванне замежным грамадзянам, якія тут навучаюцца. Прапануецца павялічыць тэрмін знаходжання іншаземцаў у Беларусі без рэгістрацыі з пяці да дзесяці сутак».

Карэкціроўка Кодэкса аб шлюбе і сям'і прадугледжвае ўвядзенне азначэння шлюбнага дагавора і замацаванне магчымасці яго змянення і скасавання па рашэнні суда. Прапануецца таксама вызначыць права мужа і жонкі (былых мужа і жонкі) на заключэнне пагаднення аб раздзеле маёмасці, якая з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю, удакладніць парадак заключэння пагаднення аб дзецях і ўмовы аднаўлення бацькоўскіх правоў, канкрэтызаваць парадак выплаты або спагнання аліментаў і ўсталяванне апекі і папячыцельства над непаўналетнімі пры часовай адсутнасці бацькоў (аднаго з іх) па ўважлівай прычыне. Законапраект змяшчае прапановы па ўдасканаленні сістэмы апекі і папячыцельства ў адносінах да дарослых, якія прызнаны недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі.

Заканадаўцы прапануюць увесці крымінальную адказнасць за схіленне спартсменаў да ўжывання допінгу. «Тым самым мы абараняем дзяцей, якіх могуць схіліць да выкарыстання допінгу без іх ведама, — пракаментаваў журналістам заканадаўчыя навелы ў гэтай сферы **дэпутат Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Аляксандр БАГДАНОВІЧ.** — Каб ніхто з трэнерскага штаба, дактароў, асоб, якія суправаджаюць дзяцей падчас спаборніцтваў, не мог увесці апошніх у зман, прымусіць праз маніпуляцыі або іншым чынам прыняць допінг».

У другім чытанні былі разгледжаны законапраекты аб змяненні законаў па пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін і карэкціроўка закона «Аб абыходжанні з адходамі».

Акрамя таго, ніжняя палата ратыфікавала пагадненне аб міжнародных дагаворах ЕАЭС з трэцімі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі або інтэграцыйнымі аб'яднаннямі.

Дэпутаты прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 студзеня 2019 года № 1.

***

У дзень адкрыцця шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сенатары абралі Таццяну Бойку і Анатоля Цікавенку суддзямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь на новы тэрмін.

Члена Савета Рэспублікі Алу Бодак у сувязі з прызначэннем суддзёй Канстытуцыйнага Суда датэрмінова вызвалілі з пасады старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

Сенатары таксама прынялі пастанову аб правядзенні сумеснага пасяджэння Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь для заслухоўвання штогадовага Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Беларусі.

Яшчэ адным пытаннем парадку дня стала змяненне прадстаўніцтва Нацыянальнага сходу Беларусі ў Міжпарламенцкім саюзе.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА — АД РАЗМОЎ ДА СПРАВЫ

Для адмены роўмінгу паміж Беларуссю і Расіяй рыхтуецца дарожная карта

Паміж саюзнымі краінамі не павінна застацца межаў — ні эканамічных, ні культурных, каб і расіяне, і беларусы адчувалі сябе і там і там як дома. «Агульная тэндэнцыя станоўчая. Брацкія народы павінны жыць разам, але з адной умовай — толькі калі мы ўсе будзем над гэтым працаваць», — падкрэсліў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА падчас відэамоста Масква — Мінск у Нацыянальным прэс-цэнтры.

Сярод асноўных дасягненняў да дваццацігоддзя Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота назваў пазітыўныя вынікі сацыяльнай сферы для грамадзян на ўсёй тэрыторыі. У эканоміцы захавана кааперацыя прамысловых прадпрыемстваў, у добры бок змяняецца структура тавараабароту, паглыбляецца ўзаемадзеянне ў прамысловай галіне.

Што датычыцца адмены роўмінгу пры перасячэнні мяжы і патаннення мабільнай сувязі, і ў Беларусі, і ў Расіі над гэтым актыўна працуюць. Засталося вырашыць тэхналагічныя задачы. Прадстаўнікі міністэрстваў сувязі рыхтуюць адпаведную дарожную карту.

На думку дзяржсакратара, галоўныя напрамкі развіцця Саюзнай дзяржавы — як для ўсяго свету — у першую чаргу высокія тэхналогіі. Магчымасці для гэтага ёсць: Рыгор Рапота прызнаўся, што быў прыемна ўражаны прагрэсам Парка высокіх тэхналогій у Мінску.

Развіццё малога і сярэдняга бізнесу пакуль што не стала самым моцным бокам саюза — а гэта таксама адзін з важных трэндаў, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы. Трэба звярнуць увагу і на транспартную сферу, якая звязвае краіны. Праца па ўзаемным прызнанні віз знаходзіцца на заключнай стадыі, і гэтае пытанне можа быць вынесена на пасяджэнні Саветаў Міністраў і Вышэйшага дзяржсавета.

Дзяржаўны сакратар упэўнены, што нельга казаць пра імкненне Расійскай Федэрацыі да паглыблення інтэграцыі: «Гэта ўзаемнае рашэнне бакоў — пераглядзець мэты дагавора, прааналізаваць, што зроблена і да чаго мы ідзём. Пагрозы суверэнітэту якой-небудзь удзельніцы саюза няма, гэта супярэчыла б патрабаванням артыкула шостага дагавора».

Таксама не ідзе і размовы пра ўвядзенне адзінай валюты. Ці будзе гэта, у якой форме, пакажа час, адзначыў Рыгор Рапота, дадаўшы, што зараз 80 % разлікаў у гандлі адбываецца ў расійскіх рублях.

Акрамя эканомікі, закранулі падчас трансгранічнай размовы і пытанні культуры, бо палітыкі размаўляюць на розных мовах, а ў творчых людзей мова адна — мастацкая.

Фота БелТА.

У мінулым годзе ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя Горкага РАН быў знойдзены студэнцкі сшытак Максіма Багдановіча. Беларускія навукоўцы шукалі гэтыя аркушы амаль сто гадоў.

Невядомы верш «Дыстых» напісаны на рускай — з указаннем, што гэта пераклад з беларускай. Аднак арыгінала не знайшлося. І Рыгор Рапота прапанаваў правесці конкурс на самы лепшы пераклад. Ініцыятыву падтрымала БелТА, і ў дзень яднання народаў Беларусі і Расіі названыя пераможцы. Першае месца — Маі Галіцкай з Буда-Кашалёва (Гомельская вобласць). Віншавалі перакладчыцу з абедзвюх студый: расійскай і беларускай, і наша мова была зразумелая ўсім.

Варвара МАРОЗАВА.

Міжнародны эканамічны і акрэдытацыйны цэнтр Гульняў адкрыўся ў Мінску

Гэта першы з афіцыйных аб'ектаў турніру. Ён размясціўся ў лёгкаатлетычным манежы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры.

Фота БелТА.

Як адзначыў **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Аркадзь МАЛЕЕЎ**, у ім будзе абслугоўвацца шмат спецыялістаў: «Мяркуецца, што тут пройдуць акрэдытацыю больш за 40 тысяч з планаваных 60 тысяч акрэдытуемых асоб на маючы адбыцца форум. Цэнтр працуе з такімі кліенцкімі групамі, як валанцёры, міжнародныя і нацыянальныя суддзі, персанал спартыўных аб'ектаў, падраздзяленні і кантрактныя арганізацыі, якія забяспечваюць правядзенне спаборніцтваў. Тут жа розныя кліенцкія групы Гульняў змогуць атрымаць неабходную экіпіроўку ў адпаведнасці з правіламі правядзення мультыспартыўнага мерапрыемства», — расказаў Аркадзь Малееў.

Начальнік упраўлення па акрэдытацыі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Антон ЛЯХАЎ растлумачыў, што фактычна аб'ект складаецца з дзвюх частак: адна частка дазваляе акрэдытаваць таго ці іншага прадстаўніка кліенцкіх груп як пры яго асабістым удзеле, так і ў выпадку наяўнасці даверанасці зрабіць выдачу ўсіх акрэдытацыйных картаў прадстаўніку арганізацыі. У акрэдытацыйным цэнтры раздрукоўваюцца бэйджы, якія маюць некалькі ступеняў абароны.

Першым працэдуру акрэдытацыі прайшоў талісман Гульняў — лісяня Лесік. Для тых 20 тысяч чалавек, якія, як плануецца, пройдуць працэдуру акрэдытацыі не ў сценах UDAC, акрэдытацыйныя цэнтры будуць размешчаны ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, Вёсцы спартсменаў, а таксама ў афіцыйным гатэлі сям'і Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў — Minsk Marriott Hotel.

Мяркуецца, што частка акрэдытацыйных картаў у колькасці каля 18 тысяч адзінак будзе накіравана за мяжу для прадстаўнікоў замежных СМІ, НАКаў, міжнародных суддзяў па спорце, пакалькі акрэдытацыйныя карты з'яўляюцца падставай для бязвізавага ўезду.

Як расказаў **менеджар Міжнароднага экіпіровачнага і акрэдытацыйнага цэнтра II Еўрапейскіх гульняў Генадзь ІВАНЮК,** на плошчы больш за 1,5 тысячы кв. м прадугледжана ўсё неабходнае для дзейнасці аб'екта: абсталяваны рабочыя месцы, у наяўнасці IT-суправаджэнне, пакоі адпачынку для валанцёраў, таксама забяспечана бяспека. У цэлым, у рабоце цэнтра задзейнічана больш за 80 чалавек, у тым ліку больш за 50 валанцёраў.

На завяршальным этапе

У Вёсцы спартсменаў завяршаюцца будаўнічыя работы на стацыянарным аб'екце спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па фігурным катанні на каньках галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама.

Фота БелТА.

Падчас II Еўрапейскіх гульняў новабудоўля будзе выкарыстоўвацца як часовы павільён для арганізацыі харчавання афіцыйных удзельнікаў на 2 тысячы пасадачных месцаў, адзначаюць на афіцыйным сайце дырэкцыі Гульняў.

На заключным этапе ўносяцца апошнія штрыхі ў шкленне і дахавыя работы, працягваюцца ўнутранае аздабленне памяшканняў і кладка чыставых падлог. Акрамя таго, значная ўвага аддаецца добраўпарадкаванню прылеглай тэрыторыі.

На тых плошчах СДЮШАР, якія плануецца задзейнічаць для прыгатавання ежы, сканструявана фальшпадлога, каб пазбегнуць пашкоджання халадзільнага абсталявання лядовай арэны. Для ўстаноўкі кухоннага абсталявання падведзены камунікацыі.

Пасля ў памяшканнях новага капітальнага будынка размесцяцца залы харэаграфіі, залы са спецыялізаваным трэнажорным абсталяваннем, пляцоўкі для гульнявых відаў спорту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

КОШТ НЕПАТУШАНАГА НЕДАКУРКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС.

Агонь удалося патушыць вельмі хутка — праз 8 хвілін. На шчасце, у кватэру агонь перабрацца не паспеў. Пацярпелі толькі дзверы на балкон, які аказаўся незашклёным. На падлозе яго ляжалі дыван і газеты, якія і загарэліся.

У мінулым чэрвені з-за недакурка загарэўся балкон у новым доме па вуліцы Жыновіча. Тут ужо агнём было ахоплена ўсё памяшканне. Полымя знішчыла ўсё, што там было, і паспела закурыць сцены ў кватэры.

— Небяспека такіх пажараў у тым, што іх, як правіла, позна заўважаюць, — канстатуе **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Вольга МЕЛЬЧАНКА.** — Жыхароў кватэры, куды прылятае вогненны сюрпрыз, часцей за ўсё няма дома. Сыходзячы, яны пакідаюць расчыненымі вокны або форткі. Узнікае скразняк, і полымя з балкона вельмі лёгка пранікае ў жылы пакой. Хоць былі і выпадкі, калі гаспадар знаходзіўся, скажам, на кухні, а на лоджыю, размешчаную на процілеглым канцы жылля, трапляў непагашаны недакурак. У гэтым выпадку дапаможа аўтаномны пажарны апавяшчальнік, устаноўлены ў сумежным пакоі — менавіта туды ў выпадку пажару пойдзе дым і агонь. Як следства — у вас больш часу, каб заліць недакурак вадой.

Плюс да таго ж балконы і лоджыі часцяком ператвораны ў склад рэчаў, якія добра гараць. Заваліцца маленькаму недакурку ў якую-небудзь шчыліну і паціху тлець вельмі проста. Асабліва гэта датычыцца балконаў, якія выступаюць па-за межы сцяны. Акно, куды заляцеў «бычок», можа быць сарыентавана на той бок, дзе ходзіць вельмі мала людзей, — гэта значыць, паведамленне аб пажары мы атрымаем далёка не адразу. Да таго ж самі недакуркі валодаюць вельмі цудоўнай аэрадынамікай. Яны могуць паляцець не толькі ўніз, але і ўверх, калі гэтаму будуць спрыяць паветраныя плыні. Бывалі выпадкі, калі яны пераадольвалі ўздоўж дома адлегласць у некалькі пад'ездаў і нават заляталі за вугал дома. Дзе скончыцца падарожжа вогненнага смецця — на траве, на падаконніку або на чыімсьці балконе, — прадказаць не здолее ніхто.

— Здаралася і так, што пажар, які ўзнік з-за недакурка, перакідваўся з-за моцнага ветру і на балкон, размешчаны вышэй, — працягвае Вольга Мельчанка. — Так адбылося летась у сакавіку ў шматпавярховіку на мінскай вуліцы Ляўкова. Загарэўся з-за «бычка» адкрыты балкон на пятым паверсе. Ён быў загружаны ўсялякім хатнім скарбам: вопраткай, дошкамі, старым дываном, тумбачкай, закаткамі... Згарэла або моцна было пашкоджана ўсё. Той дзень выдаўся даволі ветраным, і полымя перайшло на паверх вышэй, пашкодзіўшы драўляную раму і абшыўку балкона. На шчасце, ратавальнікі ўтаймавалі стыхію хутка.

Істотны пажар адбыўся ў пачатку мая ў дзевяціпавярховіку на вуліцы Славінскага. Сцэнарый ужо звыклы — мінакі ўбачылі, што гарыць лоджыя на трэцім паверсе, і набралі нумар 101. Вось толькі да таго часу агонь ужо паспеў перайсці ў жылы пакой і разгуляцца там на чатырох квадратных метрах. Згарэла рама, якая аддзяляла лоджыю ад жылога памяшкання, маёмасць, моцна пачарнелі сцены... А яшчэ і пашкоджана абшыўка лоджыі паверхам вышэй.

Ці застануцца рэшткі ад недакурка — пытанне спрэчнае. Бываюць сітуацыі, калі недакурак заваліла часткай мэблі, і пры разборы завалаў аказваецца, што ён збольшага ацалеў. Чым істотнейшы нанесены ўрон — тым меншая верагоднасць, што крыніца агню захаваецца.

Таму лепш, сыходзячы з дома, вокны зачыняць. І па магчымасці разгрузіць балкон або лоджыю. А калі вы жывяце ў доме старой пабудовы, дзе гэтыя памяшканні здаваліся без рамы, то лепш яе ўсё-такі ўстанавіць. Асабліва калі ў кватэры дзве лоджыі і адна з іх «глухая» — гэта значыць, трапіць туды наўпрост з жылога пакоя нельга. Яно таго варта: не выключана, што адзін з вашых суседзяў — неахайны курэц...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

❍ Тым часам

Прафілактыка — рэч сумесная

З 2 да 19 красавіка ў краіне праводзіцца прафілактычная акцыя «За бяспеку — разам». Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Яна скіравана на тое, каб зменшыць колькасць пажараў у жылым фондзе. Ратавальнікі разам з прадстаўнікамі іншых ведамстваў, сярод якіх міністэрствы ўнутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і энергетыкі, завітаюць у сем'і, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, да шматдзетных, інвалідаў, а таксама да пажылых людзей, якія жывуць адны. Ім раскажуць пра тое, як можна павысіць узровень бяспекі свайго жылля, а таксама дапамогуць адрамантаваць печы, электраправодку, устанавіць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі.

Таксама пад праверку патрапяць месцы агульнага карыстання ў шматпавярховай забудове — лесвічныя пляцоўкі, тамбуры, а таксама гарышчы і падвалы. Асобая ўвага будзе аддадзена пустым і закінутым пабудовам.

Сталічны ЧАС

● Гарадскі кірмаш вакансій «Знойдзем работу разам» пройдзе ў культурна-спартыўным цэнтры Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі 25 красавіка, паведамілі БелТА ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. На працягу трох гадзін — з 10.00 да 13.00 — грамадзяне, якія знаходзяцца ў пошуку работы, змогуць даведацца аб наяўнасці вакансій, умовах працы і аплаце, пракансультавацца па пытаннях занятасці, перанавучання, атрымання субсідый на арганізацыю ўласнай справы. У мерапрыемстве прымуць удзел больш за 100 арганізацый горада розных сфер дзейнасці (прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, гандаль і грамадскае харчаванне, ахова здароўя і іншыя). Наведвальнікам прапануюць інфармацыйныя матэрыялы аб паслугах, якія аказваюцца органамі дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва, буклеты з рэкамендацыямі па пошуку работы і складанні рэзюмэ, спецыялізаваныя друкаваныя выданні з актуальнымі вакансіямі. Прадугледжана работа сямі секцый: «Пачнем бізнес разам», «Стратэгія выбару прафесіі», «Старт у працоўнае жыццё», «Занятасць без межаў», «Навучанне з гарантаваным працаўладкаваннем», «Формула паспяховай кар'еры», «Вакансіі сёння і цяпер». Па выніках кірмашу пройдзе круглы стол, прысвечаны тэндэнцыям на рынку працы сталіцы, арганізацыі часовай працоўнай занятасці моладзі, якая навучаецца, пытанням выканання наймальнікамі патрабаванняў заканадаўства аб занятасці.

● Тры гасцініцы плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета ў Мінску. Іх меркавалася здаць яшчэ ў мінулым годзе, паведаміла агенцтва «Мінск-Навіны». Гэта гатэль у складзе шматфункцыянальнага комплексу каля кінатэатра «Перамога», гасцініцы на вуліцы Зыбіцкай і на скрыжаванні праспекта Пераможцаў і МКАД. У Мінску зараз створана адпаведная сучасная інфраструктура, якая дазваляе забяспечыць правядзенне буйных мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню: налічваецца 72 калектыўныя сродкі размяшчэння, якія ўключаюць 51 гасцініцу і гасцінічныя комплексы, 15 аналагічных сродкаў размяшчэння (хостэлы, інтэрнаты і пакоі для прыезджых, гатэльныя нумары, гасціны дом), шэсць спецыялізаваных сродкаў размяшчэння (студэнцкія санаторыі, прафілакторыі, турыстычныя базы).

БЮДЖЭТ З ПРАФІЦЫТАМ

Паводле інфармацыі Міністэрства фінансаў, прафіцыт бюджэту краіны ў першыя два месяцы года склаў 0,7 млрд рублёў.

Станоўчае сальда бюджэту сектара дзяржаўнага кіравання за студзень — люты гэтага года склалася ў суме 0,82 млрд рублёў. Прафіцыт бюджэту Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва склаў 0,1 млрд рублёў, Фонду ўніверсальнага абслугоўвання — 10,3 млн рублёў, Фонду грамадзянскай авіяцыі — 13,6 млн рублёў і Фонду Дэпартамента выканання пакаранняў — 0,28 млн рублёў.

За гэты час падатку на прыбытак паступіла ў бюджэт 42,2 млн рублёў, або 1,2 %. Акцызы паступілі ў суме 0,4 млрд рублёў (17,2 %). Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці склалі 0,7 млрд рублёў (17 %). Паступленні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва склалі 2,5 млрд рублёў, або 16,6 %, Фонд універсальнага абслугоўвання — 10,7 млн рублёў (25,5 %), Фонд грамадзянскай авіяцыі — 17,5 млн рублёў, або 67,3 %, Фонд Дэпартамента выканання пакаранняў — 0,3 млн рублёў, або 75 %.

Было адзначана, што па стане на 1 сакавіка гэтага года запазычанасць па падатках і зборах склала 137,9 млн рублёў. Выдаткі бюджэту сектара дзяржаўнага кіравання за студзень — люты склалі 7,13 млрд рублёў, або 14,2 %. Расходы рэспубліканскага бюджэту склалі 2,8 млрд рублёў, або 12,8 %.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСКІЯ МАЗы ЎПЕРШЫНЮ Ў АФРЫЦЫ

Беларускія гоншчыкі возьмуць удзел у мараканскім ралі-рэйдзе Desert Challenge, які па ўзроўні складанасці супастаўны з сусветна вядомым «Дакарам». Каманда «МАЗ-СПОРТаўта» паедзе на марафон двума экіпажамі і першы раз выставіць капотны грузавік, прадстаўлены ў канцы мінулага года. Дэбют адбудзецца ў Марока з 12 да 20 красавіка.

Большая частка маршруту праляжа па пустыні і пясчанай мясцовасці. Гоншчыкам падрыхтавалі 2741 км спецучасткаў, падзеленых на восем этапаў. Сярод перашкод — дзюны, мяккія пяскі і высахлыя рэчышчы рэк. *«Цяпер усё больш кажуць, што «Дакар» можа вярнуцца ў Афрыку. Калі гэта адбудзецца, то мы павінны мець большае ўяўленне аб рэльефе і клімаце. Удзел у Morocco Desert Challenge якраз дазволіць атрымаць новы вопыт і апрабаваць спартыўныя грузавікі на гарачым кантыненце»*, — растлумачыў **кіраўнік каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ.**

Беларусь на гонцы прадставяць два экіпажы. Сяргей Вязовіч паедзе за рулём капотнага спартыўнага грузавіка, кампанію яму складуць штурман Антон Запарошчанка і механік Сяргей Сачук. Другі экіпаж павядзе Аляксей Вішнеўскі разам са штурманам Паўлам Гараніным і механікам Віталём Мурылёвым.

У камандзе адзначаюць, што Вязовіч выступіць, хутчэй, пілотам-выпрабавальнікам: праверыць у гонцы капотнік, каб ужо ў Мінску давесці канструкцыі да дасканаласці. Калі «самы прыгожы МАЗ» пакажа сябе з найлепшага боку, то трапіць на «Дакар-2020». «Пасля тэстаў у Астрахані мы павысілі надзейнасць некаторых частак капотнага МАЗа. Аднак першы гоначны вопыт ён атрымае ў Марока. Па выніках мы будзем разумець, гатовы капотнік да сур'ёзных ралі-рэйдаў або патрабуе дапрацоўкі», — адзначыў Сяргей Вязовіч.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

«АЛІМПІЙСКІЯ» ХУТКАСЦІ ДЛЯ ІНТЭРНЭТУ Ў МЕТРО

У маі МТС запусціць 4G і 3G у тунэлях мінскага метро. Пасажыры змогуць карыстацца 3G- і 4G-сеткамі паміж усімі станцыямі сталічнай падземкі. Сувязь будзе даступная ўздоўж дзвюх ліній агульнай працягласцю звыш 37 кіламетраў.

Мабільны інтэрнэт у тунэлях метро плануецца «разагнаць» да LTE-хуткасцяў. Нягледзячы на пастаянны рух цягніка, яго металічны корпус і вялікую колькасць пасажыраў, прапускная здольнасць сеткі будзе высокая. 4G-сувязь таксама з'явіцца на платформах усіх станцый сталічнай падземкі. Увогуле ў рамках праекта ёмістасць сеткі МТС у метро павялічыцца больш чым у чатыры разы.

«Арганізацыя мабільнай сувязі ў тунэлях мінскага метро — адзін з самых важных і чаканых праектаў. Мы плануем, што яшчэ да пачатку Еўрапейскіх гульняў мінчане і госці сталіцы змогуць свабодна карыстацца мабільным інтэрнэтам, пакуль едуць у цягніку. Што важна, гэта будзе не толькі 3G-сувязь, але і 4G, гэта значыць хуткасць доступу будзе дастаткова высокай і дазволіць, напрыклад, карыстацца відэакантэнтам у сталічнай падземцы», — растлумачылі ў МТС.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МУЖЧЫНЫ ЎПАЛІ Ў ВАДАСХОВІШЧА

Пасля поўначы ратавальнікам ад відавочцы паступіла паведамленне, што на Салігорскім вадасховішчы пад Мяцявіцкім мостам тонуць два чалавекі.

На месцы высветлілася, што на адлегласці каля 150 метраў ад берага ў вадзе пад мостам знаходзяцца два чалавекі. Самастойна выбрацца на сушу не могуць. Ратавальнікі пры дапамозе круга дасталі пацярпелых з вады і перадалі брыгадзе хуткай дапамогі. Мяркуецца, яны абодва былі нападпітку. Адзін з іх страціў раўнавагу і аказаўся за парэнчамі на ўзроўні двух метраў ад вады. Пры спробе ўтрымаць свайго знаёмага другі мужчына таксама страціў раўнавагу, і абодва звалiліся ў ваду. Пацярпелых шпіталізавалі ў рэанімацыю з папярэднім дыягназам «агульнае пераахаладжэнне», паведамілі ў МНС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГАРЫЗОНТЫ ГЕНРЫХА МЫСЛІЎЦА

Старажыл аграбізнесу забяспечвае ўвесь Мастоўскі раён агароднінай

І ў гэтым далёка не камерцыйны інтарэс фермерскай гаспадаркі «Гарызонт». Сваю прадукцыю фермер пастаўляе ў школы і садкі бясплатна. Дапамагае агароднінай і бульбай Жыровіцкаму манастыру. Як вопытны вытворца, Генрых Мыслівец паглыбляе сваю дзейнасць — не толькі вырошчвае, але і займаецца перапрацоўкай агародніны. Лічыць, што толькі свае, беларускія, інвестары здольны вывесці сельскую гаспадарку на новы ўзровень.

Моцны гаспадар і мецэнат

Са старшынёй райсавета Валерыем Табалой пад'язджаем да вытворчага комплексу фермерскай гаспадаркі «Гарызонт», што каля вёскі Пладовая. Вакол — наколькі хапае вока — узараная ралля. Гэтыя землі раней належалі двум калгасам, тлумачыць Валерый Іванавіч. Паступова ад кожнага частка перайшла да фермера Генрыха Мысліўца, які вырошчвае гародніну і бульбу. Аб тым, што зямля трапіла ў рукі гаспадара, сведчыць і валавы збор, і ўраджайнасць. Яна, дарэчы, вышэйшая, чым у сярэднім па раёне. Што датычыцца аб'ёмаў, фермер вырошчвае амаль усю агародніну раёна (98 %) і трэцюю частку бульбы (31 %).

Падчас нашага прыезду гружаны бульбай самазвал якраз быў гатовы да выезду. Гэта некандыцыйная прадукцыя накіроўвалася на крухмальны завод. А вось таварная праходзіць праз лінію ўпакоўкі і адпраўляецца ў розныя бакі — ад мясцовых супермаркетаў да замежных спажыўцоў. Напрыклад, у Малдову. Так ідуць справы і з агароднінай — морквай, буракамі, капустай, цыбуляй. Але фермер не толькі працуе дзеля прыбытку, ён забяспечвае сваёй прадукцыяй школы, дзіцячыя садкі, што дазваляе зрабіць харчаванне ў іх больш танным.

Вырашыў і зрабіў

Менавіта так можна вызначыць шлях Генрыха Мысліўца ў фермерскай справе. Пайсці на «свой хлеб» ён вырашыў у пачатку 90-х, як толькі з'явіўся закон аб фермерскай гаспадарцы. Згодна з ім пачалося крэдытаванне на закупку тэхнікі. Праўда, на месцах спачатку не ведалі, як гэту тэхніку рэгістраваць, і наогул глядзелі на яго падазрона. Але Мыслівец не здаўся. І ўжо на першых 10 гектарах, дзе пасадзіў бульбу і цукровыя буракі, даказаў, што фермер здольны працаваць рэнтабельна і якасна.

Па вырошчванні агародніны фермерская гаспадарка «Гарызонт» з'яўляецца самой буйной ва ўсім Гродзенскім рэгіёне. Цяпер у Мысліўца 720 гектараў worнай зямлі, гэта палова сярэдняга калгаса ў раёне. У наяўнасці — сучасная тэхніка, аўтарэфрыжэратары, лініі расфасоўкі і ўпакоўкі агародніны. Не так даўно тут пачалі займацца выпускам паўфабрыкатаў у вакуумнай упакоўцы. Робяць салаты, квасяць капусту. Дарэчы, попыт на капусту расце. Таму закваска вядзецца пастаянна. Прадукцыю развозяць як па раёне, так і па вобласці. Летась у вёсцы Пладовая адкрылі сваю краму. У планах — наладзіць замарозку агародніны.

Айчынны вытворца патрабуе ўвагі

Тэхналагічны ланцужок, на думку фермера, мера вымушаная. Шматпрофільнасць характэрная для аграхолдынгаў, а вось малыя гаспадаркі павінны мець вузкую спецыялізацыю.

— Адзін павінен вырошчваць, другі — перапрацоўваць, хтосьці прадаваць, — лічыць Генрых Валяр'янавіч. — Кожны займаецца сваёй справай і ўдасканальвае яе. Але для гэтага патрэбны адпаведныя вытворцы, якія ішлі б у аграбізнес, прычым нашы, беларускія.

Магчымасці для гэтага ёсць. Для закупкі тэхнікі існуюць лізінгавыя праграмы. Але варта зацікавіць менавіта сваіх інвестараў, якія выраслі на гэтай зямлі. Яго, як вытворцу і дэпутата абласнога савета, клапоціць стан айчыннага рынку.

— Сёння рынак адкрыты для ўсіх. І часта прыходзяць не толькі праверэныя вытворцы, але і фірмы-аднадзёнкі, якім важна атрымаць імгненны звышпрыбытак, — адзначае фермер. — Таму вельмі важна абараніць айчынных вытворцаў, якія працуюць на якасць. Каб яны мелі доўгатэрміновыя кантракты і сістэму дагавораў. Інакш кажучы — стабільныя ўмовы работы.

Генрых Валяр'янавіч прыводзіць прыклад работы расійскага фермера, які прыязджаў да яго з Калінінграда. Там фермерам даюць крэдыты пад 3—5 % гадавых для развіцця сельскай гаспадаркі. Гэта дазваляе адразу набыць увесь камплект неабходнай тэхнікі і апрацоўваць вялікія аб'ёмы.

— Цяпер Расія насычае свой рынак уласнай прадукцыяй — бульбай, яблыкамі... І вельмі жорстка адсочваецца, каб нічога не завозілася, каб менавіта свая прадукцыя знаходзіла збыт. Такая ж сітуацыя і ў Еўропе. Нават сёлета, калі там быў дэфіцыт бульбы, прадаць туды беларускую прадукцыю было немагчыма. Я адпраўляў чырвонакачанную капусту, якая не мае ў нас асаблівага попыту, — заўважыў Генрых Мыслівец.

Ці заменіць фермер калгас?

Пакуль пытанне не стаіць так востра. Тым не менш вопыт паспяховых фермерскіх гаспадарак вывучаецца. Аб іх значнасці сведчыць і наведванне фермера урадавай дэлегацыяй на чале з прэм'ер-міністрам у 2017 годзе. І зараз ідзе гаворка аб тым, каб прыцягнуць інвестараў да рэструктурызацыі неэфектыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Не сакрэт, што зараз нямала калгасаў, якія знаходзяцца ў працэсе санацыі, гэта значыць могуць стаць банкрутамі. Генрых Мыслівец такой перспектывы для сябе не ўяўляе. З году ў год ён толькі ўдасканальвае вытворчасць і нават гатовы пашырыць свае плошчы.

Дарэчы, у фермерскай гаспадарцы працуе больш за 40 чалавек. І ахвотных хапае. Гэта сведчыць аб тым, што рынак працы ёсць. Як адзначыў старшыня райсавета Валерый Табала, добрым стымулам для развіцця вёскі можа стаць магчымасць прадаваць уласную прадукцыю. Гэта дазволіць мець свае традыцыі ці адрадзіць тыя, якія страчаны, напрыклад, па вырабе сыроў, выпечцы караваяў альбо проста нейкіх страў, якія добра атрымліваюцца ў мясцовых гаспадынь. Ад такога падворка можа ўзнікнуць і фермерская гаспадарка. Дарэчы, цяпер у Мастоўскім раёне налічваецца 30 фермераў, і гэта нямала. Некаторыя развіваюць аграсядзібы. Ёсць такія планы і ў Генрыха Мысліўца. А яшчэ — завесці невялічкую ферму, каб зрабіць вытворчасць безадходнай. Пасці сваіх кароваk ён марыць на полі, непадалёку ад ракі.

— Паглядзіце ў акно, гэта пойма ракі, там трава ў пояс, раней пасліся 300 кароў з нашых вёсак, мы туды пусцім статак, гэта і будзе вяртанне традыцый, — кажа Генрых Валяр'янавіч.

Але пакуль яго больш хвалююць надзённыя праблемы. Вось-вось пачнецца сяўба. Фермер ужо вызначыўся з плошчай і культурамі, дарэчы, ён усё актыўней пераходзіць на арганічнае земляробства. Амаль палова бульбяных палеткаў вырошчваецца без выкарыстання гербіцыдаў. Мастоўскі фермер гатовы яшчэ прыдбаць зямлі і вырошчваць сваю агародніну і бульбу.

— Каб не везлі з Галандыі ці яшчэ адкуль, — зазначае ён. — Будзе зямля — і мы забяспечым сваёй прадукцыяй беларусаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Пасля «Вялікай размовы»

САДОК ПОБАЧ З ДОМАМ

Падчас акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту» ліст напісала Вікторыя Зыковіч з Брэста. Мама дваіх дзяцей станоўча ацаніла работу, якая вядзецца па падрыхтоўцы горада да 1000-годдзя. Але, на яе думку, новыя масты, дарогі, іншыя грамадскія аб'екты не вырашаць праблему многіх і многіх бацькоў дашкольнікаў, таму трэба яшчэ будаваць садкі. «Я пражываю ў мікрараёне Кавалёва, працую ў гэтым жа раёне, — піша аўтар звароту, — а дзіця вымушаная вазіць у другі раён — Усход. Хоць побач з маім домам па вуліцы Луцкай размешчаны тры дзіцячыя садкі».

Далей жанчына апісвае, як звярталася ў аддзел адукацыі Маскоўскага раёна Брэста перад уладкаваннем дзіцяці ў садок, як ёй адмовілі. З часам прасіла ўжо перавесці дачку з садка на Усходзе ва ўстанову бліжэй да дому, зноў атрымала адмоўны адказ па прычыне адсутнасці месцаў. «Як можна думаць пра павелічэнне сям'і, калі і другое дзіця не магу ўладкаваць у садок побач з домам?!» — задаецца рытарычным пытаннем жыхарка Брэста.

Аўтар гэтых радкоў таксама жыве ў мікрараёне Кавалёва па вуліцы Луцкай. Магу сказаць, што і дваццаць гадоў таму праблема ўладкавання ў садок крокавай даступнасці была — не такой вострай, як цяпер, але была. Мікрараён адносна малады. Вікторыя кажа аб трох дашкольных установах, якія відаць з вокнаў яе кватэры. Насамрэч іх чатыры, хіба што садок № 82 на пяць хвілін хадзьбы далей ад згаданых трох, якія знаходзяцца фактычна ў адным квартале. Але ж за апошнія два дзесяцігоддзі навакол пабудавана столькі жылля, што месцаў сапраўды стала катастрафічна не хапаць. А цераз дарогу ад кварталаў забудовы вакол вуліцы Луцкай на вачах расце яшчэ адзін мікрараён пад назвай Лагуна.

— Вось тут і ўзводзіцца школа-садок на 471 месца, у тым ліку на 150 дашкольных, — паведаміў **начальнік аддзела адукацыі Брэсцкага гарвыканкама Анатоль НАСКОЎ.** — Зараз у дашкольных установах горада займаецца 17 тысяч дзяцей. Праблема дэфіцыту месцаў у садках узнікла не ўчора. Горад імкнецца яе вырашаць рознымі шляхамі. Калі чатыры гады таму не хапала дзве з паловай тысячы месцаў, то цяпер дэфіцыт складае каля дзвюх соцень. І гэты разрыў скараціўся таму, што апошнім часам уведзена ў эксплуатацыю больш за 3,5 тысячы месцаў. Па-першае, павялічвалі напаўняльнасць дашкольных груп, а па-другое рамантавалі і вярталі памяшканні, якія раней былі дзіцячымі садкамі, а потым перадаваліся ў іншыя ведамствы. Напрыклад, дзіцячы садок на 350 месцаў па вуліцы Благавешчанскага не так даўно ўвялі ў строй, цяпер там уладкавана больш за 400 дзяцей, атрымалася размясціць дадатковыя месцы. Па вуліцы генерала Ракасоўскага плануецца правесці рэканструкцыю садка і таксама павялічыць колькасць дашкольных месцаў. Пачынаюцца праектныя работы па будаўніцтве садка ў мікрараёне Вулька-3. Гэта суседнія раёны з памянёным Кавалёвам. Значыць, можна спадзявацца, што ў раёне пражывання Вікторыі Зыковіч садкі будуць патроху разгружацца.

А пакуль заяўніцы паабяцалі вярнуцца да пытання восенню. Калі будзе праведзена камплектацыя груп на наступны навучальны год і застануцца месцы, яе дачку перавядуць у садок побач з домам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Крокі да экалогіі

СМЕЦЦЕ ПРЫНОСІЦЬ ПРЫБЫТАК

У Наваполацку ёсць прадпрыемства, якое збірае і перапрацоўвае другасныя рэсурсы. Цікава, што першымі ў вобласці, другімі ў краіне тут пачалі ўсталёўваць заглыбленыя кантэйнеры для смецця, якія можна ўбачыць і ў ЕС. У Віцебскім аблвыканкаме, улічваючы добры вопыт Біямехзавода бытавых другасных рэсурсаў, даручылі прадпрыемству збіраць смецце і ў Полацкім раёне. Чым ужо і займаюцца. А ў найбліжэйшай перспектыве будуць рабіць гэта ў Расонскім і Ушацкім раёнах. Тым больш што ёсць нагода — стварэнне першага міжраённага палігона для цвёрдых бытавых адходаў. Яшчэ больш цікава, што, акрамя вырабу пластыкавых «паўфабрыкатаў», у Наваполацку з другасных рэсурсаў навучыліся рабіць тратуарную плітку і бардзюр.

Выконваючы абавязкі дырэктара вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» Сяргей ВЯЛЮГА.

На вытворчым камунальным унітарным прадпрыемстве цікавы вопыт для перайманння напярэдадні Дня камунальніка вывучаў наш карэспандэнт.

Карысныя бактэрыі

У Наваполацку, адным з самых маладых гарадоў краіны, зборам смецця займаюцца дзве арганізацыі. Спецаўтабаза адказвае за чысціню каля гарадскіх аўтадарог і ў парках, скверах — усюды па-за дварамі. І плюс — смеццевы палігон знаходзіцца на іх балансе. А прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» збірае цвёрдыя бытавыя адходы ў жылым сектары. Абслугоўвае таксама юрыдычных асоб.

— Стварэнне завода пачалося ў 2003-м. Тады ў Беларусі яшчэ абмяркоўвалі неабходнасць збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. Доўгі час заняло будаўніцтва нашага прадпрыемства — на базе будынкаў (фактычна каркасаў) вучэбна-вытворчага комплексу былога будаўнічага трэста. Далей было набыццё, запуск неабходнага абсталявання. Фінансаванне вялося з гарадскога бюджэту пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — расказвае **выконваючы абавязкі дырэктара вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» Сяргей ВЯЛЮГА.**

Фактычна завод увялі ў эксплуатацыю ў снежні 2010-га. Тады і пачаліся збор, вываз цвёрдых камунальных адходаў на завод для сартавання і біямеханічнай апрацоўкі. Пасля сартавання пластмасы ў спецыяльным сховішчы бактэрыі з'ядаюць арганічную частку смецця. Дарэчы, арганіка пасля «апрацоўкі» бактэрыямі — кампаставаная сыравіна, прыдатная для абвалавання і перасыпкі на палігоне слаёў цвёрдых камунальных адходаў.

Як у Еўропе

— У 2017-м мы засвоілі новы метад захоўвання камунальных адходаў, калі быў усталяваны першы заглыблены кантэйнер. На сёння ў горадзе каля пяцідзесяці заглыбленых кантэйнераў і больш за дваццаць наземных. Апошнія знешне не адрозніваюцца ад «сабратаў». Толькі аб'ём меншы — тры «кубы», а падземнага — пяць метраў кубічных. Іх усталёўваем там, дзе ёсць складанасці з правядзеннем падземных работ з-за камунікацый. Кантэйнеры вырабляюцца ў Беларусі і Расіі. Усе выкарыстаныя матэрыялы, тэхналогіі і абсталяванне адпавядаюць сучасным еўрапейскім узорам. Корпус кантэйнера мае суцэльналітую канструкцыю і зроблены з трывалага поліэтылену, — працягвае кіраўнік прадпрыемства.

Пагрузка спрасаваных пластыкавых другасных рэсурсаў.

Фінансуецца ўсталяванне за кошт сродкаў дзяржаўнай праграмы, распрацаванай для камфортнага жылля, і нацыянальнага аператара другасных рэсурсаў.

Суразмоўца прызнаўся, што некаторым жыхарам спачатку не вельмі спадабалася новаўвядзенне. Скардзіліся, што нязручна адчыняць века кантэйнера, выказвалі асцярогу, што ўнутр можа ўпасці дзіця, пра верагоднасць пажару з-за, напрыклад, непагашанай цыгарэты...

З людзьмі праводзілі тлумачальную работу. І з часам новапалачане ацанілі зручнасць.

Цікава, дарэчы, назіраць, як «кішку» са смеццем дастаюць пры дапамозе крана і загружаюць новы «мех». Ёсць і кантэйнерныя «блокі», якія цалкам вывозяцца на платформах...

Вопыт вывучалі на месцы падчас калегіі Міністэрства ЖКГ і семінара для работнікаў сістэмы камунальнай гаспадаркі. Дарэчы, такі паказчык, як збіральнасць другасных матэрыяльных рэсурсаў, у Наваполацку самы высокі на Віцебшчыне — каля 42 кілаграмаў у год на чалавека. Працэнт адходаў, якія адбіраюцца з ДМР, — 18,4 %, на ўзроўні абласнога.

КПП стацыянарныя і на колах

У Наваполацку завод арганізаваў і дзейнасць комплексных прыёмных пунктаў.

Цяпер у нафтаградзе пяць стацыянарных КПП, у тым ліку адзін — на тэрыторыі прадпрыемства. Ёсць і два перасоўныя, якія ездзяць у тым ліку па садаводчых таварыствах і гаражных кааператывах. Абслугоўваюць і Полацк. Прымаюць макулатуру: кардон, часопісы, газеты. Людзі ахвотна здаюць і поліэтыленавую плёнку, напрыклад, дачнікі, калі змяняюць на цяпліцах на новую. Купляюць і адходы шкла ў любым выглядзе. Пры гэтым, калі грамадзянін робіць сартаванне бутэлек па колеры, ён атрымлівае больш грошай.

— А вось ПЭТ-бутэлькі на КПП не прымаем: з-за вялікага аб'ёму няма месца для часовага захоўвання. Паўтараруся, гараджане навучыліся дастаткова добра сартаваць іх у кантэйнеры для асобнага збору. Усяго па горадзе, акрамя згаданых, каля 1300 кантэйнераў — для асобнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. І гэта на 107 тысяч насельніцтва.

Прымаем адходы іншых пластмас. Напрыклад, розную тару. У прыватнасці, каробкі ад розных напояў. Нарыхтоўваем і каністры любога аб'ёму: ад алеяў да растваральнікаў.

Купляем і флакончыкі ад бытавой хіміі, харчовай прадукцыі. Ад кетчупаў, напрыклад, мыйных сродкаў, шампуню, касметыкі... Забіраем бытавую электронную і электрычную тэхніку: халадзільнікі, тэлевізары, газавыя пліты, пральныя машыны, фены, прасы і гэтак далей — усё, што ўтыкаецца ў разетку. Канешне, і за гэта плацім, на вуліцу толькі трэба вынесці, — канстатуе суразмоўнік.

На чатыры раёны...

Упершыню ў Віцебскай вобласці ствараецца міжрэгіянальны палігон для захоўвання смецця. Гэта дазволіць закрыць дзясяткі міні-палігонаў. Новы размесціцца пад Полацкам. Завод, акрамя Наваполацка і Полацкага раёна, будзе нарыхтоўваць сыравіну ў суседніх Расонскім і Ушацкім. Адпаведнае рашэнне прынялі ў Віцебскім аблвыканкаме. Выпадак унікальны.

— Гэта дазволіць аптымізаваць выдаткі, наладзіць больш эфектыўны збор смецця, адбор другасных матэрыяльных рэсурсаў. Летась разам з полацкім смеццем апрацавалі каля 220 тысяч кубоў. Прырост склаў прыблізна 80 працэнтаў. Пасля далучэння тэрыторый яшчэ двух раёнаў выйдзем на аб'ём больш за 500 тысяч кубаметраў у год. Павелічэнне дазволіць на поўную загрузіць прадпрыемства сыравінай, — разважае Сяргей Вялюга.

Канешне, арганізацыі, якая раней абслугоўвала малады горад, цяжкавата працаваць у нязвыклых абставінах, на мясцовасці, якая яшчэ не вельмі дастаткова вывучана. Бывае, людзі скардзяцца на тое, што нясвоечасова вывозяць смецце. Але выконваючы абавязкі кіраўніка ўпэўнены, што з часам усё наладзіцца.

— У Наваполацку, напрыклад, няма прыватнага сектара, у Полацку — наадварот, такога жылля нямала. Плюс там ёсць аднакватэрныя і двухпавярховыя дамы, дзе нязручна аказваць паслугу па вывазе цвёрдых камунальных адходаў.

Там, дзе вузкія вуліцы, не ўсюды могуць праехаць аўто для зборкі смецця з так званай задняй загрузкай. Усяго, дарэчы, у нас разам з полацкімі машынамі, якія нам перадалі, больш за 40 грузавікоў спецыяльнага прызначэння. Ёсць шмат сучасных смеццявозаў і звычайныя параўнальна невялікія па габарытах МАЗы. У Полацкім раёне, які нам перадалі для абслугоўвання, больш за 400 вёсак. Сярод іх каля 40 — ужо нежылыя. Больш за сто — да 10 чалавек і больш... Усё давялося арганізоўваць па-новаму — пад сваю спецыфіку. Працэс станаўлення не скончаны, ды яшчэ паралельна прыйдзецца вывучаць два згаданыя раёны, — працягвае кіраўнік.

«Элементы гарадскога дэкору»

Тут вырабляюць так званую пластыкавую флексу, якую прадаюць у Беларусі і на экспарт у Расію — да 20 тон у месяц, — для перапрацоўкі і вытворчасці новых вырабаў.

Робяць на заводзе плітку і бардзюры. Між іншым, гэтыя «элементы гарадскога дэкору» — вельмі надзейныя пры перападах тэмператур. У прыватнасці, калі звычайная бетонная плітка пакрываецца льдом, пластыкавая — наадварот. Зразумела, пластык — ідэальны матэрыял і супраць вільготнасці, таму такая плітка і бардзюры даўжэй захоўваюць свае якасці. Яны вагой значна меншыя, ды і цана адрозніваецца ў бок памяншэння.

Пакуль завяршаецца ўзгадненне ўсіх неабходных дакументаў. У планах — выкарыстоўванне будаўнічых канструкцый уласнай вытворчасці для добраўпарадкавання тэрыторый каля смеццевых бакаў. Атрымліваецца двайная выгада. Аналагічнае ўжо паспяхова практыкуецца ў Гомелі. Але там больш пашырана вытворчая лінейка ўласнай прадукцыі.

Што датычыцца вынікаў дзейнасці прадпрыемства, то працуе яно з рэнтабельнасцю каля 3 % у год. У штаце каля 200 чалавек. Сярэдні заробак набліжаецца да 780 рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Заглыбленыя кантэйнеры для смецця ў дварах горада.

Грамадзянская супольнасць

Паслядоўніцы Ефрасінні

Беларускі саюз праваслаўных жанчын пачне работу ў найбліжэйшыя месяцы. Установучае пасяджэнне новага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання адбылося днямі ў Мінску.

— Размовы наконт з'яўлення такой арганізацыі ў Беларусі хадзілі даўно. Былі розныя прапановы, кропкава ўзнікалі ініцыятывы. Напрыклад, у Віцебску ўжо даўно існуе абласное аддзяленне міжнароднага Саюза праваслаўных жанчын, — падзяліўся **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па ўзаемадзеянні царквы і грамадства, протаіерэй Мікалай КОРЖЫЧ.** — Зараз настаў той самы момант, калі склалася ініцыятыўная каманда, гатовая без прамаруджання ўзяцца за работу на рэспубліканскім узроўні. Гэта цудоўная навіна!

Плануецца, што арганізацыя аб'яднае намаганні праваслаўных беларусак для вырашэння праблем у самых розных сферах: ад духоўна-асветніцкай і культурнай да сацыяльнай і экалагічнай. Сярод задач — дабрачыннасць, адукацыйныя ініцыятывы, падтрымка жанчын і іх сем'яў у складаных жыццёвых сітуацыях, развіццё праграм па ўзмацненні здароўя нацыі і іншыя.

— Сёння надзвычай важна захаваць духоўна-маральную спадчыну, папулярызаваць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, якія заставаліся нязменнымі амаль тысячагоддзе на нашай зямлі, аднак апошнім часам апынуліся пад пагрозай. А паколькі праваслаўная вера аб'ядноўвае многія народы па ўсім свеце, мы будзем імкнуцца і да ўзмацнення сяброўскіх адносін паміж прадстаўніцамі розных краін, — расказала **старшыня першага пасяджэння БСПЖ Таццяна БАРШЧЭЎСКАЯ.** — Акрамя таго, саюз будзе развіваць супрацоўніцтва беларускай праваслаўнай царквы з інстытутамі грамадзянскай супольнасці. Не на апошнім месцы сярод задач арганізацыі стаіць патрыятычнае выхаванне.

З вітальным словам да праваслаўных жанчын звярнуўся **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ:**

— Шматвекавая гісторыя царквы Хрыстовай сведчыць, што праваслаўная жанчына падараваныя ёй Богам таленты можа раскрыць не толькі ў сям'і і блізкім коле людзей, але і ў грамадскім служэнні. Адным з яркіх таму прыкладаў з'яўляецца жыціе Святой заступніцы Беларусі прападобнай Ефрасінні, ігуменні і княгіні Полацкай, якая была ў роўнай меры і вялікай малітвенніцай, і вялікай працаўніцай. Яна сваімі рукамі перапісвала кнігі і тым самым пакінула след у гісторыі айчыннай культуры. Яна мірыла князёў, якія знаходзіліся ў стане вайны, а значыць, несла найважнейшае дзяржаўнае служэнне, узмацняючы сваімі справамі асновы грамадства і краіны. Постаць Святой Ефрасінні кажа пра тое, што справы праваслаўнай жанчыны ў гонар Бога могуць адыграць знакавую сацыяльную і гістарычную ролю.

Нягледзячы на тое што Беларускі саюз праваслаўных жанчын зараз знаходзіцца ў стадыі стварэння, цікавасць да яго ўжо праяўляюць з-за мяжы. Так, праўленне міжнароднага Саюза праваслаўных жанчын выказала жаданне падпісаць дамову аб супрацоўніцтве адразу пасля афіцыйнай рэгістрацыі БСПЖ.

Ганна КУРАК.

Пачынаюцца авіярэйсы ў Талін

Беларускі перавозчык адкрывае рэгулярныя палёты туды з 30 мая.

Як паведаміла **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ААТ «Белавія» Анастасія НАВУМЕНКА,** рэйсы па маршруце Мінск — Талін — Мінск будуць адбывацца чатыры разы на тыдзень з вылетам з нашай сталіцы ў 8.50 па панядзелках, чацвяргах і ў 15.50 па аўторках і суботах з прыбыццём у міжнародны аэрапорт Таліна імя Ленарта Меры. Зваротны рэйс плануецца рабіць з вылетам у 10.45 па панядзелках, чацвяргах і ў 17.45 па аўторках і суботах з прылётам у Нацыянальны аэрапорт «Мінск» (час для аэрапортаў указаны мясцовы).

Кошт авіябілетаў у адзін бок — ад 93 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 178 еўра — туды-назад. Білеты ўжо ў продажы. Палёты плануецца рабіць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175, які ўмяшчае 76 пасажыраў. Пералёт зойме адну гадзіну 15 хвілін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

100 ідэй для Беларусі

СПАДЧЫНА СТРАЧАНАЯ, АЛЕ НЕ ЗАБЫТАЯ

Праект па вяртанні знакавых аб'ектаў запусцілі вучні і педагогі ў Свіслацкім раёне

Ідэя ў тым, каб зрабіць пад адкрытым небам музей з макетамі былых храмаў. Некалі касцёлы і цэрквы мелі даволі велічны выгляд, але з цягам часу былі разбураны і зніклі. Аўтары праекта прапануюць аднавіць іх з дрэва і камянёў. Ёсць намер увекавечыць зніклыя вёскі і хутары.

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Храмы — у рост

Этнаграфічным праектам заняліся вучні і педагогі дзвюх устаноў адукацыі — вучэбна-педагагічных комплексаў у Корнадзі і Дабраволі. Педагогі і вучні аб'ядналіся, каб вярнуць з небыцця знакамітую спадчыну свіслацкага краю. У першую чаргу гэта храмы і сядзібы, якіх было даволі шмат.

— Мы правялі даследчую работу, звярнуліся да твораў Напалеона Орды, Віктара Карпызы, іншых мастакоў і вызначылі, якія храмы былі раней на тэрыторыі Свіслацкага раёна, які іх лёс і ўвогуле гісторыя, — расказала **навуковы кіраўнік праекта, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Вольга ЛЫСЕВІЧ.** — Мы гаворым менавіта аб тых храмах, якія так і не былі адноўлены.

На падставе гістарычных матэрыялаў школьнікі і педагогі зрабілі невялікія макеты храмаў. Праект быў прадстаўлены на абласным туры рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Прэзентацыя — гэта толькі пачатак работы.

Якім аўтары бачаць свой музей? Па-першае, гэта будуць вялікія, у рост чалавека, макеты былых храмаў. Бо для музея пад адкрытым небам патрэбны менавіта маштабныя аб'екты, каб можна было пахадзіць вакол іх, памацаць. А каб макеты былі трывалымі, іх мяркуюць зрабіць з выкарыстаннем дрэва і камянёў. Да ажыццяўлення задумкі ёсць намер прыцягнуць жыллёва-камунальную гаспадарку, краязнаўчы музей, нацыянальны парк «Белавежская пушча».

Модуль для хутара

Храмы — не адзінае, што будзе размешчана ў музеі пад адкрытым небам. Другой важнай часткай стануць драўляныя модулі з назвамі зніклых вёсак і хутароў. Зараз на тэрыторыі Свіслацкага раёна сем сельскіх Саветаў. Кожнаму модулю будзе адпавядаць сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіліся некалі тыя паселішчы.

— Знікае многа вёсак і хутароў. Каб гэта неяк увекавечыць і нагадаць людзям аб мінулым іх малой радзімы, мы правялі даследчую работу і выявілі напачатку ўсе назвы гэтых зніклых вёсак і хутароў. Раней такіх раскіданых паселішчаў было вельмі шмат, але ў дваццатым стагоддзі яны пачалі хутка знікаць.

Гісторыю збіралі па крупіцах. Некаторыя факты падказалі мясцовыя жыхары, старажылы гэтых мясцін. Так аматары-краязнаўцы даведаліся пра хутар Харашэвічы, што ў Ханявіцкім сельскім Савеце. Кажуць, што назва Харашэвічы звязана з урадлівай глебай. У 30-я гады XIX стагоддзя тут было нямала хутароў з такой назвай. Вёска існуе і зараз, захавалася тут і старажытная царква. А вось былы маёнтак Мікалая Булгарына, які валодаў гэтымі землямі, не захаваўся, хаця да нядаўняга часу можна было ўбачыць гаспадарчыя пабудовы.

Трапіць у музейную экспазіцыю і старадаўняя сядзіба ў вёсцы Юзафполь. Гэта прозвішча гаспадароў, якія пабудавалі тут у канцы XIX стагоддзя палац у стылі класіцызму. Збярэгліся толькі некалькі гаспадарчых пабудоў, якія служылі збожжасховішчам мясцовым сялгаспрадпрыемствам.

Аўтары праекта даведаліся аб гісторыі многіх хутароў, якія зніклі з карты раёна. Напрыклад, Яліны, што ў пушчы, поўнасцю былі акружаны хваёвымі лясамі. Былі тут і хутары па прозвішчах — Кучынскі, Цымлёва, Юзэфава, Сіпліва-га, Бусла, Субатка. Быў нават хутар Лубянка. Ён утварыўся ў 30-х гадах мінулага стагоддзя на месцы былой сядзібы. Старажылы кажуць, што гэта назва звязана са старажытнымі заняткамі мясцовых жыхароў, якія ў рэчцы мачылі луб, а на хутары вілі вяроўкі. З мянушкай звязана назва хутара Чолы. У 1939 годзе праз яго прайшла дзяржаўная мяжа СССР і ўтварылася пагранзастава «Чолы». Зараз яна перайменавана ў «Магілёўскую».

Усяго такіх хутароў школьнікі з педагогамі налічылі каля сотні. Дарэчы, многія назвы захаваліся і да гэтага часу. Толькі зараз так завуць лясны масіў альбо поле.

Зацікавіліся ўлады

Сабраны матэрыял сістэматызаваны. Распрацавана інтэрактыўная экскурсія для будучага музея, у якасці экскурсаводаў выступаюць самі вучні.

— Унікальны наш праект яшчэ і тым, што не патрабуе вялікіх затрат, — падкрэслівае Вольга Лысевіч. — Усе неабходныя матэрыялы ёсць на тэрыторыі Свіслацкага раёна. Мы плануем гэта ўсё зрабіць з дрэва. Наш раён лясны, думаем, што зможам знайсці дапамогу ў леснікоў. Таксама нашы партнёры — сельскія Саветы, райвыканкам.

Да праекта далучыліся сельскія Саветы. **Старшыня Дабравольскага сельскага выканаўчага камітэта Віктар ФІЛІНОВІЧ** расказаў, што зараз вядзецца распрацоўка зямельнага ўчастка пад будучы музей. Улады ўзялі на сябе юрыдычную частку справы, афармленне дакументацыі. Абяцаюць садзейнічаць у перагаворах з нацыянальным паркам «Белавежская пушча».

Праект «Страчаная спадчына Свіслацкага краю» можа стаць яшчэ адным цікавым турыстычным аб'ектам у раёне. Уладкаваць музей пад адкрытым небам аўтары прапануюць каля аднаго з былых хутароў, дзе зараз адкрыты гасцінічныя комплексы. Тэрмін рэалізацыі — найбліжэйшыя два гады. На думку арганізатараў, музей будзе цікавы як турыстам, так і мясцовым жыхарам, якія змогуць больш даведацца аб зямлі сваіх продкаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

Квадраты памяці

Выдадзена новая кніга пра Хатынь

«Два годзікі было Мішу Навіцкаму, Юзіку Іотку, Леначцы Мірановіч, Мішу Яскевічу, Валодзі Карабану. Тры гады споўнілася Хрысціне Рудак, Ганначцы Федаровіч, Раі Жалабковіч, Васі Мірановічу... Самы маленькі, сямітыднёвы Толік, апынуўся там разам са сваёй маці, 19-гадовай Верай Яскевіч»... Гэта толькі асобныя імёны малых, якія загінулі 22 сакавіка 1943 года ў Хатыні. Усяго ж у той дзень сярод спаленых і расстраляных жыхароў вёскі было 75 дзяцей.

Пра тыя жудасныя падзеі расказвае новая кніга «Хатынь. Трагедыя беларускіх вёсак», аўтарам якой з'яўляецца **гісторык, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Артур ЗЕЛЬСКІ.** «Навуковы пошук бясконцы. Заўсёды адкрываюцца нейкія новыя факты, — якія, што называецца, нажом рэжуць па сэрцы, — дзеліцца Артур Гарыевіч. — Гэту кнігу было цяжка пісаць. Чытаеш дакументы, а там расказваецца, як на вачах у маці забіваюць яе старэйшую дачку, пасля малодшага сына... А як уявіць трагедыю маленькага хлопчыка ці дзяўчынкі, калі ў іх яшчэ ўчора быў утульны дом, бацькі, і раптам нешта здарылася — і гэтага нічога няма, а побач невядомыя, злыя, абыякавыя людзі».

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Кніга расказвае пра знішчэнне Хатыні карнікамі і гісторыю стварэння мемарыяльнага комплексу. Таксама ў ёй змешчаны звесткі пра вёску пачынаючы з XVI стагоддзя. «Мы хацелі зрабіць кнігу пра Хатынь, якая будзе вылучацца і мастацкім афармленнем, і новым падыходам. Важна было паказаць, якое жыццё тут было раней і як яго абарвала вайна», — адзначыла **галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Ларыса ЯЗЫКОВІЧ.**

Такі падыход, калі распавядаецца пра папярэднюю гісторыю канкрэтнага населенага пункта, быў выкарыстаны і пры рабоце над іншымі кнігамі серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці», якую выдавецтва распачало летась. Навукова-папулярная літаратура, падрыхтаваная беларускімі гісторыкамі, работнікамі архіваў і музеяў, раскажа пра месцы масавага знішчэння ваеннапалонных, партызанаў, падпольшчыкаў і мірных грамадзян.

У межах серыі ўжо выйшлі кнігі, прысвечаныя Трасцянцу і Навагрудскаму гета. Дарэчы, апошняя расказвае не толькі пра расстрэлы яўрэяў, але і пра супраціўленне — змешчаныя за калючым дротам, пад пільным надзорам аховы людзі змаглі патаемна выкапаць тунэль даўжынёй больш за 200 метраў і арганізаваць масавыя ўцёкі вязняў, а пасля стварылі партызанскі атрад Т. Бельскага.

Паступова серыя будзе папаўняцца новымі «квадратамі памяці» (так падчас прэзентацыі назвала кнігі архітэктар Галіна Левіна, адзін з аўтараў Трасцянецкага мемарыяла). Зараз рыхтуецца выданне, якое раскажа пра лагер смерці ў Масюкоўшчыне. У планах аповеды пра Слонім, Бабруйск, Азарычы, Красны Бераг. Новым праектам зацікавіліся рэгіянальныя музеі — яны дасылаюць тэксты, фатаграфіі, якія сведчаць пра трагедыі, што адбываліся ў іх раёнах.

«Мы павінны разабрацца, у якіх формах захоўваць памяць і як даносіць інфармацыю да тых, хто першы раз сустракаецца з гэтай тэмай», — заўважыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі Петэр ДЭТМАР.** Гэты праект «Беларускай Энцыклапедыі...» якраз скіраваны на падрастаючае пакаленне.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Новыя кнігі

РОДНАЯ КЛАСІКА — ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У «Мастацкай літаратуры» прадаўжаецца кніжная серыя «Жывая класіка дзецям». Як новая сустрэча з чытачом — зборнік Уладзіміра Караткевіча «Жабкі і Чарапаха».

У кнізе — дзве казкі: тая, што дала назву зборніку, — «Жабкі і Чарапаха» і «Верабей, сава і птушыны суд». Класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча нельга назваць дзіцячым пісьменнікам. Хіба што, як і дарослым, з адноліавай настойлівасцю падлеткам можна параіць прачытаць і «Дзікае паляванне караля Стаха», і «Чорны замак Альшанскі», і нават раман «Нельга забыць». А што да адносін вялікага пісьменніка з зусім юным чытачом, то кніга казак — выдатная магчымасць выхавання любові да роднага слова і ўвогуле выхавання добрых пачуццяў, добрага густу, дабра, цеплыні і справядлівасці. «На беразе маленькага лясного возера-балотца разгарлаліся, разышліся і наладзілі канцэрт жабы. Церушыў на іхнія галоўкі цёплы дождж, святліла праз яго сонца. Весела было жабкам — вось яны і спявалі...» Так пачынаецца адна з казак. І ўжо з самага пачатку трапляеш у палон спакойнага караткевічаўскага аповеду, трапляеш у стыхію роднай мовы. Што, пагадзіцеся, надзвычай важна, калі дзеці, юныя чытачы яшчэ толькі адкрываюць для сябе беларускую мову.

Сімпатычныя ілюстрацыі да кнігі намалявала Элеанора Ляхновіч, а выпуск выдання ажыццёўлены па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Серыя «Жывая класіка дзецям» — добрая выдавецкая традыцыя. Важна, каб яна прадстаўляла юным чытачам і іх бацькам як мага болей узораў добрай дзіцячай літаратуры. Янка Маўр, Васіль Вітка, Эдзі Агняцвет, Пятрусь Броўка, Уладзімір Дубоўка, Змітрок Бядуля — хіба ж гэта не тыя пісьменнікі, чые творы, адрасаваныя дзецям, і з'яўляюцца класікай?! Значыць, паліцы кнігарняў, гандлёвых павільёнаў, дзе прадаецца і перыядычны друк, проста павінны быць запоўнены кнігамі з серыі «Жывая класіка дзецям». А мо яшчэ ім павінна знайсціся месца і ў тых крамах, дзе прадаюцца цацкі, тавары для дзяцей?..

Сяргей ШЫЧКО.

Інтэлектуальны штурм

ЧАМУ МАТЫВАЦЫЯ — СТРАТЭГІЧНАЕ ПЫТАННЕ?

Якія з агучаных на TEDxMinsk ідэй здольныя змяніць жыццё да лепшага...

Ці варта хваліць дзяцей і як увогуле можа ўздзейнічаць на чалавека пахвала? Якія якасці трэба цаніць і выхоўваць у падрастаючым пакаленні ў першую чаргу: працалюбства, стараннасць або фантазію? Чаму адчуваць сябе бедным і быць бедным — не адно і тое ж? Наколькі рызыкоўна ставіць асабістыя інтарэсы работнікаў кампаніі вышэй за карпаратыўныя? Што значыць выглядаць безгустоўна? Ці можна спалучыць любоў да піва з марафонамі? Чаму ваўкоў трэба абараняць ад чалавека, а не наадварот? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні можна было атрымаць на канферэнцыі TEDxMinsk, якая прайшла ў сценах Купалаўскага тэатра пад слоганам «Абуджэнне розуму». У гэты дзень са славутай сцэны гучалі тры мовы: беларуская, англійская і руская. А ў фірмовае чырвонае кола TED выходзілі па чарзе псіхолаг, эколаг, музыкант, неўролаг, крэатыўны дырэктар, тэарэтык моды, рэжысёр, аматар бегу, эксперт у галіне тэлекамунікацый і кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў нашай краіне... Канферэнцыя TEDxMinsk 2019, генеральным партнёрам якой выступіла кампанія velcom, стала па-сапраўднаму мультытэматычнай і мультымоўнай.

Фота Яўгена НАЛЕЦКАЙ.

Анастасія ЛІПНЕВІЧ: «Нават у такім структураваным прадмеце, як матэматыка, станоўчыя эмоцыі стымулююць творчасць!»

Але чаму быў абраны менавіта гэты слоган — «Абуджэнне розуму»? Місія TED-руху ва ўсім свеце — знаходзіць, збіраць і прасоўваць рашэнні і ідэі, здольныя даць людзям і грамадству імпульс да развіцця і пазітыўных перамен на самых розных узроўнях, — ад лакальнага да глабальнага. Чалавечы розум — найбольш магутнейшы інструмент, здольны ў літаральным сэнсе змяняць існуючую рэальнасць. Часам дастаткова аднаго штуршка, каб накіраваць схаваныя ў ім рэсурсы ў творчае, стваральнае рэчышча.

Выступленні на TEDx-канферэнцыях маюць асаблівы фармат: гэта 18-хвілінная творчая прэзентацыя ідэі адным аўтарам, мэта якой — стварыць яркае інтэлектуальнае шоу, здольнае натхніць аўдыторыю.

Глабальныя і лакальныя канферэнцыі TEDx збіраюць вялікую колькасць гледачоў па ўсім свеце і яшчэ больш анлайн-праглядаў. Відэазапісы ўсіх падзей TED-канферэнцый перакладаюцца на некалькі моў і размяшчаюцца ў адкрытым доступе на афіцыйным канале TED.com.

Хваліць правільна!

Пагутарыць пра пахвалу і кампліменты прапанавала ўдзельнікам TEDxMinsk **прафесар псіхалогіі City University of New York Анастасія ЛІПНЕВІЧ,** найлепшы малады навуковец па прызнанні Амерыканскай псіхалагічнай асацыяцыі.

— Абсалютная большасць людзей любяць, калі пра іх кажуць што-небудзь прыемнае, — сцвярджае Анастасія. — Нам падабаецца, калі калегі годна ацанілі нашу ідэю або дзяўчына, якая стаіць за намі ў чарзе ў касу ў супермаркеце, адобрыла нашу пакупку. Здавалася б, чаму для ўсіх нас такое важнае значэнне мае адабрэнне з боку іншых людзей? І што думае пра гэта навука? Пытаннямі шчасця, поспеху, псіхалагічнага камфорту займаецца пазітыўная псіхалогія. Даказана, што станоўчыя эмоцыі пашыраюць наша мысленне, людзі адыходзяць ад руцінных рэакцый і аўтаматычна павялічваецца магчымасць творчага рашэння задач. Напрыклад, мы ўстанавілі, што студэнты, у якіх пераважаў станоўчы эмацыянальны фон, значна часцей прапаноўвалі творчыя рашэнні задач па геаметрыі. Нават у такім структураваным прадмеце, як матэматыка, станоўчыя эмоцыі стымулююць творчасць!

Але абавязкова трэба звяртаць увагу на тое, як вы кантактуеце з людзьмі, якія вас акружаюць, папярэджвае Анастасія, якую зваротную сувязь вы ім забяспечваеце. Таму што ўсе мы маем схільнасць заўважаць і агучваць тое, што нам не падабаецца, значна часцей, чым хваліць адно аднаго. Але **навык казаць штосьці прыемнае можна натрэніраваць! Гэта як навучыцца ездзіць на веласіпедзе...**

Аднак не ўсё так проста, таму што вынік пахвалы вельмі залежыць ад кантэксту, у якім яна прагучала. Гэта пацвярджае наступнае даследаванне. У лабараторыю запрасілі дзве групы людзей. Задача была на ўвагу: ад іх патрабавалася націскаць на экране камп'ютара кропкі, якія там з'яўляліся. Першую групу адразу адвялі да камп'ютараў, а членаў другой — пры сустрэчы пахвалілі за нейкі прадмет гардэробу, накшталт: «Ну як жа мне спадабалася ваша кашуля!» І раптам высветлілася, што другая група спраўлялася з адносна простым заданнем больш марудна, дапускала шмат памылак.

Канферэнцыі TEDx (лакальныя мерапрыемствы, арганізаваныя па стандартах і ліцэнзіі глабальнага TED) праводзяцца па ўсім свеце з 2009 года. Першапачаткова тэмы выступленняў на канферэнцыях у фармаце TED абмяжоўваліся трыма кірункамі: тэхналогіі, забавы і дызайн (Technology, Entertainment, Design). Але з цягам часу тэматыка канферэнцый пашыралася, і сёння яны знаёмяць людзей з усяго свету з перадавымі ідэямі ў самых розных галінах навукі, культуры, бізнесу і іншых напрамкаў дзейнасці чалавека.

— У членаў групы, якіх перад пачаткам эксперымента пахвалілі, адабралі частку кагнітыўных рэсурсаў, — тлумачыць Анастасія. — І напэўна, яны нейкі час думалі пра тое, як здорава, што я апрануў менавіта гэту кашулю, а таму не маглі цалкам прысвяціць сваю ўвагу пастаўленай задачы. Рабочая памяць чалавека можа адначасова апрацоўваць толькі ад пяці да дзевяці адзінак інфармацыі, гэта значыць, што нашы кагнітыўныя рэсурсы вельмі абмежаваныя (а ў панядзелак раніцай мы можам апрацоўваць яшчэ менш — прыкладна дзве адзінкі інфармацыі). Таму, калі вы праходзіце міма дзіцяці, якое іграе на музычным інструменце, і вас цягне яго пахваліць, лепш не рабіце гэтага, а пачакайце завяршэння працэсу або нейкай лагічнай паўзы, таму што дзіцяці патрабуюцца ўсе кагнітыўныя рэсурсы, якія ў яго ёсць. Мы ведаем, што пахвала дабаўляе ўпэўненасці ў сабе, а таксама ўзмацняе станоўчы эмацыянальны фон, таму хваліце дзяцей абавязкова, але рабіце гэта правільна і своечасова.

А як пахвала ўплывае на паспяховасць навучэнцаў? Падчас аднаго з эксперыментаў студэнтам прапанавалі напісаць эсэ. Некаторыя з іх атрымлівалі за сваю работу адзнакі, другія — пахвалу, а хтосьці — дэталёвы аналіз з рэкамендацыямі, як і што можна палепшыць. І што заўважылі? На працягу апошніх дзесяці гадоў правядзення эксперымента студэнты ў групе, якую хваляць, не паляпшаюць сваё эсэ гэтак жа эфектыўна, як у групе, дзе нікога не хвалілі. Высветлілася, што студэнты інтэрпрэтуюць пахвалу педагога як сігнал — старацца больш не трэба, усё ў парадку. Таму, калі ў вас ёсць праект, які трэба палепшыць, старайцеся не проста хваліць, а давайце нейкія канструктыўныя парады, як гэта можна зрабіць. І толькі калі вы ўжо падышлі да фіналу і нічога палепшыць больш немагчыма, то хваліце. Але хваліце канструктыўна. Фразы накшталт «Ты маладзец!» ці «Ты самы лепшы» не з'яўляюцца канструктыўнай пахвалой.

Укладаць душу і сэрца

— А ці задумваліся вы, чаму тыя ці іншыя краіны становяцца паспяховымі? — пацікавіўся у гасцей TED **кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Рэспубліцы Беларусь Алекс КРЭМЕР.** — І ад чаго залежыць прадукцыйнасць нашай працы? Вядома, што прыкладна 55 працэнтаў поспеху прыпадае на нашы здольнасці, але гэта доля скарачаецца, затое ўклад матывацыі расце, і сёння ад яе залежыць ужо трэцяя частка выніку.

Калі паглядзець на даныя, сабраныя па ўсім свеце, то можна ўбачыць, наколькі па-рознаму адчуваюць сябе людзі на сваіх рабочых месцах. «Ці лічаць яны сваю працу ідэальнай?» — пацікавіліся ў іх. Сярод задаволеных аказаліся жыхары паўднёваазіяцкіх краін і Паўночнай Амерыкі. А вось у краінах былога сацыялістычнага блока, асабліва СССР, большасць людзей сваёй працай не задаволены. Яны дэматываваныя, паколькі адчуваюць сябе беднымі. Нягледзячы на тое што гэтыя краіны намнога багацейшыя, чым, напрыклад, многія краіны Паўднёва-Усходняй Азіі ці Афрыкі, іх грамадзяне адчуваюць сябе бяднейшымі, чым ёсць на самай справе. Калі вы запытаецеся ў беларусаў, расіян, украінцаў, ці дастаткова ў іх грошай, то з вялікай доляй імавернасці атрымаеце адмоўны адказ. Для іх праца — гэта вынік абмену намаганняў на грошы, па вялікім рахунку задавальненне сваіх базавых патрэб.

Алекс Крэмер расказаў, што апошняе даследаванне, якое было праведзена ў Беларусі, паказала, што прыкладна дзве трэці апытаных галоўнай матывацыяй для працы назвалі высокі заробак, але пры гэтым працаваць ім хацелася б менш.

— І тут аўтаматычна ўзнікае шмат пытанняў. Значыць, у іх няма адчування, што яны робяць штосьці насамрэч важнае, куды трэба ўкладваць сваю душу і сэрца? — разважае Алекс Крэмер. — Яны ўпэўнены, што ўсё, што ад іх патрабуецца, — гэта стараннасць і працалюбства, і ніхто не зацікаўлены ў творчасці і крэатыўным падыходзе, бо яны не ацэньваюцца работадаўцам. Між іншым, спіс краін, дзе ў дзецях вельмі высока цэняць стараннасць, узначальваюць краіны былога сацыялістычнага блока. Аднак там зусім на заахвочваецца і не ўзнагароджваецца фантазія дзяцей. А, напрыклад, у такіх эканамічна паспяховых краінах, як Нідэрланды, Японія, Германія, лічаць, што крэатыўнасць і фантазія — галоўныя якасці, за якія іх трэба ўзнагароджваць дзяцей.

Алекс Крэмер падкрэслівае: «Нам, эканамістам, трэба вывучаць матывацыю ў розных сектарах глабальнай супольнасці. **Матывацыя — гэта адна трэць поспеху, і мы не павінны яе ігнараваць!** Гэта не проста пытанне псіхалогіі, а стратэгічнае пытанне для народаў! Неабходна ўсвядоміць, што паспяховымі і заможнымі будуць тыя з іх, якія ўкладваюць у сваю працу душу і намаганні. Будучыня кожнай краіны залежыць ад фантазіі яе дзяцей у такой жа ступені, як будучыня ўсяго свету залежыць ад фантазіі народаў».

Працаваць з талентамі

— 14 гадоў я кірую людзьмі, якія прыдумваюць крэатыўныя ідэі ў рэкламных агенцтвах. І хачу заўважыць, што градус незвычайнасці і патрабаванняў да гэтай незвычайнасці ў рабоце сур'ёзна павысіўся, — сцвярджае **крэатыўны дырэктар агенцтва Getbob Ілья КУХАРАЎ.** — Сёння ніхто не хоча адчуваць сябе наёмным персаналам. Нашмат больш натхняльным мне бачыцца кіраванне талентамі, і тут пытанне не толькі ў іншай фармулёўцы, а ў іншай філасофіі. Ці варта наймальнікам падстройвацца пад кожнага? Той, хто лічыць, што гэта раскоша, памыляецца. Даказана, што чым больш аднародны склад вашай каманды, тым яна слабейшая, нават калі там сабраліся адны «зоркі». Таму для павышэння эфектыўнасці трэба ствараць каманду з разнапланавых людзей, працаваць з асобамі. Службовыя інструкцыі ва ўсіх вельмі падобныя, але патрэбы ў людзей розныя, таму неабходна падумаць пра персанальны кар'ерны коўчынг.

Тэндэнцыя апошніх гадоў — усе маладыя супрацоўнікі патрабуюць амаль імгненнай зваротнай сувязі, ацэнкі зробленага імі праекта, падрыхтаванай прэзентацыі і г. д. Так, гэта накладае на іх кіраўнікоў дадатковую нагрузку, але калі табе забяспечваюць зваротную сувязь, ты хутчэй вучышся, расцеш і, самае важнае, бачыш сэнс у сваёй працы. **Зваротная сувязь стала больш каштоўнай, чым любыя прэміі за перапрацоўкі.** Галоўнае — нават у руцінных штодзённых задачах бачыць сэнс і карысць як для сябе, так і для кампаніі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выступленні ўсіх спікераў канферэнцыі можна паглядзець на YouTube TEDxMinsk2019.

Сугучча

Сіла ў каранях

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» прадставіла ў Мінску працяг кніжнай серыі «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Зборнік «Карэнні сілу берагуць», дзе пад адной вокладкай сабраныя вершы 17 сучасных паэтаў з Башкірыі, Дагестана, Кабардзіна-Балкарыі, Марый-Эл, Татарстана, Чачэнскай Рэспублікі і Чувашыі, убачыць свет да канца вясны.

Першая кніга ў гэтай серыі — зборнік вершаў «Ранішні вецер у акне» народнага паэта Удмурціі Вячаслава Ар-Сяргі, перакладзены на беларускую мову Віктарам Гардзеем, — выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда» яшчэ ў 2016 годзе. Далей працягнула наводзіць масты літаратурнай дружбы выдавецтва «Мастацкая літаратура», і другім выданнем серыі стала кніга вершаў народнага паэта Татарстана Роберта Мінуліна «Начная птушка» — яе пераклаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Мікола Мятліцкі, а чытачы змаглі дакрануцца да татарскай літаратуры вясной 2018-га. Сёлета «Сябрына» атрымала працяг — трэцяя кніга ўжо змакетаваная, і, безумоўна, работа над перакладамі расійскіх аўтараў прадоўжыцца. Акрамя таго, усе тры кнігі серыі будуць прадстаўленыя сёлета ў Маскве на вялікім кніжным фестывалі на Краснай плошчы.

«Новы зборнік, на мой погляд, атрымаўся цікавым, бо знаёміць не толькі з паэтамі з розных рэгіёнаў Расіі, але і дае паэтычныя апісанні рэчаў, якіх у нас у Беларусі наўпрост няма: праз вершы можна перанесціся ў горы, у стэп, адчуць подых сухога і гарачага ветру, — разважае **галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП,** які выступіў перакладчыкам паэтычнага зборніка «Карэнні сілу берагуць». — Канешне, ёсць пэўныя складанасці: не ведаючы мовы арыгінала, часта перакладаць даводзіцца з падрадкоўніка, падбіраючы максімальна дакладныя вобразы і рыфмы, і далёка не кожны паэт, перакладчык за гэту справу возьмецца. Але мэта таго вартая, бо не ведаючы, што пішуць нашы пабрацімы, мы не можам у поўнай меры развіваць і беларускую літаратуру, паказваць у свеце, чым мы самі адметныя».

Галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей ЧАРОТА дадае: «Хоць цяперашні беларуска-расійскі праект як брэнд намінальна распачаўся ў 2016 годзе, насамрэч яму папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Так, Выдавецкі дом «Звязда» ініцыяваў маштабны творчы праект — серыю з 11 кніг «Сугучча сэрцаў», што прадставілі сучасную літаратуру народаў СНД. А ўласна рубрыка «Сяброна», якая знаёміць чытачоў менавіта з творчасцю расійскіх аўтараў, нарадзілася яшчэ 10 гадоў таму, у 2009-м».

«Выдатна, што аднаўляюцца творчыя сувязі паміж літаратарамі нашых краін, — заўважае паэт, празаік, перакладчык, **кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і старшыня таварыства дружбы «Беларусь—Расія» Міхась ПАЗНЯКОЎ.** — Сёння толькі ў нашага сталічнага аддзялення Саюза пісьменнікаў наладжана плённае і шчыльнае супрацоўніцтва з Маскоўскім, Санкт-Пецярбургскім, Калінінградскім, Цюменскім, Астраханскім аддзяленнямі Саюза пісьменнікаў Расіі, саюзамі літаратараў Калмыкіі, Дагестана, Чачэнскай Рэспублікі... І гэта не проста сяброўскі абмен дэлегацыямі — мы займаемся ўзаемаперакладамі, выдаём калектыўныя зборнікі вершаў і малой прозы». Напрыклад, у абедзвюх нашых краінах да 70-годдзя Перамогі выйшаў зборнік «Пераможцы», падрыхтаваны больш як 50 пісьменнікамі і паэтамі з Мінска і Цюмені, кнігі многіх беларускіх паэтаў перакладзены на мовы народаў Расіі — у Дагестане (а ў гэтай рэспубліцы толькі дзяржаўных моў — 7!), Чачні, Удмурціі і г. д.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», г. Молодечно, ул. Замковая, 19

Предмет аукциона

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер	Адрес
Здание блока вспомогательных цехов (здание специализир. для металлургич. производства и металлообработки)	2676,8 кв. м	630/С-79012	Минская обл., Молодечненский р-н, **г. Молодечно**, ул. Замковая, 19/1

Составные части и принадлежности: навес на металлических столбах

Начальная цена с НДС 20 % – 345 087,61 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Дата и время проведения аукциона	**10.05.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**04.05.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2018 года

Организация	Открытое акционерное общество «Стройтрест № 7» (консолид.)
Учетный номер плательщика	100512859
Вид экономической деятельности	Строительство
Организационно-правовая форма	Частная собственность
Орган управления	Концерн «Минскстрой»
Единица измерения	Тыс. руб.
Адрес	г. Минск, пр-т Машерова,16

Активы	Код строки	На 31 декабря 2018 года	На 31 декабря 2017 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	10 318	9 489
Нематериальные активы	120	1	1
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	24	45
Долгосрочные финансовые вложения	150	57	57
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	375	1 510
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**10 775**	**11 102**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	12 499	14 138
в том числе:			
материалы	211	9 712	10 760
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	2 567	3 113
готовая продукция и товары	214	220	265
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	81	125
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	523	239
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	56 329	39 808
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	1 986	3 972
Прочие краткосрочные активы	280	10 458	7 974
ИТОГО по разделу II	**290**	**81 876**	**66 256**
БАЛАНС	**300**	**92 651**	**77 358**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2018 года	На 31 декабря 2017 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	13	13
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440		
Добавочный капитал	450	8 609	6 881
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	6 221	8 012
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480	1	1
ИТОГО по разделу III	**490**	**14 844**	**14 907**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	156	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**156**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	5 108	5 293
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	62 083	49 182
в том числе			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	43 029	40 352
по авансам полученным	632	5 810	3 228
по налогам и сборам	633	1 501	1 126
по социальному страхованию и обеспечению	634	598	598
по оплате труда	635	1 835	1 650
по лизинговым платежам	636	20	
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	9 290	2 228
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	2	2
Резервы предстоящих платежей	660		-
Прочие краткосрочные обязательства	670	10 458	7 974
ИТОГО по разделу V	**690**	**77 651**	**62 451**
БАЛАНС	**700**	**92 651**	**77 358**

Отчет о прибылях и убытках
за январь – декабрь 2018 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2018 года	За январь – декабрь 2017 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	98 938	94 849
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(83 595)	(80 825)
Валовая прибыль	030	15 343	14 024
Управленческие расходы	040	(10 299)	(9 529)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	5 044	4 495
Прочие доходы по текущей деятельности	070	8 584	5 216
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(11 130)	(7 469)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	2 498	2 242
Доходы по инвестиционной деятельности	100	220	51
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	117	23
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102		-
проценты к получению	103	22	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	81	28
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(153)	(74)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(127)	(42)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(26)	(32)
Доходы по финансовой деятельности	120	5	5
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	5	5
прочие доходы по финансовой деятельности	122		-
Расходы по финансовой деятельности	130	(45)	(38)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(37)	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(7)	(4)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(1)	(34)

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2018 года	За январь – декабрь 2017 года
1	2	3	4
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	27	(56)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	2 525	2 186
Налог на прибыль	160	(1 361)	(1 392)
Изменение отложенных налоговых активов	170		
Изменение отложенных налоговых обязательств	180		
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	
Чистая прибыль (убыток)	210	1 164	794
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1 976	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	3 140	794
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель Б.М. Шерман

Главный бухгалтер С.В. Рапинчук

22 марта 2019 г.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

Бухгалтерский баланс
на 1 января 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		11 213	10 921
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	5	46 357	38 194
5	Средства в банках	1104	6	47 980	38 570
6	Ценные бумаги	1105	7	55 086	56 738
7	Кредиты клиентам	1106	8	344 904	300 795
8	Производные финансовые активы	1107	9	4 538	204
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	10	137	80
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	11	18 289	25 166
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	12	7 026	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	13	8 691	3 349
13	Отложенные налоговые активы	1112	32	288	-
14	Прочие активы	1113	14	4 907	7 067
15	ИТОГО активы	11		549 416	481 084
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
17	Средства Национального банка	1201		-	-
18	Средства банков	1202	15	65 485	67 964
19	Средства клиентов	1203	16	378 820	325 631
20	Ценные бумаги банка	1204	17	30 732	21 793
21	Производные финансовые обязательства	1205	9	-	83
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207	18	2 543	2 137
24	ВСЕГО обязательства	120		477 580	417 608
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
26	Уставный фонд	1211	19	27 688	11 075
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213	20	6 400	6 400
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	21	12 392	11 243
30	Накопленная прибыль	1215	22	25 356	34 758
31	ВСЕГО собственный капитал	121		71 836	63 476
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		549 416	481 084

Отчет о прибылях и убытках
за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		34 607	38 658
2	Процентные расходы	2012		15 091	19 406
3	Чистые процентные доходы	201	23	19 516	19 252
4	Комиссионные доходы	2021		11 668	10 213
5	Комиссионные расходы	2022		3 900	3 754
6	Чистые комиссионные доходы	202	24	7 768	6 459
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	25	(216)	(48)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	26	7 541	9 626
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	27	5 182	(517)
11	Чистые отчисления в резервы	207	28	4 146	2 536
12	Прочие доходы	208	29	4 767	2 340
13	Операционные расходы	209	30	28 220	21 508
14	Прочие расходы	210	31	1 784	1 455
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		10 408	11 613
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	32	2 476	1 574
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		7 932	10 039
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		0,0029	0,0036
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

ОТЧЕТ об изменении собственного капитала
за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Симв-ол	Наименование статей собственного капитала					
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего собственный капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
	Раздел I. За год, предшествующий отчетному							
1	Остаток на 1 января 2017 г.	3011	11 075	-	6 400	25 658	9 835	52 968
1.1	В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок	30111	-	-	-	-	-	-
2	Изменения статей собственного капитала	3012	-	-	-	9 100	1 408	10 508
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	10 039	1 537	11 576
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	-	-	x	-
2.3	операции с учредителями (участниками):	30123	-	-	-	(997)	x	(997)
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	x	x	x	-
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(997)	x	(997)
2.6	операции с выкупленными акциями собственной эмиссии	301233	-	x	x	x	x	-
2.7	внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	x	x	-	-	x	-
2.8	перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	-	58	(58)	-
2.9	прочие изменения	30126	-	-	-	-	(71)	(71)
3	Остаток на 1 января 2018 г.	3013	11 075	-	6 400	34 758	11 243	63 476
	Раздел II. За отчетный год							
4	Остаток на 1 января 2018 г.	3011	11 075	-	6 400	34 758	11 243	63 476
5	Изменения статей собственного капитала	3012	16 613	-	-	(9 402)	1 149	8 360
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	7 932	1 435	9 367
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	-	-	x	-
5.3	операции с учредителями (участниками):	30123	-	-	-	(996)	x	(996)
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	x	x	x	-
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(996)	x	(996)
5.6	операции с выкупленными акциями собственной эмиссии	301233	-	x	x	x	x	-
5.7	внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	x	x	-	-	x	-
5.8	перераспределение между статьями собственного капитала	30125	16 613	-	-	(16 338)	(275)	-
5.9	прочие изменения	30126	-	-	-	-	(11)	(11)
6	Остаток на 1 января 2019 г.	3013	27 688	-	6 400	25 356	12 392	71 836

СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе
за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль (убыток)	301211	22	7 932	10 039
2	Прочие компоненты совокупного дохода	301212	21	1 435	1 537
	В том числе:				
2.1	переоценка основных средств и прочего имущества	3012121		1 435	1 526
2.2	переоценка нематериальных активов	3012122		-	-
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123		-	11
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124		-	-
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125		-	-
3	ИТОГО совокупный доход	30121		9 367	11 576

Отчет о движении денежных средств
за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Симв-ол	Пункт примечаний	2018 г.	2017 г.
1	2	3	4	5	6
1	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
2	Полученные процентные доходы	70100		35 104	37 445
3	Уплаченные процентные расходы	70101		(16 081)	(19 586)
4	Полученные комиссионные доходы	70102		11 658	10 197
5	Уплаченные комиссионные расходы	70103		(3 773)	(3 724)
6	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	70104		-	-
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	70105		(226)	(19)
8	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	70106		7 624	9 709
9	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	70107		-	-
10	Прочие полученные доходы	70108		5 864	4 063
11	Прочие уплаченные расходы	70109		(25 340)	(21 194)
12	Уплаченный налог на прибыль	70110		(2 418)	(679)
13	Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого	701		12 412	16 212
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	70200		(1 038)	(1 986)
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках	70201		(5 074)	(3 674)
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	70202		4 905	(13 421)
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	70203		(28 927)	(3 298)
18	Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов	70204		1 109	41
19	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	70205		(6 618)	(8 425)
20	Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого	702		(35 643)	(30 763)
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	70300		-	-
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств банков	70301		(4 899)	(23 491)
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	70302		37 374	50 756
24	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка	70303		8 066	456
25	Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств	70304		(218)	(463)
26	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	70305		414	(16 204)
27	Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого	703		40 737	11 054
28	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		17 506	(3 497)
29	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
30	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71100		(3 091)	(11 382)
31	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71101		2 939	154
32	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71102		(57)	-
33	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71103		-	-
34	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71104		(386 948)	(576 672)
35	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71105		386 948	601 442
36	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		(209)	13 542
37	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
38	Эмиссия акций	72100		-	-
39	Выкуп акций собственной эмиссии	72101		-	-
40	Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии	72102		-	-
41	Выплата дивидендов	72103		(997)	(997)
42	Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	72104		-	-
43	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		(997)	(997)
44	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		249	2 135
45	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		16 549	11 183
46	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740		x	60 866
47	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		77 415	x

Генеральный директор К. Церетели

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания: 15 марта 2019 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
https://www.bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/

Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 7 июня 2013 г. УНП 100513485.

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

Господину Церетели Константину
Генеральному директору ОАО «БНБ-Банк»

Акционерам, Совету директоров и Правлению
ОАО «БНБ-Банк»

ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

Аудиторское мнение

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее — годовая финансовая отчетность) открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» (далее — ОАО «БНБ-Банк», Банк) (Республика Беларусь, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, д. 87а; зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100513485) состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2019 года, отчета о прибылях и убытках; отчета об изменении собственного капитала; отчета о движении денежных средств за 2018 год, примечаний к годовой финансовой отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая годовая финансовая отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «БНБ-Банк» по состоянию на 1 января 2019 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2018 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита — это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита годовой финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита годовой финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах.

Статья «Кредиты клиентам» бухгалтерского баланса

В связи со значимостью кредитов клиентам, а также в связи с присущей им неопределенностью их погашения, расчет резерва на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе, считается одним из ключевых вопросов аудита.

Существенные суждения необходимы для классификации активов, подверженных кредитному риску и оценки способности кредитополучателя исполнить свои обязательства перед Банком, включая оценку качества и достаточности обеспечения.

В основу классификации кредитной задолженности по группам риска положены требования Инструкции о порядке формирования и использования банками, открытым акционерным обществом «Банк развития» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе от 28.09.2006 № 138.

Примечание 8 «Кредиты клиентам», включенное в годовую финансовую отчетность, содержит информацию о сформированных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам. Примечание 38 «Раскрытие информации о рисках, возникающих по финансовым инструментам», включенное в годовую финансовую отчетность, содержит информацию о предоставленном кредитополучателями обеспечении, снижающем уровень кредитного риска.

В ходе наших аудиторских процедур мы рассмотрели и оценили методологию Банка, используемую при классификации кредитной задолженности по группам риска.

Выполненные нами аудиторские процедуры также включали проверку на выборочной основе своевременности выявления признаков негативной информации и финансовой неустойчивости кредитополучателей.

Мы протестировали (на выборочной основе) оценку способности кредитополучателей исполнить свои обязательства перед Банком, а также оценку качества и достаточности обеспечения.

Мы протестировали (на выборочной основе) достоверность проведенной Банком классификации кредитной задолженности по группам риска, полноту и своевременность формирования резервов на покрытие возможных убытков по кредитам и сформировали свое собственное суждение в отношении того, является ли такая классификация надлежащей.

Мы также проанализировали соответствие информации в отношении резерва на покрытие возможных убытков по активам, раскрываемой в годовой финансовой отчетности, применимым требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности.

Прочие вопросы

— Сам факт паўстанняў сведчыў пра тое, што грамадства Беларусі, пры тым у некалькіх пакаленнях, было катэгарычна нязгодна з тым станам рэчаў, які склаўся тады на нашых землях. Вялікая колькасць людзей не проста не згаджалася — яны стаялі са зброяй у руках, і гатовыя былі ахвяраваць жыццём за свае ідэалы. Паўстанні ж не ўзнікалі на роўным месцы, гэта крайняя форма барацьбы. На старонках кнігі паказваецца, колькі існавала праектаў мірнага вырашэння пытання аўтаноміі зямель былога ВКЛ у складзе Расійскай імперыі, але ўлады, на жаль, ніяк на гэта не рэагавалі, заяўляючы, што беларусам быццам бы нічога не патрэбна, а ўсе патрабаванні — «польская інтрыга». Справа ў тым, што беларусамі ўрад лічыў пераважным чынам праваслаўнае сялянства, а шляхту і ў прынцыпе ўсіх каталікоў — «палякамі». У гістарычнай перспектыве такі падыход значна аслабіў сувязь цэнтра з «заходнімі ўскраінамі». Вельмі цікавай з'яўляецца эвалюцыя мэт, што ставілі перад сабой розныя пакаленні мясцовай эліты. Калі ў першай палове XIX стагоддзя альфай і амегай было дасягненне палітычнай незалежнасці ад Расіі зямель былой Рэчы Паспалітай у межах да 1772 года, то ў другой палове XIX стагоддзя, і асабліва на пачатку XX стагоддзя, палітычнае адасабленне ад Расійскай імперыі ўжо разглядалася як сродак, пры дапамозе якога павінна адбыцца нацыянальна-культурнае адраджэнне беларускага народа. Яшчэ адзін з ключавых момантаў — гэта тое, што ў паўстанні 1863—1864 гадоў ужо гучала беларуская мова, прамаўляўся паўстанцкі пароль (і ён змешчаны ў кнізе): «Каго любіш? Люблю Беларусь. То ўзаемна!» Менавіта тады быў фактычна сфармуляваны найважнейшы прынцып беларускага патрыятызму — «Любіць Беларусь». Пазней і гоманаўцы, і нашаніўцы сталі гаварыць ужо пра беларускую нацыянальную дзяржаўнасць. І ўжо ў 1917 годзе Беларускі нацыянальны камітэт паставіў сабе за мэту юрыдычнае афармленне беларускай дзяржаўнасці, адбыўся Першы Усебеларускі з'езд, аформіліся БНР і БССР.

— Распавядзіце падрабязней пра спосабы ўніфікацыі беларускіх зямель з расійскімі, апісаныя ў выданні.

— Уводзіўся расійскі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на губерні, паветы, воласці. Адбывалася ўкараненне расійскага заканадаўства і рускай мовы. Былі ўведзены расійскія грошы. Пасля паўстання 1830—1831 гадоў пачала ўводзіцца расійская сістэма адукацыі. Пасля паўстання 1863—1864 гадоў праводзілася палітыка пашырэння расійскага землеўладання і замены чыноўнікаў выхадцамі з расійскіх губерняў. Быў забаронены друк на беларускай мове лацінкай. Было ліквідавана мясцовае самакіраванне. З самага пачатку знаходжання Беларусі ў складзе імперыі ажыццяўляўся разбор шляхты, была ўведзена рэкруцкая павіннасць і многае іншае.

— Ці можна акрэсліць вынікі знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі?

— Вынікі былі розныя. У Беларусі, напрыклад, была ліквідавана вышэйшая адукацыя. З іншага боку, у перыяд Расійскай імперыі назва «Беларусь» распаўсюдзілася на ўсе беларускія землі, пачала фарміравацца сучасная беларуская нацыя. У 1897 годзе каля 5,5 мільёна беларусаў назвалі беларускую мову роднай. Дзякуючы паўстанням беларускія сяляне, пасля скасавання прыгону, жылі ў лепшых умовах, чым расійскія. Важна і тое, што ўдалося захаваць поліканфесійны характар беларускага грамадства. Нягледзячы ні на што нарадзілася беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. Яна сфармулявала асноўныя пастулаты беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі і рэалізавала іх пасля распаду імперыі.

— Ці своечасова «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'явілася ў нашым грамадстве?

— Хачу адзначыць, што гэта прынцыпова новае выданне. Такой кнігі няма ні ў адной краіне свету, — адказвае **загадчык цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Мікалай СМЯХОВІЧ.** — Ёсць «Гісторыя расійскай дзяржавы», «Гісторыя Францыі», «Гісторыя Англіі» і іншыя. А вось кніг па гісторыі дзяржаўнасці няма нідзе. Упершыню ў сусветнай гістарыяграфіі адбыўся прарыў у адносінах да падрыхтоўкі і выдання новага пакалення навуковай літаратуры пад назвай «Гісторыя дзяржаўнасці». Важна памятаць, што рэалізацыя нацыянальнага права на дзяржаўнасць залежыць ад эліты, ад яе здольнасці рэалізаваць гэта права — стварыць уласную дзяржаву. Калі эліта аказваецца няздатнай ажыццявіць яе далейшае развіццё, то яно, вядома ж, можа спыніцца.

— Можна меркаваць, што ў краіне наспела патрэба выхаду такой кнігі, цэлага пяцітомніка, прысвечанага гісторыі беларускай дзяржаўнасці? Значыць, сёння мы хочам больш ведаць пра сваю дзяржаўнасць.

— Сапраўды, грамадству важна, каб навукоўцы рыхтавалі і выдавалі кнігі такога зместу як «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Чаму наспела такая неабходнасць? З аднаго боку, наша дзяржаўнасць мае тысячагадовую гісторыю. Проста трэба гэта канкрэтызаваць і данесці да кожнага грамадзяніна. З іншага боку, не ўсе нашы суседзі і краіны, якія стасуюцца з намі, маюць усведамленне, што наша самастойнасць мае такія даўнія карані. Гэтыя краіны, не маючы такога ўсведамлення, увесь час прапагандуюць і выношваюць ідэі, якія ідуць насуперак інтарэсам беларускага народа, у тым ліку пабудовы нашай сучаснай дзяржавы: яны падвяргаюць сумневу гісторыю нашага суверэнітэту. Таму такія выданні — падмурак і аснова ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Ідэалогія ж самой дзяржавы — гэта Канстытуцыя.

— Вы кажаце, што не ўсе нашы суседзі ўсведамляюць тысячагадовую гісторыю беларускай дзяржаўнасці. Аднак ці ўсведамляем яе мы самі?

— Для таго каб у грамадстве было такое ўсведамленне, патрэбна, каб яно базіравалася на пэўных ідэях і ведах. Калі гэтай базы няма, то фарміраванне правільнага разумення сустракае вялікія цяжкасці — нават на ўзроўні школы, універсітэта. А калі людзі не атрымалі сістэматычнай інфармацыі, то сёння інтэрнэт можа даць ім зусім іншую інтэрпрэтацыю і асвятленне падзей. Таму для некаторых асоб пытанне «хто мы?», «беларусы?» — дагэтуль застаецца нявырашаным. Але дзякуючы таму, што падрыхтавана і выходзіць новая генерацыя літаратуры, многія складаныя моманты выразна акрэсляцца. І такое пытанне ў прынцыпе будзе немагчымым.

— У найбліжэйшы час плануецца ўвесці новы навучальны курс — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Для яго рыхтуецца спецыяльны падручнік. Аднак ці будуць выкарыстоўвацца на ім выданні, пра якія мы вядзём размову?

— Пытанне пастаўлена правільна. Перад тым, як уводзіць пэўныя курсы ў вышэйшай навучальнай установе і перад тым, як складаць некаторыя праграмы вучэбна-выхаваўчага працэсу, трэба мець базу, прычым акадэмічную. А не тую базу, што падрыхтавалі адзін-два аўтары, і якія свае вучэбныя дапаможнікі будуць выдаваць за навуковую ісціну. Гэта прымітыўны падыход, які не вытрымлівае апрабацыі жыццёвай рэчаіснасцю. Бо адна справа, калі адзін-два аўтары рыхтуюць падручнік, у якім выказваюць сваю асабістую думку, але зусім іншая, калі рыхтуюцца фундаментальныя выданні, якія і становяцца падручнікамі.

— Калі плануецца выхад наступных тамоў «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці»?

— Мы мяркуем, што ён адбудзецца сёлета. Аднак магчыма, што для апошняга, пятага, паспеем толькі здаць рукапіс у выдавецтва. У кожным томе будуць падрыхтаваны прынцыпова новыя параграфы: «Станаўленне беларускай нацыі і нацыянальнай ідэі» ды іншае. Важна, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ў такім фармаце выходзіць гісторыя беларускага народа і нацыі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Дата

ДРУГІ КРОК ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ,

або З чаго пачыналася Радзіма

Коміксы, дзе галоўны герой — Зміцер Жылуновіч, анкета арыштаванага Вацлава Ластоўскага з архіваў КДБ і папяровае сэрца маладой дзяржавы. Чым яшчэ адметная выстаўка «1919: Беларуская рэспубліка» ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі, даведалася карэспандэнт «Звязды».

— Глядзі-глядзі, такім мог быць наш герб! — хлопец штурхае ў бок дзяўчыну і паказвае на эскіз у насычаных барвовых адценнях з мудрагелістым надпісам СССР і сякерай замест молата.

Сапраўды, побач з гербам аўтарства Валянціна Волкава, які стаў асновай для сучаснай дзяржаўнай сімволікі, красуюцца два малавядомыя варыянты графіка Генадзя Змудзінскага. У інтэрнэце такога не знойдзеш.

Выстаўка, арганізаваная да 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, — гэта працяг мінулагодняга праекта, прысвечанага стагоддзю БНР.

— У першую чаргу хацелася адлюстраваць фарміраванне нацыянальнай ідэі. Але гэта яшчэ і выстаўка пра людзей, у грудзях якіх білася беларускае сэрца, якія на сваіх плячах неслі гэтую ідэю і зрабілі яе рэальнасцю. Яны часам былі па розныя бакі барыкад, аднак усіх іх аб'ядноўвала любоў да Беларусі, — расказаў **куратар выстаўкі, навуковы супрацоўнік гістарычнага музея Аляксандр ЗІМНІЦКІ.**

Тое, што над выстаўкай працавала каманда з сямі маладых гісторыкаў і мастакоў, становіцца зразумела адразу: храналогію стварэння БССР вырашылі падаць праз коміксы. Памайстэрску адмаляваныя чорна-белыя сюжэты і добра прадуманыя дыялогі мала таго што прыцягваюць моладзь, дык яшчэ і прымушаюць старэйшае пакаленне па-новаму зірнуць на гісторыю. Аднак цэнтрам экспазіцыі сталі ўсё ж не малюнкі, а сімвалічнае вялізнае «сэрца беларускай дзяржаўнасці». Кроў да яго «паступае» ад розных палітычных і культурных падзей пачатку XX стагоддзя. А паколькі падчас выстаўкі не раз згадваліся «айцы-заснавальнікі» рэспублікі, якія знаходзіліся па розныя бакі барыкад, то і фота іх размясцілі на дзвюх асобных сценах, размешчаных з двух бакоў ад сэрца.

Прадумалі аўтары нават месцы для ўдалых сэлфі. Гэта дзве тэматычныя фотазоны — «І Усебеларускі з'езд» і «1920 год». Хочаш — пад «Маніхвэстам» падпішыся, а хочаш — заскоквай на воз і бяры ў рукі аўтэнтычную стрэльбу.

— Выстаўка прадстаўляе тонкую драматургію падзей 100-гадовай даўніны. Тут мы можам асэнсаваць ролю канкрэтных асоб, эпізодаў у гісторыі, дзякуючы якім з'явіліся асноўныя чыннікі беларускай культуры — мастацтва, мова і літаратура, адукацыя і навука. Без іх немагчыма ўявіць паўнавартасную незалежную рэспубліку, — зазначыў **дырэктар гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА.**

Малавядомы эскіз герба БССР Генадзя Змудзінскага, 1925 год.

Тым, хто шануе класічную падачу матэрыялу, таксама ёсць на што глянуць. Гістарычны музей у супрацоўніцтве з Нацархівам, Цэнтральным архівам КДБ, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва сабраў «эпоху зараджэння БССР» па драбніцах. Тут вам і ўнікальныя дакументы, сярод якіх — арыгіналы і факсіміле Канстытуцыі ССРБ і Маніфеста 1919 года, Канстытуцыі 1927 года; і рарытэты, якія належалі першым асобам дзяржавы: пішучая машынка і членскія білеты Усевалада Ігнатоўскага, гадзіннік Іосіфа Адамовіча і нават начная каршуля Змітра Жылуновіча!

— Пакручасты, трагічны, поўны ахвяр шлях беларускага народа да незалежнасці немагчыма ўявіць без суб'екта, які ўзнік на карце сто гадоў таму, — без БССР. У наш час існуюць розныя меркаванні наконт тых палітычных перамен. Але нельга забывацца пра тое, як іх успрымалі сучаснікі. Антон Луцкевіч, старшыня Рады міністраў БНР, калі даведаўся аб першым абвяшчэнні БССР, занатаваў у дзённіку запіс з прыкладна такім тэкстам: «У нас велізарная радасць. Жылуновіч абвясціў Беларускую рэспубліку. Нашы пакуюць валізы. Едзем яму дапамагаць». Вацлаў Ластоўскі, які быў прэм'ер-міністрам БНР і адкрыта асуджаў Рыжскі дагавор, аднак, казаў, што нават шэсць паветаў другі раз абвешчанай Беларусі — крок да поўнай беларускай незалежнасці. Гэтыя людзі адчувалі, што ёсць больш важныя фундаментальныя рэчы, чым уласныя амбіцыі. Трэба разумець, што тыя, хто спрабаваў стварыць дзяржаву і на савецкай, і на несавецкай аснове, мелі адзін выток — Першы Усебеларускі з'езд, — падзяліўся **доктар гістарычных навук, прафесар Ігар МАРЗАЛЮК.** — 1919 год — дата насамрэч неадназначная, якая, з аднаго боку, наблізіла беларусаў да незалежнасці, з іншага — распаласавала краіну і раздзяліла народ. Зараз даводзіцца чуць, як замест назвы Заходняя Беларусь некаторыя кажуць «так званая Заходняя Беларусь» ці нават «Усходняя Польшча». Для мяне, заходніка па бацьку, падобнае чуць абразліва. Гісторыя ў нас адна, таму ставіцца да яе трэба з павагай.

Выстаўка «1919: Беларуская рэспубліка» будзе працаваць у Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі да 12 мая.

Ганна КУРАК, фота аўтара.

Аўтар дыялогаў да коміксаў Канстанцін КАСЯК і вынік яго працы «ў дзеянні».

«ВЕРАБЕЙКІ» НА ПАРУ З «НАПАРАЧКАЙ»,

або Як аматар фальклору адраджае традыцыйныя беларускія танцы

Бадай, няма чалавека ў Любані, які б не ведаў Сяргея ВЫСКВАРКУ. Ён даволі вядомы і ў творчых колах Беларусі як аматар традыцыйных беларускіх танцаў, этнахарэограф, этнапедагог.
Сяргей Георгіевіч ужо дваццаць пяць гадоў кіруе ўзорным дзіцячым фальклорным ансамблем «Верабейкі». Сёння ў ім займаюцца пяцьдзясят выхаванцаў, якія дзеляцца на старшую і малодшую групы. Акрамя таго, ён узначальвае гурт народнага гумару «Смехаўё», дзе ўдзельнічаюць работнікі культуры, якія ствараюць на мясцовым матэрыяле гумарыстычныя праграмы, прадстаўляюць цікавыя гісторыі з жыцця і побыту землякоў. Кіруе фальклярыст і танцавальнай групай «Напарачка». Гэты калектыў ўзяў назву ад аднайменнага танца, які быў калісьці распаўсюджаны на Любаншчыне. «Я ведаю, як яго танцаваць, — кажа Сяргей Георгіевіч. — Але, на жаль, няма да яго музычнага матэрыялу. У фальклоры ўсё павінна быць правільна і праўдзіва. Мы не можам тут нічога выдумляць, праяўляць сваю творчасць, як, напрыклад, у сцэнічным мастацтве. У фальклорным гурце ідзе аднаўленне таго, што было раней. І вельмі хочацца, каб была праўда ў сцэнічнасці, строях, манеры выканання».

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Сяргей Георгіевіч, наколькі ведаю, танцы, якія выконваюць «Верабейкі», — гэта фальклорны матэрыял, здабыты падчас экспедыцый?

— Так, раней я шмат ездзіў па вёсках Любанскага раёна і па ўспамінах бабуль запісваў розныя танцы. Паколькі я не харэограф па спецыяльнасці, то запісваў іх, як разумеў. Цяпер стала прасцей: калі ўдаецца знайсці нешта новае, то здымаем на відэа і захоўваем у архіве, — кажа суразмоўнік.

Дарэчы, на Любаншчыне дзейнічаюць дваццаць фальклорных гуртоў, сем з іх — аўтэнтычныя. Гэта больш, чым ва ўсёй Мінскай вобласці. А адроджана больш за 105 танцаў, якія былі раней папулярныя ў рэгіёне. У прыватнасці, Сяргею Выскварку пашчасціла аднавіць рэдкі танец «Каваля». Даведаўся фальклярыст аб ім ад Аўдоцці Чэкан з вёскі Старыя Юрковічы. На той час жанчыне было 102 гады. Гэты танец ілюстрацыйны, удзельнікі аб'яўляюць фігуры, што майстраваў каваль, выбудоўваюць іх сваімі целамі і імітуюць працэс іх вырабу. Напрыклад, серп, лямеш, абруч, замок, ключ.

— Якія танцы для вас самыя яркія, любімыя?

— Калі запытаць у маці, якое дзіця ў яе самае любімае, то яна адкажа, што любіць усіх аднолькава. Так і для мяне яны ўсе любыя сэрцу. Для гледачоў фальклор нецікавы, таму што гэта мастацтва для ўдзелу. Калі ты танцуеш сам, то працэс зацягвае, захапляе. І тады табе няважна, ці складаныя там каленцы або больш-менш простыя. Гледачам цікава назіраць збоку за кадрыляй, бо тут вельмі шмат перастройванняў і людзям смешна, калі нехта заблытаецца і не туды пойдзе, — разважае спецыяліст. — А ёсць складаныя танцы, як «Субота», дзе даволі цяжкія рухі. Нашым сучаснікам многія матывы фальклору не зразумелыя: мы людзі іншага стагоддзя. Калі да мяне прыходзяць новыя ўдзельнікі, то я заўсёды ім кажу: забудзьце тое, што ведаеце з сучаснасці, і ўявіце сабе жыццё сваіх дзядоў і бабуль. Цяпер, напрыклад, не носяць доўгіх спадніц, у якіх можна заблытацца. А яшчэ пры гэтым раней жанчыны танцавалі, ды танцавалі так, каб не заварочвалася ліштва звонку, бо гэта лічылася непрыстойным. Неабходна было таксама ўмець стаяць у пары. З дарослымі артыстамі, вядома, лягчэй. А дзецям кожны раз трэба ўсё расказаць і паказаць. Хочацца, каб яны праз фальклор спасцігалі вопыт натуральнай гаспадаркі, якую вялі нашы продкі.

— А дзе шукаеце малых удзельнікаў гурта? Магчыма, бацькі прыводзяць за руку сваіх дзяцей?

— Усяк бывае. І за руку водзяць, але найчасцей іду сам у школу. Галоўнае правіла — не адбіраць толькі здольных хлопчыкаў і дзяўчатак. Фальклорным мастацтвам можа валодаць любы. Звычайна бяру цэлы клас. Рэпетыцыі ў нас ладзяцца два разы на тыдзень, — расказвае пра свае метады работы Сяргей Выскварка.

А ці лёгка навучыць дзяцей фальклорнаму мастацтву? Па словах майстра, напачатку яго выхаванцы цяжка спасцігаюць трайны рытм, тое, што ўласціва народным танцам: раз-два-тры, раз-два-тры. Сучасная музыка вельмі простая, заснаваная на двайным рытме: раз-два, раз-два. Бывае, дзеці не разумеюць з першага разу, куды яны прыйшлі. Але з цягам часу расцуць, развіваюцца. І да дзясятага класа становяцца такімі зухаватымі артыстамі, якія выступаюць на фестывалях. «Я не стаўлю перад сабой мэту, каб усе яны займаліся фальклорам. Напэўна, трэба, каб быў дзікі лес і прыбраны сад, — упэўнены Сяргей Георгіевіч. — Сцэнічная культура — гэта прыбраны сад, а дзікі лес — гэта якраз фальклор. І ён не для сцэны, а для жыцця. Я бачу, як мае дзеці на вяселлях, на любым вялікім свяце, дзе гучыць народная музыка, свабодна і звыкла танцуюць. Яны гэта робяць дзеля таго, каб працягнуць гэтае фальклорнае жыццё, а не для таго, каб паказаць сябе. Гледзячы на іх, многія людзі не саромеюцца стаць у круг».

З дня заснавання калектыў выступіў на шмат якіх фестывалях у Беларусі, за мяжой. Быў шмат перамог, безліч дыпломаў і прызоў. Традыцыйнымі сталі і майстар-класы, якія ладзяць удзельнікі гурта ў розных гарадах краіны. «Мая вучаніца Насця Кухарэнка прыдумала новы праект «Пятровіца», які доўжыцца тыдзень — ад свята Купалля 7 ліпеня да свята Пятра і Паўла, якое адзначаецца 12 ліпеня. Маладыя людзі збіраюцца ў вёсцы Шыпілавічы на радзіме Паўла Шпілеўскага. Сюды прыязджаюць удзельнікі з усіх куткоў Беларусі, госці з Польшчы, Літвы, Германіі, Расіі. «Верабейкі» жывуць у палатках, харчуюцца тым, што прыгатавалі самі. І кожны дзень з ранку да вечара танцуюць любаньскія танцы і вучаць ім іншых. Дарэчы, тыя, хто прыязджае на фестываль, часцей за ўсё не маюць ніякага дачынення да культуры. Гэта інжынеры, праграмісты, супрацоўнікі розных арганізацый» — канстатуе Сяргей Выскварка.

— На працягу ўсіх дваццаці пяці гадоў я імкнуўся не проста навучыць дзяцей танцаваць, бо сама па сабе харэаграфія фальклорнага танца простая. Стараюся, каб яны авалодалі сапраўднай манерай танцаваць, без свавольства ў паводзінах, лішніх рухаў плячыма, рукамі, нават вачыма. Гэта сістэма, якой неабходна адпавядаць. Да танца трэба падрыхтавацца, каб выканаць яго правільна, згодна з традыцыяй, — лічыць фальклярыст.

— І ўсё ж, Сяргей Георгіевіч, не хацелася б вам перабрацца ў сталіцу? Тут іншыя маштабы, магчымасці для творчасці.

— Я закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, застаўся ў аспірантуры. На апошняй акалічнасці настойваў мой добры знаёмы і выдатны беларускі фальклярыст Васіль Ліцвінка. У мяне гатовая дысертацыя. Але, відаць, з-за пастаяннай занятасці або ляноты не магу яе абараніць, — жартуе Сяргей Выскварка. — Калі б у сутках было больш за дваццаць чатыры гадзіны, то, магчыма, давёў бы справу да канца. Але для мяне не гэта галоўнае, я не ганюся за славай. Калі ўбачу, што сваёй навуковай дзейнасцю не ўдаецца прыўнесці нешта новае ў беларускую фальклярыстыку, як кажуць у народзе, злезу з даху і не стану псаваць гонты.

У якасці вядучага я ўдзельнічаў у праекце «Спявае Беларусь» на тэлеканале «Беларусь 3». Пасля чаго мяне сустракалі землякі і здзіўляліся, што я не перабраўся на новае месца жыхарства. А я хачу жыць нават не ў райцэнтры, а ў вёсцы Пласток на Любаншчыне, дзе нарадзіўся, у дзедавай хаце. Неяк давялося пажыць ва Украіне. Але заўсёды цягнула на малую радзіму. І пры пад'ездзе да Любанскага раёна адразу падымаўся настрой: вось яна — родная зямля, непрыкметная, ціхая, але такая любая сэрцу. Магчыма, у Мінску сапраўды для мяне адкрываліся б новыя гарызонты. Але і тут хапае працы. Хто ж будзе апекавацца фальклорным мастацтвам маёй Любаншчыны, ладзіць тут па-сапраўднаму народныя святы, збіраць фальклорны і этнаграфічны матэрыял, шыць у мясцовых традыцыях народныя строі, на каго ж я пакіну маіх бабуль-спявачак, народных майстроў, танцораў...

Сяргей Выскварка напісаў некалькі кніг, выйшла шмат артыкулаў па фальклорным мастацтве, выдаў зборнік «Казка з быллю напалову» — гэта казкі, запісаныя ў Любанскім раёне. Выйшла ў свет кніжка «Маляваныя сны Паўла Марціновіча». Гэты мастак займаўся маляванымі дываномі. Выдадзены фотаальбом «Традыцыйная Любаншчына», для якога зрабіў здымкі Альфрэд Мікуса. Асаблівым гонарам з'яўляецца кніжка «Беларускі танцавальны фальклор. Методыка працы з дзіцячым фальклорным калектывам». Да выпуску рыхтуецца альбом традыцыйнага народнага адзення.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 24 апреля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Примечание:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**			
Местонахождение лотов №№ 1–4, 8: Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7				
1	Установка для приема товарного бетона УВР-7, № 936	**2 048,70**	102,44	204,87
2	Фильтр ФЭСВ-1200 с вытяжным устройством R-7,3М, № 971	**615,00**	30,75	61,50
3	Штукатурная станция СШВ-6 (передвижная), № 904	**780,60**	39,03	78,06
4	Штукатурная станция ШС-4/6 № 44/10083	**824,10**	41,21	82,41
8	Малярная станция (вагон), № 176	**813,00**	40,65	81,30
Местонахождение лотов №№ 10, 11: Гомельская область, Рогачевский р-н, н. п. Заречье				
10	Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10080	**907,80**	45,39	90,78
11	Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10079	**861,60**	43,08	86,16
12	Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10081. **Местонахождение:** Гомельская область, Рогачевский р-н, а. г. Тихиничи	**863,10**	43,16	86,31
13	**Капитальное строение с инв. № 322/С-17016** общей площадью **7,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание насосной станции с резервуаром чистой воды (инв. № 96). Капитальное строение с инв. № 322/С-13307** общей площадью **25,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада кислородных баллонов (инв. № 95). Капитальное строение с инв. № 322/С-17013** общей площадью **29,3 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание навеса для металлических баллонов (инв. № 10050). Капитальное строение с инв. № 322/С-17014** общей площадью **12,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание склада для металлических баллонов (инв. № 10051). Капитальное строение с инв. № 322/С-17012** общей площадью **133,2 кв. м,** назначение — здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное дощатое здание (инв. № 10059). Капитальное строение с инв. № 322/С-13309** общей площадью **460,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административное здание с подвалом (инв. № 91а). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, д. 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100002000064** общей площадью **1,8809 га (право постоянного пользования).** Целевое назначение земельного участка: для обслуживания производственной базы (СПМК-44). **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 13 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)**	**165 405,00**	8 270,25	16 540,50
Местонахождение лотов №№ 14, 15: Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, 3				
14	Станок токарно-винторезный, № 44/66	**1 110,00**	55,50	111,00
15	Станок трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и комплектом головок, № 44/40217	**690,00**	34,50	69,00
Местонахождение лотов №№ 17, 18, 20: Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28				
17	Станок токарно-винторезный 16ГС30-01, инв. № 44/44а	**2 007,90**	100,40	200,79
18	Форма для пустотных плит ПК-72-15, инв. № 44/325	**1 149,90**	57,50	114,99
20	Емкость металлическая (горизонтальная). 25 куб. м, инв. № 44/61926	**911,40**	45,57	91,14
Местонахождение лотов №№ 27, 28, 32, 38, 43–48, 51, 53, 55–59, 61, 63: Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7				
27	Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АК 3524-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач	**2 490,00**	124,50	249,00
28	Автомобиль МАЗ 6422 А5, рег. № АК 3525-3, г. в. 2009, цвет – желтый, тип ТС – грузовой седельный тягач	**4 380,00**	219,00	438,00
32	Автобетоносмеситель МАЗ 6303А3 СМБ-372-30, рег. № АЕ 0215-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель	**11 280,00**	564,00	1 128,00
38	Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400, рег. № ЕВ-3 4134, г. в. 2011, марка двигателя – Д-245	**23 310,00**	1 165,50	2 331,00
43	Автомобиль ГАЗ 5201, рег. № 7134 ГСП, г. в. не определен, цвет – голубой, тип ТС – грузовой бортовой	**780,00**	39,00	78,00
44	Автомобиль МАЗ 555102 2125, рег. № ЕІ 0329, г. в. 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой самосвал	**2 340,00**	117,00	234,00
45	Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4799-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон	**1 050,00**	52,50	105,00
46	Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4800-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон	**1 080,00**	54,00	108,00
47	Автомобиль МАЗ 5336 А3, рег. № АІ 6327-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой	**4 920,00**	246,00	492,00
48	Автомобиль МАЗ 5551 А2 рег. № АВ 5783-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой самосвал	**3 930,00**	196,50	393,00
51	Автомобиль УАЗ 39094, рег. № ЕС7603, г. в. 2004, цвет – зеленый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый	**1 080,00**	54,00	108,00
53	Автомобиль УАЗ 390902, рег. № АЕ 3994-3, г. в. 2004, цвет – светло-серый, тип ТС – грузопассажирский вагон	**1 050,00**	52,50	105,00
55	Полуприцеп МАЗ 938662, рег. № А 2345А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой	**2 010,00**	100,50	201,00
56	Полуприцеп МАЗ 931010, рег. № А 2347А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой	**2 070,00**	103,50	207,00
57	Полуприцеп МАЗ 975800, рег. № А 3169А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой	**2 700,00**	135,00	270,00
58	Прицеп МАЗ 837810-(042), рег. №1988 АА-3, г. в. 2009, цвет – серый, тип ТС – прицеп бортовой	**1 920,00**	96,00	192,00
59	Прицеп МАЗ 8571, рег. № А 2334А-3, г. в. 2008, цвет – серый, тип ТС – прицеп самосвал	**1 650,00**	82,50	165,00
61	Автомобиль УАЗ 3303, рег. № ЕС 7443, г. в. 1994, цвет – серый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый	**870,00**	43,50	87,00
63	Комплекс мобильный агрегатированный «МАК-Бетон» СМБ-004ЕК	**11 580,00**	579,00	1 158,00
64	**Капитальное строение с инв. № 320/С-16612** общей площадью **24,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000009** общей площадью **0,0344 га (право постоянного пользования)**	**1 710,00**	85,50	171,00
65	**Капитальное строение с инв. № 320/С-16609** общей площадью **1 339,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное, с двумя кирпичными пристройками, здание гаража на восемь транспортных единиц. Капитальное строение с инв. № 320/С-16605** общей площадью **357,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание механических мастерских. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003854** общей площадью **0,9337 га (право постоянного пользования)**	**115 500,00**	5 775,00	11 550,00
66	**Капитальное строение с инв. № 320/С-16611** общей площадью **62,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – **автозаправочный пункт, состоящий из одноэтажного кирпичного здания операторской и восьми стальных емкостей общим объемом V=350 т топлива, находящихся на бетонной площадке. Капитальное строение с инв. № 320/С-16615** общей площадью **347,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное, с кирпичной пристройкой, здание банно-прачечного комбината. Капитальное строение с инв. № 320/С-16613** общей площадью **403,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **здание растворобетонного узла. Капитальное строение с инв. № 320/С-16607** общей площадью **54,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада цемента. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 19В/7. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16608** общей площадью **387,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное,** **с дощатой пристройкой, здание склада с пристроенным навесом.** Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 067 (наименование – артезианская скважина). Инженерные сети – воздушные линии электропередачи ВЛ-0,4, инв. № 391. Инженерные сети – канальная линия электропередачи, инв. № 402. Инженерные сети – водопроводная сеть с инв. № 899. Недвижимые улучшения – сооружение инв.№ 364 (наименование – водонапорная башня). Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 068 (наименование – ограждение территории (забор). **Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 4. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003855** общей площадью **2,8275 га (право постоянного пользования). Капитальное строение с инв. № 320/С-25866** общей площадью **50,5 кв. м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **трансформаторная подстанция № 727. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7/1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001001491** общей площадью **0,0114 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания трансформаторной подстанции № 727	**60 153,00**	3 007,65	6 015,30
67	**Капитальное строение с инв. № 320/С-16671** общей площадью **504,2 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание лесоцеха. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, д. 7Д/2. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16668** общей площадью **475,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное, с каркасно-засыпной отапливаемой пристройкой, здание цеха по изготовлению щитовых домиков. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003798** общей площадью **0,9625 га (право постоянного пользования)**	**27 300,00**	1 365,00	2 730,00
68	**Капитальное строение с инв. № 320/С-16670** общей площадью **2 822,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с двумя отдельно расположенными бытовыми помещениями и навесом для хранения готовой продукции. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000107** общей площадью **1,0320 га (право постоянного пользования).** Котел водогрейный МИР-95 (инв. № 823)	**70 761,30**	3 538,07	7 076,13

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве – Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию – Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 3 апреля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 апреля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договора купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст.127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.08.2018 г. № 154 (28770). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 30 апреля 2019 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Условия продажи	Характеристика объекта
1*	Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 451/D-356	Гродненская обл., Дятловский район, Гезгаловский поселковый Совет, а. г. Гезгалы, д. 1, кв. 1	4 482,00	448,20	Без условий	Квартира общей площадью 29,8 кв. м, число жилых комнат – 1. Помещение расположено на 1-м этаже 5-этажного жилого дома. Материал стен – блоки. Год постройки – 1964
2*	Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-108186 (назначение – квартира, наименование – квартира № 98)	г. Гродно, ул. Калиновского, д. 60, кв. 98	74 160,00	7 416,00	Без условий	Квартира общей площадью 63,8 кв. м. Год постройки – 2009. Стены – железобетонные панели, блоки, этаж – 13/14, количество комнат – 2
3*	Здание одноквартирного жилого дома 431/С-8093	Гродненская область, Кореличский район, Мирский поселковый совет, д. Оюцевичи, ул. Луговая, д. 249	396,00	39,60	Без условий	Одноэтажный деревянный жилой дом площадью 54,2 кв. м, расположен на земельном участке с кадастровым номером 423375706601000193. Принадлежности: бутобетонный погреб, брусчатые сени, дощатая веранда, дощатая уборная, колодец, один брусчатый и один дощатый сараи
4*	Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060	Гродненская область, Новогрудский район, Волковичский с/с, ст. «Березка», д. 11	1 270,08	127,00	Без условий	Общая площадь земельного участка – 0,1134 га

*Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, тел.: (0152) 720537, 74 2095, 720546.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

– **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

– **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 30 апреля 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 1 апреля по 24 апреля 2019 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Открытое акционерное общество «Минский домостроительный комбинат», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, настоящим информирует, что общим собранием акционеров общества от 28 марта 2019 года принято решение о выплате дивидендов акционерам общества.

Размер дивидендов на одну акцию составляет 0,45648 рубля.

Установлен следующий порядок выплаты дивидендов:

– акционерам – работникам Общества – на карт-счета одновременно с выплатой заработной платы;

– акционерам, не связанным трудовыми отношениями с Обществом, – через депозитарий ЗАО «ЛидерИнвест» с 29.05.2019 по 30.06.2019;

– на акции, находящиеся в коммунальной собственности г. Минска, – путем перечисления в финотдел администрации Фрунзенского района № 1 г. Минска не позднее 22 апреля 2019 года;

– на акции, принадлежащие другим юридическим лицам, – путем перечисления на их расчетные счета – с 29.05.2019 по 30.06.2019.

УНП100258980

Организация	ОБЩЕСТВО С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ДАТЧ СТАР»
Учетный номер плательщика	191061436
Вид экономической деятельности	68320
Организационно-правовая форма	хозяйственное общество
Орган управления	общее собрание участников
Единица измерения	тыс. руб.
Адрес	220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, оф. 860

Дата утверждения	15.03.2019
Дата отправки	
Дата принятия	

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2018 г.

Активы	Код строки	На 31 декабря 2018 г.	На 31 декабря 2017 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	798	454
амортизация	102	(28)	(16)
остаточная стоимость	110	770	438
из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования	110а	-	-
Нематериальные активы			
первоначальная стоимость	111	9	6
амортизация	112	(7)	(4)
остаточная стоимость	120	2	2
Доходные вложения в материальные активы			
первоначальная стоимость	121	656	-
амортизация	122	(267)	-
остаточная стоимость	130	389	-
в том числе			
инвестиционная недвижимость	131	287	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	102	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	109	575
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	121
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**1 270**	**1 136**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	2 040	511
в том числе			
материалы	211	39	8
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	112	88
готовая продукция и товары	214	1 889	415
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	28 404	20 949
Расходы будущих периодов	230	44	14
в том числе: курсовые разницы	231	-	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	264	236
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	6 874	4 664
по налогам и сборам в бюджет	251	468	89
из нее инновационного фонда Минстройархитектуры	251а	-	-
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	252	-	-
Краткосрочные финансовые вложения	260	22	1
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	3 524	439
в т. ч. денежные средства на депозитных счетах	271	3 086	-
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
в том числе недостачи и потери	281	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**41 172**	**26 814**
БАЛАНС	**300**	**42 442**	**27 950**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2018 г.	На 31 декабря 2017 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	4	4
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	11 103	1 818
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**11 107**	**1 822**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	11 416	2 604
в т. ч. инновационного фонда Минстройархитектуры	511	-	-
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	512	-	-
Прочие долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	3 210	305
Доходы будущих периодов	540	-	-
в том числе: курсовые разницы	541	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**14 626**	**2 909**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
в т. ч. инновационного фонда Минстройархитектуры	611	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	99
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	6 308	6 967
в том числе			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 971	1 723
по авансам полученным	632	3 559	5 091
по налогам и сборам	633	19	8
из нее инновационному фонду Минстройархитектуры	633а	-	-
по социальному страхованию и обеспечению	634	-	-
по оплате труда	635	34	17
по лизинговым платежам	636	90	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	610	128
в том числе			
в бюджет либо РУП «БЕЛСТРОЙЦЕНТР»	637а	-	-
авансовые поступления в счет вкладов в уставной капитал	637б	-	-
прочим кредиторам	638	25	-
в т. ч. инвестиционному фонду Минстройархитектуры	638а	-	-
Обязательства, предназначенные для реализации	640	9 861	15 012
Доходы будущих периодов	650	-	-
в том числе: курсовые разницы	651	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	540	1 141
ИТОГО по разделу V	**690**	**16 709**	**23 219**
БАЛАНС	**700**	**42 442**	**27 950**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь — декабрь 2018 г.

Наименование показателей	Код строки	За январь — декабрь 2018 г.	За январь — декабрь 2017 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	5 100	2 762
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(863)	(810)
Валовая прибыль (010 - 020)	030	4 237	1 952
Управленческие расходы	040	(1 055)	(532)
Расходы на реализацию	050	(2)	(3)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050)	060	3 180	1 417
Прочие доходы по текущей деятельности	070	18 006	5 993
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(519)	(1 105)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 - 080)	090	20 667	6 305
Доходы по инвестиционной деятельности	100	242	1
в том числе			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	4	-
доходы от участия в уставных капиталах других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	238	1
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(15)	-
в том числе			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(5)	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(10)	-
Доходы по финансовой деятельности	120	1 131	122
в том числе			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	1 128	122
из них списанные со счета 98	121а	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	3	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(2 507)	(288)
в том числе			
проценты к уплате	131	(9)	(25)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(2 492)	(135)
из них списанные со счета 97	132а	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(6)	(128)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	(1 149)	(165)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	19 518	6 140
Налог на прибыль	160	(628)	(852)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	(2 905)	(305)
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	(6)	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(5 333)	-
Прибыль (убыток), перераспределяемые в пределах юридического лица	205	-	-
Чистая прибыль (убыток) (± 150 -160 ± 170 ± 180 - 190 - 200 ± 205)	210	10 646	4 983
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	10 646	4 983
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель Д.Г. Заморец

Главный бухгалтер Н.Б. Гусева

7 марта 2019 г.

Приорбанк XRBI Group

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!

«ПРИОРБАНК» ОАО ДОВОДИТ ДО ВАШЕГО СВЕДЕНИЯ ИНФОРМАЦИЮ О РАЗМЕРЕ И ПОРЯДКЕ ВЫПЛАТЫ ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ 2018 ГОДА

– Размер дивидендов по простым акциям составляет 51 копейку (в том числе 41 копейка, выплаченная по решению Общего Собрания акционеров на основании данных промежуточной бухгалтерской (финансовой) отчетности «Приорбанк» ОАО за 1-е полугодие 2018 года, и 10 копеек, подлежащих выплате);

– размер дивидендов по привилегированным акциям составляет 35 копеек (выплаченные по решению Общего Собрания акционеров на основании данных промежуточной бухгалтерской (финансовой) отчетности «Приорбанк» ОАО за 1-е полугодие 2018 года).

Выплата дивидендов будет начата не позднее 8 апреля 2019 года. Срок выплаты – в течение 60 дней.

Телефон для справок 8 (017) 289 90 90.

Для получения дивидендов физическим лицам необходимо иметь при себе паспорт. Получение дивидендов за третьих лиц допускается при наличии доверенности.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «СТРОЙКОМПЛЕКС», 220012, г. Минск, ул. Чернышевского, 10а

Предмет аукциона

**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

«ЗАМОРСКІЯ» БАЛЯЧКІ

Што можна «падхапіць» на адпачынку

Напярэдадні сезона адпачынкаў варта паклапаціцца пра тое, каб не прывезці з экзатычнай краіны якую-небудзь экзатычную хваробу. Як сябе правільна паводзіць і якія прышчэпкі зрабіць перад ад'ездам, расказала загадчык аддзялення асабліва небяспечных інфекцый Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анастасія ЛЯШКЕВІЧ.

— Апошнім часам кола турыстычных маршрутаў пашырылася, і нашы грамадзяне ўсё часцей едуць у экзатычныя краіны з цёплым трапічным кліматам. А ён спрыяе выдатным умовам для развіцця ўзбуджальнікаў жоўтай ліхаманкі, ліхаманкі Эбола, ліхаманкі Зіка, ліхаманкі Заходняга Ніла, — папярэджвае спецыяліст. — Гэта датычыцца такіх краін, як Тайланд, В'етнам, Індыя, Гоа, Бразілія, Перу, Аргенціна, Венесуэла, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Саудаўская Аравія. Шэраг краін патрабуюць ад турыстаў пры ўездзе сертыфікат аб вакцынацыі, дзесьці жорсткіх патрабаванняў няма, але прышчэпку зрабіць рэкамендуецца.

Як адзначае Анастасія Ляшкевіч, прышчапіцца можна толькі ад **жоўтай ліхаманкі,** ад астатніх інфекцый вакцыны не існуе. У Мінску гэта можна зрабіць у 19-й сталічнай паліклініцы. Прышчэпка робіцца не пазней чым за 10 дзён да паездкі. Дарэчы, калі раней яе патрабавалася паўтараць раз у дзесяць гадоў, то цяпер яна робіцца аднойчы на ўсё жыццё.

— Ад іншых інфекцый давядзецца засцерагацца самастойна — насіць закрытае адзенне, выкарыстоўваць рэпеленты і механічныя сродкі аховы, каб пазбегнуць укусаў камароў, — адзначае спецыяліст.

Яшчэ адно небяспечнае інфекцыйнае захворванне — **халера** — нярэдка сустракаецца ў такіх краінах, як Гаіці, Дамініканская Рэспубліка, Індыя, Гоа, зафіксаваны асобныя яе выпадкі і ва Украіне. Гэта хвароба «брудных рук» і забруджаных прадуктаў. Таму рэкамендуецца выкарыстоўваць толькі бутыляваную ці кіпячоную ваду (у тым ліку і для мыцця гародніны і фруктаў), плаваць у вадаёмах, якія рэкамендуе тураператар, і пазбягаць трапляння вады ў рот пры купанні. Важна прытрымлівацца правіл пры тэрмічнай апрацоўцы прадуктаў, не выкарыстоўваць лёд для напояў, мець пры сабе антысептык для рук.

У некаторых краінах абвастрылася сітуацыя з **чумой,** небяспечная, напрыклад, абстаноўка на Мадагаскары. Спецыяліст папярэджвае, што гэта інфекцыя перадаецца праз укусы блох і кантакт з жывёламі. Важна не чапаць тушкі мёртвых грызуноў, трэба пазбягаць кантактаў і з любымі жывымі жывёламі.

Алена КРАВЕЦ.



Скажыце, доктар...

ЯК РАСПАЗНАЦЬ МЕНІНГІТ?

За два апошнія месяцы ў Гомелі зафіксавана дзве дзіцячыя смерці ад менінгіту. У лютым ад гэтай хваробы памёр двухгадовы хлопчык, а ў сакавіку — ад імгненнага цячэння той жа інфекцыі загінула 16-гадовая школьніца. Як распазнаць небяспечную хваробу, галоўнае правіла якой — неадкладная шпіталізацыя, расказала ўрач-інфекцыяніст 3-й дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Юлія МІЛЬКО.

— Юлія Васілеўна, што гэта за хвароба?

— Менінгіт — гэта запаленне абалонак галаўнога і спіннога мозгу, у прыватнасці мяккай мазгавой абалонкі, але можа паражацца і мазгавая тканка. Гэта інфекцыйнае захворванне. Па этыялогіі яно вельмі разнастайнае: выклікаць яго могуць вірусы, бактэрыі, у больш рэдкіх выпадках — грыбы ці, напрыклад, гельмінты.

— Які менінгіт распаўсюджаны ў нас?

— Бактэрыяльны — ён сустракаецца ў 88—95 % выпадкаў. У 65 % яго ўзбуджальнікам з'яўляецца менінгакок, у 20 % — пнеўмакок, у 10 % — гемафільная інфекцыя (тып В), у астатніх 5 % іншыя бактэрыяльныя ўзбуджальнікі.

— Як ім можна заразіцца?

— Паветрана-кропельным шляхам ад чалавека, які з'яўляецца бессімптомным носьбітам ці хварэе на вострую рэспіраторную інфекцыю.

— Гэта значыць ад абсалютна любога хворага на вострую рэспіраторную інфекцыю можна заразіцца менінгітам?

— Хутчэй гэта так павінна «пашчасціць». Бо адна і тая ж інфекцыя ў пэўнага чалавека выклікае толькі насмарк, у кагосьці — фарынгіт, бранхіт ці пнеўманію, а ў іншага будзе менінгіт.

— Ёсць меркаванне, што спецыфічныя паломкі ў імунітэце спрыяюць захворванню на менінгіт...

— Абсалютна правільна. Нехта можа быць бессімптомным носьбітам гэтай хваробы і не ведаць пра гэта, а іншы будзе хварэць на менінгіт, і гэта залежыць ад генетычных паломак.

— У якім узросце дзеці часцей хварэюць на менінгіт?

— Такой статыстыкі няма, бо да гэтага захворвання схільныя ўсе. У дзяцей да трох месяцаў свая панэль схільнасці да пэўных інфекцыйных хвароб, у больш старэйшых — свая. Улічваючы вакцынацыю, у тых дзетак, хто прышчэплены ад найбольш распаўсюджаных узбуджальнікаў — пнеўмакока і гемафільнай інфекцыі, — змяншаецца рызыка развіцця менінгіту.

— Яны ўваходзяць у нацыянальны каляндар прышчэпак?

— Прышчэпка супраць пнеўмакоку робіцца толькі па паказаннях. А прышчэпка супраць гемафільнай інфекцыі (тып В), якая можа выклікаць менінгіт, ёсць у календары абавязковых прышчэпак. Калі яе ўнеслі туды некалькі гадоў таму, захваральнасць на менінгіт пачала знікаць.

— Часта дзяцей палохаюць, што калі не насіць шапку, можна захварэць на менінгіт. Гэта так?

— Пераахаладжанне, канешне, выклікае зніжэнне нашых абаронных бар'ераў, аслабленне імуннай сістэмы. Аднак гэта не значыць, што вы абавязкова захварэеце на менінгіт. Для гэтага трэба сустрэцца з узбуджальнікам.

«Трэба праяўляць насцярожанасць, не адмаўляцца ад шпіталізацыі, бо пры менінгіце час ідзе не на дні, а на гадзіны».

— Галоўная небяспека менінгіту — яго хуткае развіццё, калі можна не паспець дапамагчы...

— Так, існуюць імгненныя формы менінгіту з менінгакакцэміяй, асабліва гэта характэрна, калі ўзбуджальнік — менінгакок. Клініка ў такіх выпадках развіваецца імкліва — на працягу шасці гадзін, і маці з дакладнасцю да гадзіны можа ўказаць, калі дзіця захварэла.

А вось вірусныя менінгіты, у адрозненні ад бактэрыяльных, лепш паддаюцца лячэнню, у іх больш лёгкае цячэнне, менш ускладненняў і наступстваў. Часта нават не патрабуецца прызначэнне антыбіётыкаў, дастаткова дыягнастычнай пункцыі (забору спіннамазгавой вадкасці з пазваночнага канала), якая прыносіць хвораму аблягчэнне.

— Як распазнаць, што ў дзіцяці менінгіт?

— Для ўсіх тыпаў гэтай інфекцыі характэрныя пэўныя сімптомы. Першы — галаўны боль распіраючага характару, які цяжка купіруецца. Другі — высокая ліхаманка, як правіла, тэмпература цела паднімаецца вышэй за 38,5, часцей за ўсё 39-40 градусаў, і не збіваецца гарачкапаніжальнымі сродкамі. Трэці сімптом — рвота, якая не прыносіць аблягчэння, без млоснасці і расстройства стулу. Ёсць і спецыфічныя сімптомы, яны могуць быць як слаба выражаны, так і моцна. Гэта сімптомы Брудзінскага, Керніга, так званая рыгіднасць патылічных мышцаў, урачы іх добра ведаюць. Яны з'яўляюцца раннімі прыкметамі раздражнення мазгавых абалонак пры менінгіце. У маленькіх дзетак таксама можа быць прыпуханне вялікага цемечка.

— Чаму ў нас не робяць прышчэпкі хоць бы ад самага небяспечнага ўзбуджальніка — менінгакока?

— Створана вакцына ад менінгакока тыпаў A і C, ад тыпу B яе не існуе. А ў нас якраз пераважае тып B.

— Як тады засцерагчы дзіця ад гэтага захворвання?

— Меры прафілактыкі такія ж, як і для любой інфекцыі. Самы небяспечны ўзбуджальнік інфекцыі — менінгакок — няўстойлівы ў навакольным асяроддзі, таму варта праветрываць пакой, многія бацькі маюць бактэрыцыдныя лямпы, тады не пашкодзіць кварцаванне. Карысныя прагулкі на свежым паветры, рацыянальнае харчаванне, агульнае загартоўванне. У халодны перыяд лепш пазбягаць месцаў, дзе вялікая колькасць людзей, з маленькімі дзецьмі старайцеся менш карыстацца грамадскім транспартам. Усялякія мерапрыемствы накшталт хрысцін лепш праводзіць не дома.

— Хвароба лечыцца толькі ў стацыянары?

— Абавязкова ў стацыянары, бо перш за ўсё там маюцца ўмовы для рэанімацыі. Дарэчы, лёгкае цячэнне менінгіту спачатку нагадвае цяжкую вірусную інфекцыю, таму часта бацькі адмаўляюцца ад шпіталізацыі. Потым выклікаюць хуткую дапамогу, бо дзіцяці становіцца горш. Тут трэба праяўляць насцярожанасць, не адмаўляцца ад шпіталізацыі, бо пры менінгіце час ідзе не на дні, а на гадзіны. Чым раней будзе аказана дапамога, тым больш шанцаў на выздараўленне без наступстваў і ўскладненняў.

Алена КРАВЕЦ.

❍ У тэму

Як паказвае практыка ва ўсім свеце, выратаваць хворага з імгненным цячэннем менінгакокавай інфекцыі ўдаецца не заўсёды. І такое развіццё хваробы можа быць звязана з пэўнымі няпростымі дэфектамі ў імуннай сістэме чалавека, расказвае **прафесар кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Сяргей ЖАВАРОНАК.** Такія людзі, напрыклад, хварэюць на імгненныя формы грыпу.

Сігналам для выкліку хуткай дапамогі павінна стаць трыяда сімптомаў: **моцны галаўны боль, высокая тэмпература, рвота** (у дзяцей і пажылых яе можа не быць). Калі да гэтага дадаецца **сып на нагах і ягадзіцах,** які паступова нарастае, гэта вельмі грозны сімптом.

— Чалавек у выніку гіне не ад менінгіту, а ад кровазліцця ў наднырачнікі, — кажа Сяргей Жаваронак.

За апошнія гады захваральнасць на менінгіт істотна зменшылася. Калі раней штогод ад імгненных формаў гэтай інфекцыі гінула 28—30 чалавек, то цяпер — 10—12.

Спытайце пра радзіннае

Што можна, а чаго нельга рабіць на Дабравешчанне?

Пытанне ад жыхаркі з г. Бяроза Брэсцкай вобласці Надзеі: «На старонках газеты «Звязда» даволі падрабязна можна прачытаць пра беларускія святы, але пра Дабравешчанне ніколі не пісалі. Можа сёння гэтае свята ніхто і не святкуе, але з дзяцінства помню, як бабуля перасцерагала што-небудзь рабіць у гэты дзень і прыгаворвала: «На Дабравешчанне дзеўка касы не пляце, птушка гнязда не ўе». Як растлумачыць гэтыя забароны?»

Разглядаючы кожны святочна-абрадавы комплекс, мы абавязкова звяртаем увагу на кола павер'яў, прыкмет і рэгламентацый, якія за многія стагоддзі існавання сфарміраваліся ў ім або вакол яго. Калі паглядзець на шырокае кола абрадавых і этыкетных рэгламентацый, звязаных з Дабравешчаннем, то адразу ж кідаецца ў вочы іх супярэчлівасць, і, што зусім нечакана, выразная перавага забараняльна-абмежавальных прадпісанняў. На наш погляд, прычынай таму стала незвычайна цеснае збліжэнне дзвюх традыцый: язычніцкай і хрысціянскай. Ад першай выходзіў прыярытэт развівальна-пабуджальнага характару (свята хрысціянскага календара — Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы — было прызначана ў гонар з'яўлення Архангела Гаўрыіла Прасвятой Дзеве Марыі і адзначаецца дакладна за дзевяць месяцаў да Раства Хрыстовага), ад другой, наадварот, — стрымліваль-на-абмежавальнага.

Бадай што самым распаўсюджаным і самым вядомым у Беларусі з'яўляецца абрадавы фразеалагізм, які даволі жорстка абмяжоўвае чалавека ў выкананні той ці іншай работы ў гэты дзень: **«На Дабравешчанне дзеўка касы не пляце, птушка гнязда не ўе». Яшчэ адна забарона гэтага дня — паліць у печы і расчыняць цеста для выпякання хлеба.** Традыцыя забараняла ў гэты дзень паліць у печы, каб не наклікаць засуху або градабой. На Палессі казалі: той, хто распальвае ў гэты дзень агонь, «запячэ зямлю». Існаваў шэраг прадпісанняў пакаральнага характару, які сведчыў пра тое, што людзі ўсё ж дапускалі магчымасць парушэння табуляванай традыцыі: гаспадыню, якую парушыла забарону, выводзілі на вуліцу ў адным споднім, аблівалі вадой, у хаце маглі перабіць усе глечыкі, перавярнуць чыгункі з ежай.

Часцей за ўсё здаралася так, што святкаванне Дабравешчання прыпадала на перыяд Вялікага посту, таму прадугледжвалася, што **абрадавы стол сям'і ў гэты дзень павінен быць посны.** Адначасова этнаграфічныя апісанні падаюць нечаканы контрход развіцця святочных падзей: «Тых жанчын, якія пяклі і смажылі, гатавалі тлустую ежу (?!) у гэты дзень, аблівалі вадой, таму што меркавалі: «Калі смажыць на Дабравешчанне, то лета будзе жаркае, сухое»; «Дабравешчанне — посны дзень, таму нельга пячы — паколькі будзе жарыць сонца».

У коле рэгламентацый, якія датычацца засявання новага ўраджаю, існуе **забарона садзіць бульбу ў той дзень тыдня, у які сёлета было Дабравешчанне.** Акрамя таго, у той дзень тыдня, на які прыпадала свята, **нельга было першы раз выганяць жывёлу на пашу, забаранялася распачынаць ворыва і сяўбу; вывозіць гной на поле; пачынаць будаўніцтва хаты** ды іншых пабудоў. І разам з тым у **той жа дзень тыдня, у які было Дабравешчанне, увосень пажадана было занесці першы кошык бульбы ў склеп (пограб),** каб яна добра захоўвалася; **прывезці з поля першы сноп і паставіць у гумно,** каб не разводзіліся пацукі.

Асобныя прыкметы і абрадавыя прадпісанні гэтага дня: **папярэджанне не апранаць новае адзенне** — яно хутка парвецца; што-небудзь пазычаць суседзям (г. зн. выносіць з хаты) і адначасова «нельга было нічога прыносіць з лесу, інакш у хаце з'явяцца пацукі, тараканы і іншыя шкоднікі. «Той, хто штосьці аддаў з хаты на Дабравешчанне (не абавязкова грошы), аддаваў спакой і здароўе».

Лічылася таксама, што **ў гэты дзень трэба быць стрыманымі ў адносінах, старацца нікога не пакрыўдзіць.** Адначасова выказвалася далікатная парада: «Хто на Дабравешчанне з раніцы і да ночы назаве мужа сорак разоў «мілы», увесь год для яго любімай будзе».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Была вайна

«Да вызвалення яны не дажылі ўсяго нейкі месяц»

...У пашпартах многіх маіх знаёмых значыцца, што нарадзіліся яны ў вёсцы Агароднікі Нясвіжскага раёна. Запіс гэты, вядома ж, праўдзівы, вёска такая была. І лёс яе досыць трагічны.

Нясвіжчыну немцы захапілі ў першыя дні вайны. Амаль адразу яны ўвялі каменданцкую гадзіну і за парушэнне вельмі строга каралі. З вёскі відаць былі дзве шыбеніцы, якія з'явіліся на гарадской плошчы... Да таго ж у людзей забіралі скаціну, прадукты, моладзь прымусова вывозілі ў Германію.

Сведак таму засталося мала: Ірына Рыгораўне Шумейцы і Аркадзю Аляксандравічу Язэпчыку было тады па дзевяць гадоў, але іх дзіцячая памяць захавала многае. Расказвалі, як увосень 1941-га ўсіх яўрэяў, разграбіўшы іх жыллё ды маёмасць, гвалтоўна сагналі ў гета, а пазней, пад канвоем аўтаматчыкаў, прыгналі ў парк каля замка, прымусілі капаць там доўгую глыбокую канаву. Потым, каля гатовай, паставілі людзей і пачалі расстрэльваць.

Забітых і параненых скідвалі ў роў і засыпалі зямлёй. Расказвалі, што яна, прамочаная крывёй, яшчэ доўга варушылася, былі чутны стогны і плач. Выратавацца ніхто не змог, загінула каля паўтары тысячы чалавек...

Пачатак лета 1944-га выдаўся цёплым, але не менш трывожным. Усе спадзяваліся на добры ўраджай, а яшчэ больш — на перамогу над ворагам. Фашысты ўжо адчувалі сваё паражэнне і хуткую пагібель, ад чаго рабіліся ўсё больш і больш агрэсіўнымі: адступаючы, яны палілі і ўзрывалі ўсё, што можна было.

У першыя дні чэрвеня вяскоўцам стала вядома, што немцы рыхтуюць авіяналёт на Агароднікі з мэтай іх поўнага знішчэння. Паводдаль, у полі, жыхары ўзяліся будаваць зямлянкі, у якіх можна было б затаіцца падчас бамбёжак. Усе, вядома ж, разумелі, што толк з іх невялікі, што схавацца там можна толькі ад кулі ды асколкаў, а вось ад бомбы — наўрад.

І тым не менш кожная сям'я мела такую схованку, усім, вядома ж, хацелася выжыць. А таму, пачуўшы гул самалётаў, людзі беглі ў бок сваіх «нораў», у іх жа часам заставаліся начаваць. А раніцай выходзілі, каб пакарміць скаціну, што-небудзь зрабіць па гаспадарцы. Па гуле навучыліся адрозніваць, чый самалёт на падлёце — варожы ці свой.

Дзень 6 чэрвеня 1944-га быў цёплы, нішто не прадказвала бяды, але...

Апоўначы пачуўся страшны гул нямецкіх самалётаў, якія накіроўваліся на вёску. З іх паляцелі запальныя бомбы, сталі шалёна стракатаць кулямёты. Адзін за другім пачалі загарацца дамы, гаспадарчыя прыбудовы, платы, трава. А ўрэшце гарэла ўсё, што людзі будавалі, набывалі і нажывалі. Хмары чорнага дыму закрывалі неба над вёскай. Чуўся жудасны крык, стогны, плач жанчын і дзяцей. Па вуліцы, па гародах мітусіліся спуджаныя коні, каровы, авечкі ды іншая жыўнасць.

Самалёты між тым рабілі заход за заходам, бомбы пачалі разрывацца каля зямлянак, людзі кінуліся разбягацца ў розныя бакі. Па іх стракаталі кулямёты.

Скінуўшы смертаносны груз, самалёты праляцелі над тым, што надоечы называлася вёскай. Агароднікі былі спалены, можна сказаць, дашчэнту: ацалелі хіба што дзве хаты наводшыбе.

...Пасля бамбёжкі тыя, хто выжыў, сабраліся на пажарышчы і недалічыліся многіх. Амаль поўнасцю загінула сям'я вядомага ў акрузе печніка Міхаіла Шкрабы (застаўся толькі малы сынок). Іван Шыбіцкі ў тую ноч страціў сына, дзвюх дачок, жонку і брата. Сям'я Аляксандра Цара загінула поўнасцю...

Гэтыя людзі не дажылі да вызвалення ад захопнікаў усяго нейкі месяц: вечарам 4 ліпеня 1944-га Нясвіж быў поўнасцю вызвалены ад ворага.

...Сёння адбудаваная вёска Агароднікі — ужо горад. Аб чэрвеньскай трагедыі 1944-га напамінае дагледжаны помнік — ахвярам фашызму, жыхарам вёскі.

Аляксандр Макась,
г. Нясвіж.

Што бачу

ЛЮДЗІ І ПТУШКІ

...Прадвесне было — як чалавечы настрой: рэдкія сонечныя гадзіны змяняліся пранізлівымі вятрамі, адлігі — замаразкамі, а то і маразамі. Тым не менш прырода брала сваё: наша рэчка Клява, хай пакрысе, але ўсё ж вызвалялася ад лёду, і мы, вяскоўцы, ужо чакалі сваіх вешчуноў вясны — двух белых лебедзяў.



Апошнім часам яны прыляталі да нас штогод. Прыляцелі і сёлета. Мы, вядома ж, нечым частавалі іх, любаваліся. А яны, здавалася, ні на што не звяртралі ўвагі: хораша купаліся, ускідваючы на сябе струмені чыстай вады: мілаваліся і заўжды былі побач, пакуль...

У адну з начэй раптам моцна пахаладала. Ваду ў рацэ, а з ёю і птушак (!) прыхапіла лёдам і для таго, каб выбрацца з палону, у іх не хапала сіл.

Людзі, на шчасце, убачылі гэта, а вось як дапамагчы, даўмецца не маглі. Сярэдзіна рэчкі досыць глыбокая, лёд крохкі...

Аднаму з нашых мужчын удалося дакінуць да птушак кавалачак хлеба: лябёдка, памкнуўшыся да яго і раз, і другі, і трэці, такі вызвалілася з нечаканай пасткі! А вось сябру яе гэта ніяк не ўдавалася.

Не кінуліся на дапамогу лебедзю і нашы ратавальнікі, служба ахова прыроды.

Што заставалася нам, вяскоўцам? Ды хіба спадзявацца, што пацяплее, лёд падтане і птушка сама зможа выбрацца на волю. Аднак час ішоў, а на дварэ зусім не цяплела. Побач з «палонным» заставалася хіба яго сяброўка. Сваёй доўгай дзюбай яна з усіх сіл старалася падсунуць яму кавалачкі ежы...

Гэта зноў падштурхнула да дзеяння: мы пайшлі шукаць мужчын-рыбакоў, у якіх былі воданепранікальныя касцюмы, сталі прасіць, каб тыя дапамаглі выратаваць птушку.

Дзякаваць богу, угаварваць іх доўга не прыйшлося: лебедзь апынуўся на волі, побач са сваёй сяброўкай!..

Іх прыгожая парачка яшчэ некалькі дзён упрыгожвала водную роўнядзь ракі, а потым паплыла на месца пастаяннага гнездавання, пакінуўшы нам, людзям, светлы ўспамін і пра сябе, і пра нас — нераўнадушных, гатовых дапамагчы.

Ніна Бурко, *Бярэзінскі раён.*

Чалавек — чалавеку

Мой добры лекар Афоня

Лёс не лес, на кані — не аб'едзеш. І сапраўды, больш за 27 гадоў са сваіх 85 я жыву адна. Муж загінуў, і я, каб хоць трохі разнастаіць жыццё, завяла ката.

Спачатку шмат увагі ўдзяляла яго выхаванню: прывучвала да латка, адвучвала «нападаць» на вазоны і вастрыць кіпцюры аб канапу... Дапамаглі мне ў гэтым звычайная «Зорачка» і «Доктар Мом» з пахам мяты.

Поўсць падчас лінькі я прылаўчылася збіраць вільготнай гумовай пальчаткай, месцы кашачых «метак» — праціраць анучкай, змочанай у вадзе з воцатам, вазоны — час ад часу апырскваць слабым растворам лімона — ён таксама адпуджвае ката.

А вось падтрымлівае яго рознае зяленіва. Зімой я насыпаю ў талерку насенне пшаніцы (аўса, ячменю або травяную сумесь), перамешваю яго з зямлёй, рэгулярна паліваю. Тыдні праз два зялёная вітамінная дабаўка гатова. Я з замілаваннем гляджу, як пацешна мой Афоня садзіцца на заднія лапы, калі цягнецца па ласунак, як акуратненька адсоўвае ад сябе няўдалую страву.

Кот, куды б я ні ішла, праводзіць мяне і, вядома ж, заўсёды сустракае. Ён самы ўважлівы слухач (і, дарэчы, выдатна разумее слова «нельга»), а да таго — цудоўны псіхатэрапеўт: заўсёды адчувае мой настрой, ведае, што мне баліць, і кладзецца на хворае месца.

Альбо я сама, калі павышаецца ціск ці расколваецца галава, проста гладжу ката па цёплай спінцы альбо каўняром кладу яго сабе на шыю. Дзейнічае не горш за таблеткі! І таму я веру нямецкім вучоным, якія прызналі, што наяўнасць у хаце ката павышае працягласць жыцця ў сярэднім на дзесяць гадоў.

Высновы зрабіце самі.

Соф'я Кабарыха,
в. Паланечка, Баранавіцкі раён.

Смех смехам

Пасля «балю»

Гэта было даўно, але ж помніцца дагэтуль.

У святочны дзень чацвёра знаёмых супрацоўніц-дзяўчат разам схадзілі ў кафэ. І добра, як быццам, пасядзелі там, але ж ім здалося, што мала, таму па дарозе нехта прапанаваў зайсці да Віктара, старога халасцяка, з якім разам працавалі і які жыў зусім непадалёк...

Сказана — зроблена: зайшлі, пабылі. І назаўтра раніцай, сустрэўшыся на працы, ва ўсю моц абмяркоўвалі свой «візіт»: маўляў, у Віктара і тое не так, і гэта не гэтак. Успаміналі, як дзяцюк частаваў іх, як з-пад ложка чамусьці даставаў віно, там жа ён трымаў посуд...

Карацей, тройка дзяўчат (чацвёртая з іх на гадзіну адпрасілася з працы, каб узяць даведку ў басейн) ад душы нарагаталася, калі дзверы ў пакой адчыніліся і з парога прагучала:

— Дзяўчаты, вы ж ведаеце, дзе я была?

— Ведаем... Ты казала, што ў венералагічны дыспансер па даведку хадзіла.

— А ведаеце, каго я там сустрэла?

— ?

— Віктара!

У пакоі павісла цішыня, і колькі яна там «вісела», я сказаць не бяруся.

...Ніякіх наступстваў ад візіту ні ў кога з гэтай кампаніі, вядома ж, не было, аднак да Віктара дзяўчаты болей не хадзілі. Ды і да іншых халасцякоў — на ўсякі выпадак — таксама.

Яўген Шастакоў,
г. Гомель.

Управляющий ООО «Море Мебели» – ИП Кудренок Е. А. организатор торгов, – извещает о проведении 4 мая 2019 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, каб. 310 первых торгов в форме аукциона по продаже имущества, бывшего в употреблении, шаг торгов – 5 % от первонач. цены, задаток – 10 % от первонач. цены:

1. сверлильно-присадочный станок LINA (Италия) LA 21 – 4 600,00 руб. (задаток – 460,00 руб.);

2. дебиторская задолженность гр. Панасюка Павла Федоровича – 5 366,70 (задаток – 536,67 руб.).

Ознакомление с формой заявления на участие в торгах, с формой заявки, договором и др. документами по тел. 8 029 644 38 92. Место нахождения имущества – Новодворский с/с, д. 94. Прием заявлений на участие в торгах по почтовому адресу: 220079, Минск-79, а/я 231, с даты настоящей публикации до 10.00 03.05.2019 г. Оплата производится с даты настоящей публикации до 03.05.2019 г. на р/с ООО «Море Мебели» в ЗАО «Идея Банк» № BY29SOMA30120115190101000933, код банка SOMABY22, УНП 192337764. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до их проведения.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: антикризисный управляющий Исакова Татьяна Юрьевна, тел. (029) 892-40-22.

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, тел.: (029) 892-40-22, (029) 891-42-66

Наименование объекта, начальная цена, задаток
Лоты №№ 1–3. Воздухосборники (емкости б/у) объем 10 куб. м, 3 шт. Начальная цена за 1 лот: 420,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 42,00 бел. руб. Лоты №№ 4–7. Воздухосборники (емкости б/у) объем 6 куб. м, 4 шт. Начальная цена за 1 лот: 315,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 31,50 бел. руб. Лот № 8. Воздухосборник (емкость б/у) объем 4 куб. м. Начальная цена за лот: 210,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 21,00 бел. руб. Лоты №№ 9–11. Воздухосборники (емкости б/у) объем 4 куб. м, инв. номера 144869, 144868, 144867. Начальная цена за 1 лот: 210,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 21,00 бел. руб. Лоты №№ 12–15. Резервуары алюминиевые б/у 1,5 куб. м, инв. номера 18574, 18572, 18579, 18573. Начальная цена за 1 лот: 595,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 59,50 бел. руб. Лоты №№ 16–17. Емкости алюминиевые б/у 1,0 куб. м, инв. номера 143953, 143952. Начальная цена за 1 лот: 595,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 59,50 бел. руб. Лот № 18. Резервуар стальной б/у 2,5 куб. м, инв. номер 18570. Начальная цена за лот: 105,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 10,50 бел. руб. Лоты №№ 19–20. Емкости стальные б/у 2,5 куб. м, инв. номера 181344, 181343. Начальная цена за 1 лот: 105,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 10,50 бел. руб. Лот № 21. Станок ножовочный, инв. номер 143415. Начальная цена за лот: 165,20 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 16,52 бел. руб. Лот № 22. Станок плоскошлифовальный, инв. номер 144334. Начальная цена за лот: 3003,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 300,30 бел. руб. Лот № 23. Мармит первых блюд на 2 конфорки, 2 полки, инв. номер 145041. Начальная цена за лот: 21,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 2,10 бел. руб. Лот № 24. Пекарский шкаф б/у, инв. номер 145085. Начальная цена за лот: 35,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 3,50 бел. руб. Лот № 25. Котел КПЭ СМ-60, инв. номер 144862. Начальная цена за лот: 119,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 11,90 бел. руб. Лот № 26. Машина посудомоечная, инв. номер 144863. Начальная цена за лот: 210,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 21,00 бел. руб. Лот № 27. Машина протирочная МП-1000, инв. номер 144886. Начальная цена за лот: 105,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 10,50 бел. руб. Лот № 28. Устройство варочное (общепит), инв. номер 144871. Начальная цена за лот: 49,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 4,90 бел. руб. Лот № 29. Насос 80-65-160, инв. номер 144419. Начальная цена за лот: 49,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 4,90 бел. руб. Лот № 30. Насос 80-65-160, инв. номер 144420. Начальная цена за лот: 75,60 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 7,56 бел. руб.
Повторные торги состоятся 16.04.2019 в 13.00 по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 02.04.2019 по 12.04.2019 с 9.00 до 16.00. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота в белорусских рублях. **Условия:** оплата НДС сверх цены продажи имущества в соответствии с налоговым законодательством Республики Беларусь. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 08.09.2018, 29.10.2018, 13.12.2018

Наименование объекта, начальная цена, задаток
Лот № 1. Станина б/у горизонтально-фрезерного станка. Начальная цена за лот: 170,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 17,00 бел. руб. Лот № 2. Комплект б/у запчастей монтажно-тяглового механизма. Начальная цена за лот: 400,00 бел. руб. без НДС. Задаток за лот: 40,00 бел. руб. Лоты №№ 3–42. Литье чугунное, болванки, 250 кг. Начальная цена за 1 лот: 375,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 37,50 бел. руб.
Торги состоятся 03.05.2019 в 13.00 по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 02.04.2019 по 30.04.2019 с 9.00 до 16.00. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота в белорусских рублях. **Условия:** оплата НДС сверх цены продажи имущества в соответствии с налоговым законодательством Республики Беларусь

Задаток перечисляется: р/с № BY70BLBB30120300082525001001 (бел. руб.); BY43BLBB30120300082525001002 (USD); BY16BLBB30120300082525001003 (EUR); BY86BLBB30120300082525001004 (RUB) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Задаток за участие в аукционе резидентами Республики Беларусь перечисляется в белорусских рублях, нерезидентами – в белорусских рублях или в иностранной валюте с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа. В случае перечисления денежных средств в иностранной валюте комиссия по конвертации и переводу валюты осуществляется за счет покупателя. Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62 в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с имуществом осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Контактные телефоны: (029) 892-40-22, (029) 891-42-66, тел./факс (0212) 34-36-54, e-mail: silk@vitebsk.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА на право заключения договора аренды земельного участка

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка
Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым № 223351000001000857, расположенного по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Ленина, 70, площадью 0,0954 га, для размещения торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (р. Дисна, р. Западная Двина). **Нач. цена:** 1 140,53 бел. руб. **Задаток:** 114,05 бел. руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с BY10AKBB36003210100160000000 в г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, получатель платежа: ГУ МФРБ по Витебской области РБ (Дисненский горисполком)
Дата, время и место проведения аукциона: 04.05.2019 в 12.00, Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Тельмана, 1 в Дисненском городском исполнительном комитете. Срок внесения задатка и подачи документов: с 03.04.2019 с 8.30 по 03.05.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** внести плату за право заключения договора аренды зем. участка и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона; заключить договор аренды с Дисненским городским исполнительным комитетом и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка и после получения настоящего решения и протокола о результатах аукциона осуществить гос. регистрацию права аренды и договора аренды зем. участка; приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение шести месяцев – юридическое лицо, индивидуальный предприниматель, а гражданин – в течение одного года, со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации зем. участка и возникновения права на него; в месячный срок после получения решения получить в отделе архитектуры и строительства, жилищно-коммунального хозяйства Миорского райисполкома АПЗ и ТУ на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию; приступить к строительству объекта после разработки и утверждения в установленном порядке строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

ОАО «КОНДИТЕРСКАЯ ФАБРИКА «СЛОДЫЧ» осуществляет реализацию следующей техники:

✓ **ТРАКТОР МТЗ 82.1,**
1992 года выпуска, по цене 9 600,00 руб. без учета НДС.

✓ **АВТОМОБИЛЬ MAZDA 6,**
2004 года выпуска, по цене 6 760,00 руб. без учета НДС.

Телефоны для справок:
8 (017) 398 97 37; + 375 29 355 20 67; + 375 29 121 0 441.

Место расположения объектов:
г. Минск, ул. Радиальная, 54/2.

УНП 100129695

ИЗВЕЩЕНИЕ об аукционе по продаже кранов башенных: КБМ-401П.00, инвентарный № 2512; КБМ-401П.ИСП.33, инвентарный № 3255

